Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

КОШТ НУМАРУ 5 КАП.

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэхактара—№ 769.

Натар'ня прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Невыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 211. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц . . . . — 90 к. „ 3 „ . . . . 2 р. 70 к. „ 6 „ . . . . 4 р. — к. „ 1 год . . . . 8 р. — к. Замена адрэсу: іншагародняя — 20 к. мясцовая . . . . — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок капярэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок капярэлі паспоў тэксту 1 р. — к. За радок капярэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпісныя на 50 проц. карэйш. Зьмена тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 радок . . . 35 сант. За кожны радок наступны . . . 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за радок . . . 15 „ За кожны радок наступны . . . 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. станцыях. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 ГОД ВЫДАННЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 34 (2523 Серада 13-га лютага 1929 г.

Падатак дапаможа ўзьняць сельскую гаспадарку.

Сельская гаспадарка нашай краіны вельмі адстала, а без разьвітай сельскай гаспадаркі нельга пасьпяхова ўзьнімаць усю народную гаспадарку. Без сыравіны, бяз хлеба, мяса і інш. нельга і думаць аб посьпехах сацыялістычнага будаўніцтва. Не гаворачы ўжо аб тым, што чым вышэй дабрабыт працоўных сялянскіх мас, тым мацней саюз з імі, тым менш у ворага ўмоў паслабіць і разарваць змычку горада і вёскі.

Вось чаму вельмі вялікае значэньне маюць для нас пытаньні ўзьніму сельскай гаспадаркі. Вось чаму, найхільна ўзьнімаючы і разьвіваючы прамысловасьць, транспарт і электрычнасьць, партыя ўжывае шэраг мер да таго, каб максымальна паскорыць разьвіцьцё сельскай гаспадаркі.

Мы дамагаемся такога ўзьніму сельскай гаспадаркі, пры якім рос-бы дабрабыт шырокіх мас серадняковай і беднякоў, бурна расьлі-б калектыўныя гаспадаркі і усімі спосабамі абмяжоўваліся эксплёататарскія, кулацкія гаспадаркі.

Ажыцьцёвіць такі рост вельмі важна. Вопыт гэтага году вельмі яскрава паказаў, што марудносьць узьніму сельскай гаспадаркі бальша б'е на ўсім гаспадарчым жыцьці краіны і па матар'яльным становішчы рабочае клясы.

Ёсьць шэраг мер, якія могуць так ці інакш уплываць на разьвіцьцё сельскай гаспадаркі. Адным з галоўных, важнейшых мерапрыемстваў зьяўляецца сельска гаспадарчы падатак.

Можна пабудаваць падатковую палітыку так, каб прывесьці да росту кулацтва. Можна пабудаваць падатковую палітыку так, каб дапамагчы ўзьнімацца серадняку, падахвочваць калектывізацыю, абмежаваць рост кулака выкаліўшы зусім ад падатку беднату.

На гэтых, апошніх, прынцыпах будуецца наша падатковая палітыка. Але мала гэтага. У кожны даны перыяд трэба прыстасоўваць сельска-гаспадарчы падатак да бліжэйшых задач, сурова захоўваючы асноўныя прынцыпы.

Зараз перад намі вострa стаяць зусім выразныя задачы: павялічыць пасеўную плошчу, павялічыць ураджайнасьць зямлі.

Унесэны ў закон аб сельска-гаспадарчым падатку набраўкі і маюць сваёй мэтай, сурова захоўваючы клясавую лінію, дапамагчы ажыцьцяўленьню гэтых вялізарных задач.

Тр ба запікавіць у выкананьні стаячых перад намі задач саміх працоўных сялян (серадняковуў і беднякоў). Для гэтага новы закон прадугледжвае вызваленьне ад сел.-гасп палатку ў працягу двох гадоў усяго новага прыросту пасеўных плошчаў.

Там, дзе падатак вылічваецца ня з плошчы пасеву, а з рэльлі, норма даходу, з якой вылічваецца падатак, будзе зьніжана.

Мала павялічыць пасевы. Трэба ўзьняць ураджай. Ён у нас нізьвычайна нізкі. А ўраджай залежыць, у значнай меры, ад ужываньня самых простых агранамічных мер (вычстка насеньня, шматпольле, угнаеньне і г. д). Каб падахвоціць рост сельска гаспадарчай культуры, рост ураджаю, усе зьмельныя таварыствы, якія ўжываюць поўную кольскасьць гэтых прасьцейшых агранамічных мер, атрымаюць скідку па сельска-гаспадарчаму падатку на 10 процантаў. На 15 пр. зьніжаецца норма вылічэньня даходнасьці ў шматпольных гаспадарках.

З жывелагадоўлай, масларобствам і інш. у нас таксама непарадак. У многіх мясцох зусім спыняецца рост стада. Вось чаму дзеля падахвочваньня жывёлагадоўлі падатак на рагатую жывёлу скарачаецца ў два разы, а на пасевы траў таксама палягчаецца.

Усе гэтыя папраўкі не да ячэйкі кулацкіх гаспадарак.

Ужываньне ўсіх гэтых мерапрыемстваў паслужыць штуршком да ўзмацненьня зацікаўленасьці бядняцкіх і серадняцкіх мас ва ўзьнімці сваёй гаспадаркі. А гэта адна з нашых буйнейшых задач.

Мы будзем пільна сачыць за тым, каб на мясцох новы закон не скажаўся і як-небудзь не быў павернуты ў карысьць кулацкіх гаспадарак.

Вызваліць ад падатку беднату, палегчыць падатак серадняку, перанесьці цяжар падатку на кулака—гэткія асновы нашай палітыкі.

Гэтыя асновы мы будзем праводзіць, дапамагаючы ўзьніму асноўнай масы сялянскіх гаспадарак.

Гэтыя асновы мы будзем праводзіць, робячы ўсё для таго, каб спрыяць беднаку і серадняку ў пераходзе на рэйкі калектыв зацыі.

Зговар аб новым выціскальні сокаў з нямецкіх рабочых.

„Правда" ў артыкуле палітгаляду пад загалоўкам—„Новые экспэрты за работай"—піша:

Новая рэпарацыйная камісія распачала працу. Старшынёю сваёй яна намецілa вялікага амэрыканскага фінансіста Оўэна Юнга. Галоўнаю асобаю ў камісіі, аднак, зьяўляецца другі амэрыканец—сусьветны банкір Морган, які палічыў патрэбным узяць за ўласныя рукі рэпарацыйную справу. Гэта і ня дзіўна, калі памятаць, што ранейшыя эўрапейскія саюзьнікі навінавачаны гэтаму міліярдэру блізка 700 мілёнаў даляраў, пагашэньне якіх фактычна ідзе за кошт рэпарацыйных сум, якія атрымліваюць пераможцы пераможанае Нямеччыны.

Як відаць з паведамленьняў друку, мяркуецца стала ўстанавіць агульную суму рэпарацыйнае запазычанасьці Нямеччыны (гэтая кольчатая праблема плянам Дауэса абойдзена). Б контрольная схема, якая прадугледжана плянам Дауэса і якая абмяжоўвае фінансавую самастойнасьць Нямеччыны, зьнішчаецца. Нямеччына, дзеля забясьпекі часткі сваіх выплат саюзьнікам, выпушчае на біржах Нью-Ёрку, Лёндану і Парыжу некаторую долю сваіх чыгуначных і прамысловых аблігацый (т. зв. камэрцыялізацыя). Водлуг вестак, заснуваецца цэнтральная каса для рэпарацыйных выплат, на чале якое будзе паставлен амэрыканец. Замест таго, каб плаціць ранейшым эўрапейскім саюзьнікам, якія, у сваю чаргу, пераводзяць гэтыя сумы агульнаму ліквяру, каса непасрэдна перадае Злучаным Штатам атрыманыя сумы.

Але які-б ні быў выніх новых рэпарацыйных пераможаў, зразумела, што Нямеччыне, які раней, давядзецца плаціць вялікія грошы. Увесь цяжар гэтых выплат ускладаецца не на панову Шахтаў, Фогляраў і іншых банкіраў і прамыслоўцаў, якія прадстаўляюць з благаслаўленьня меншавікоў Мюллера і Гільфердынга «дэмакратычную» Нямеччыну, а на плечы працоўных мас. Але нямецкі пралетарыят у апошніх бойках паказаў, што ён не намерен пароліва глядзець на выкалачваньне з яго і «нармальнае» і звышнармальнае «рэпарацыйнае» дадатковае каштоўнасьці. Шпаркі рост беспрацоўя ў Нямеччыне сьведчыць, як цяжка нямецкай прамысловасьці спраўціцца з рэпарацыйным выплачваньнем.

СТАЧКА У БАРДО ШЫРЫЦЦА.

САЛДАТЫ САЛІДАРНЫ З БАСТУЮЧЫМІ.

ПАРЫЖ, 11-2. Забастоўка мэталёўцаў на вэрфях у Бардо ня спыняецца, не зважаючы на пагрозы прадпрыемцаў зволіць усіх рабочых, якія ня зьявяцца на працу 11-га лютага. Пад уплывам гэтае забастоўкі на некаторых іншых мэталёпрамысловых, а таксама хімічных, гарбарных і іншых прадпрыемствах Бардо рабочыя патрабуюць павялічыць заработак.

Як паведамляе карэспандэнт «Юманітэ», салдаты пехацінцы, не зважаючы на пагрозы афіцэраў, віталі бастуючых, якія дэманстравалі са сьпевамі антымілітарысцкіх песьняў.

ПАРЫСКІ ТОРГ АБ РЭПАРАЦЫЯХ.

ПАРЫЖ, 11-2. Агенцтва Гаваса паведамляе: „Адчынілася пасяджэньне камісіі рэпарацыйных экспэртаў. Старшынствуе Юнг".

Хваля рабочага абураньня ў Лодзі.

РАБОЧЫ ЦАСІНСКІ НЕ НАП ДАЎ, А АБАРАНЯЎСЯ.

ВАРШАВА, 11-2. Абураньне, выкліканае ў рабочых масах забойствам рабочага Цасінскага дырэктарам Відзоўскае мануфактуры Лодзі Альбэртам Коном, пашыраецца. Паліцэйская і следчая ўлада спрабавалі абмяляваць гэтую справу, як „зачэп" з боку Цасінскага, грунтуючыся на тым, што пры не-ястраным між Цасінскім і Коном дырэктар Кон быў забіты. Аднак, Цасінскі, які памёр ад ран пры гэтай перастрэлцы, ерад сьмерцю катэгарычна заявіў, што дырэктар Кон першым схапіў рэвальвэр, і што стрэлы былі зроблены адначасна з абодвых бакоў.

Лодзінскія рабочыя незбіралі шмат грошай для сям'і Цасінскага. Пад уплывам настроеў мас орган лодзінскае арганізацыі ППС зьмясьціў артыкул пад загалоўкам «Альбэрт Кон—забойца Эдуарда Цасінскага», але нумар газэты канфіскаваны ўладаю.

РЫНКІ СССР УСЁ БОЛЬШ ПРЫВАБЛІВАЮЦЬ КАПІТАЛІСТЫЧНЫ СЬВЕТ

Дзелавыя колы Францыі і Нямеччыны імкнуцца абезапасіць свае пазіцыі ў СССР ад ангельскае канкурэнцыі.

ГАЛАСЫ Ў ФРАНЦЫІ ЗА ПАДПІСАНЬНЕ ГАНДЛЁВАГА ЎГАВОРУ З СССР НЕЗАЛЕЖНА АД УПАРАДКАВАНЬНЯ ПРАБЛЕМЫ ДАЎГОЎ.

КАПІТАЛІСТЫ ЎПЭЎНЕНЫ Ў НАШАЙ ГАСПАДАРЧАЙ МОЦНАСЬЦІ.

БЭРЛІН. 10-2. Зараз жа за артыкулам, агалошаным учора ў «Дейтшэ Алгемайне Цайтунг» наконт адносін Нямеччыны да ўзрастаючага ў Англіі руху за аднаўленьне гандлёвых зносін з СССР, сёе-тое ў гандлёва-прамысловым адзеле «Бэрлінэр Тагеблят» агалошан таксама артыкул, прысьвечаны «зблiжэньню Амэрыкі і Англіі з СССР». Газэта звачарнае ўвагу на тое, што імкненьні Амэрыкі зрабілі вядомы ўплыў на адносіны ангельскае народнае гаспадаркі да савецкае праблемы, і асабліва падкрэсьлівае паведамленьне аб надыходзячым падарожжы ангельскіх прамыслоўцаў у СССР.

Спасылаючыся на паведамленьні свайго лёндонскага карэспандэнта па эканамічных пытаньнях, газэта лічыць, што ангельскія дзелавыя колы імкнуцца атрымаць у першую чаргу заказы для машынабудаўнічае прамысловасьці і для тых галін прамысловасьці, якія могуць удзельнічаць у ажыцьцяўленьні розных грамадзкіх прац, намечаных у СССР.

«Цікава,—піша газэта,—што ангельскія прамысловыя колы зараз зазначаюць, што яны да гэтага часу вельмі песымістычна адносілі разьвіцьцё народнае гаспадаркі ў СССР і што ўрэшце трэба значна вышэй ацаніць крэдытазольнасьць СССР, чымся гэта рабілася да гэтага часу. З гэтае прычыны трэба будзе ажыцьцёвіць сур'ёзнае расьсьленьне крэдытаў, якія надаюцца савецкаму ўраду".

«Ня трэба сумняваецца,—зазначана далей у артыкуле,—што імкненьні Англіі аднавіць савецка-нельзкія сапраўдныя зносіны ў значнай меры выкліканы крызісам ангельскае народнае гаспадаркі. Ва ўсякім разе Нямеччына пачінна ўважліва сачыць за узмоцненым імкненьнем англасаксонскіх краёў да зблiжэньня з СССР».

БОЯЗЬ АХВЯРАВАЦЬ БУДУЧЫНАЮ ДЗЕЛЯ МІНУЛАГА.

ПАРЫЖ, 11-II. Штотыднёвік «Эр Нуэль» зьмясьціў поўны тэкст падпісаных у сьнежні савецка-нямецкіх пратаколаў. У перадавіцы таго ж нумару «Эр Нуэль» зварочае увагу на ажыўленьне эканамічнае дзейнасьці савецкага ўраду, якое адбілася ў памянёных пратаколах, ва ўгаворах з мараканскай Усеагульн. Кампаніяй Электры, кампаніяй Кемпбэль і г. д. Падкрэсьліваючы, што эканамічная сувязі СССР узмацняюцца, часопіс пытае, ці можа Францыя, якая займае чацьвертае месца ў замежным гандлі з СССР, заставацца безудзельным сьведкам гэтага ажыўленьня. Часопіс задае запытаньне, ці нетаргодна зьвязаць упарадкаваньне гандлёвых дачыненьняў з упарадкаваньнем даўгоў.

„Эканамічная барацьба,—значае далей перадавіца,—звычайна накіравана да забясьпечаньня рынкаў збыту і да закупкі на аўбольш нізкіх цэнах тых тавараў, якіх у даным краі не хапае. Зразумела ў такім разе, што ажыт асьць гандлёвага ўгавору перашкоджае пашырэньню францэ-савецкага гандлёвага. Час ужо не падумаць аб матэрыяльнае распачаце перамовы з мэтаю дасягнуць практычнае згоды, неза «жна ад адноў ньня перамоў аб даўгоў, каб не ахвяраваць будучынаю дзеля мінулага».

Рух у Румыніі за нармальныя зносіны з СССР.

ВЕНА, 11-2. Як відаць, пад уражаньнем цьвёрдых зазначэньняў савецкага друку, што падпісаньне маскоўскага пратаколу нічога на зьменьвае ў пазіцыі СССР у бэсарабскім пытаньні, румынскі друк за апошнія дні прызнае, што падпісаньне пратаколу гарантуе спакой, але не азначае, аднак, прызнаньня румынскіх правоў на Бэсарабію з боку СССР.

У зьвязку з гэтым, як відаць у выніку інсьпірацыі афіц йных кол аў, румынскі друк высоўвае на першы план пытань е аб аднаўленьні нармальных зносін з СССР. Орган лібералаў „Эндепендансе Румэн" піша, што нагэма быць і гутарці аб аднаўленьні нармальных зносін з СССР, пакуль СССР ня срыхае заяўнаю суч снуе фактычную няму на Дністры. „Бэсарабскае Слова" зазначае, што падпісаньнем пратаколу Румынія д-факта прызнала СССР. «Бэсарабская Пошта» піша так: «Дзесяты мсяц бэсарабскіх мыхароў, зьвязаных нацыянальнымі ніцямі з СССР, 11 гадоў чакаюць аднаўленьня зносін з СССР. Час перакінуць мост між суседзямі, хаця-б у сэнсе паштова-тэлеграфнае сувязі».

САВЕЦКА-АМЭРЫК. ГАНДАЛЬ ШЫРЫЦЦА

НЬЮ-ЁРК, 8-2. На гадавым пасяджэньні Расейска - Амэрыканскае Гандлёвае Палаты выступаў прадстаўнік праўленьня Дзяржбанку СССР Шэйнман, які зазначыў, што трэба пашырыць гандлёвыя зносіны між Злучанымі Штатамі і СССР. Старшыня палаты банкір Шлі і інжынэр Купэр адзначылі, што вынікі гандлёвых зносін з СССР вельмі здавальняючыя.

У праўленьне Расейска-Амэрыканскае Палаты ўведзен Альфрэд Овайн віце-прэзыдэнт трэсту «Джэлавай Мэтэрс».

„ДОБРЫ ГРУНТ ДЛЯ ДАГАВОРАНАСЬЦІ".

АЦЭНКА ПЭРСПЭКТЫЎ АНГЛА-САВЕЦКАГА ГАНДЛЮ ПАЛК. МАККІ

ЛЁНДАН, 9 г. Агенцтва Рэйтэра паведамляе: „Выдатны амэрыканскі грамадзкі дзеяч і прамысловец палкоўнік Маккі, выехаў сёньня з Ліверпулю ў Канаду пасьля 4-хмесячнага пабыту ў СССР. Ад 1921 году палкоўнік Маккі быў у СССР 16 разоў, прычым кожны раз заставаўся там ня менш 3 х месяцаў і вывучай становішча. У гутарцы з прадстаўнікамі друку Маккі заявіў, што ў СССР аддаюць перавагу ангельскім тавярам, і асабліва ангельскім машынам, перад прадукцыяй іншых краёў. На думку Маккі, ёсьць добры грунт для пашырэньня англа-савецкага гандлю Дэлегацыя ангельскіх прамыслоўцаў, якая едзе ў СССР, сама пераканаецца ў гэтым. Маккі заявіў, што ўласна ён поўнасьцю задаволен тымі гарантыямі, якія дае савецкі ўрад".

Дзелавікі Англіі дзейнічаюць самастойна.

ЛЁНДАН. 11-II. Агенцтва Рэйтэра паведамляе: „У палаце вобшчых кансэрватар Гратам Дойль выступіў з запытаньнем да начальніка дэпартаменту марскога гандлю Хекінга, ці не атрымаў ён прапановы ўвесьці каго-небудзь з чыноўнікаў яго дэпартаменту ў дэлегацыю ангельскае прамысловасьці, падарожжа якое у Расею наладжваецца англа-расейскім камітэтам. Хекінг адказаў: «Не». Далей Хекінгу было зададзена запытаньне, да каго дэлегацыя ангельскіх дзелавых колаў павінна будзе зьвярнуцца ў Расеі за зазначэньнямі і кіраўніцтвам. Хекінг адказаў, што, на яго думку, гэтае зьпытаньне павінна быць адрасавана не да яго. Сябра рабочае партыі Шынвэля запытаў, ці жадае дэпартамент марскога гандлю падтрымаць дэлегацыю. Хекінг адказаў, што да гэтага часу на было заявы наконт такога падтрыманьня. На запытаньне Шынвэля,—ці не даводзіць падарожжа дэлегацыі, што ангельскія гандлёва - прамысловыя колы мацней больш здаровага розуму, чымся ангельскі ўрад,—Хекінг зусім не адказаў".

Кансэрватары зьмянілі тон.

ЛЁНДАН, 11-II. Кансэрватыўная газэта „Обсэрвэр" наконт надыходзячага падарожжа ангельскае дэлегацыі ў СССР піша: „Намечанае падарожжа дэлегацыі дасьць нам грунтоўныя факты, на падставе якіх трэба будзе весьці справы. А там, дзе кіруе прамысловасьць, для дыпляматыі не застаецца нічога іншага, як ісьці за ёю".

ПРАТАКОЛ ПАДПІСАН.

Пасьля правалочак, якія цягнуліся амаль паўтара месяцы, прапан ваны тав. Літвінавым пратакол аб неадкладным увядзеньні ў дзейнічаньне паміж бакамі абавязацельстваў, выцякаючых з пакту Келёга, падпісан СССР, Эстоніяй, Латвіяй, Польшчай і Румыніяй. Далучэньне да пратаколу Фінляндыі і Літвы павінна быць выканана ў бліжэйшы час і зьяўляецца толькі пытаньнем працэдуры.

Рабочыя СССР ніколі не абманваліся наконт сапраўднага значэньня пакту Келёга, як і ўсякіх іншых актаў «мірнага» характару, абавязаных сваім узьнікненьнем ініцыятыве буржуазных дыпляматаў. Рабочыя СССР ведаюць, што ўсякія мірныя дэкларацыі капіталістычных урадаў зьяўляюцца фальшу, бо супярэчаць самой істоце іх імпэрыялістычнай прыроды. Савецкі ўрад, які зьяўляецца абраным рабочымі масамі Савецкага Саюзу, дасканала разумее, што ніякай сапраўдны гарантыяй супроць вайны пакт Келёга не зьяўляецца. І калі савецкі ўрад пры гэткіх умовах усё-ж падпісаў яго, дык толькі таму, што ён лічыў неабходным падтрымаць усякі,—нават самы нязначны—крок да захаваньня міру, а таксама таму, што падпісаньне гэтага пакту палягчала яму магчымасьць далейшай барацьбы за разброеньне.

Усім зразумела яшчэ, якое замяшаньне выклікала зробленая тав. Літвінавым прапанова Польшчы і Літве аб неадкладным увядзеньні пакту у дзейнічаньне паміж гэтымі трыма дзяржавамі і запрашэньні далучыцца да яго ўсім іншым дзяржавам, якія таго пажадаюць. Французкі афіцыёз „Тан" усяк перасьцярагаў польскі ўрад супроць гэтага „хітрага манэўру" савецкай дыпляматы, а польскі друк адносься да яго з незатоеным раздражненьнем. Але выказанае кіраўнікамі замежнае палітыкі Злучаных Штатаў Паўночнай Амэрыкі адабрэньне нашай ініцыятывы і неабходнасьць лічыць з Амэрыкай, ад якой залежыць атрыманьне Польшчай новай пазыкі, прымусіла польскіх дыпляматаў «прыцыпова» згадзіцца на нашу прапанову.

Дасейшая дзейнасьць польскай дыпляматы складалася з таго, каб на практыцы адцягнуць ажыцьцяўленьне гэтай „прынцыпова пажаданай" згоды. Была высунута прапанова аб неабходнасьці прыцягнуць да падпісаньня Румынію з разьлікам на тое, што заклон Румыніяй Бэсарабіі прымусіць савецкі ўрад адказаць на гэту прапанову адмовай, што створыць повад для зрыву савецкай ініцыятывы. Але савецкі ўрад зараз-жа адказаў, што права Румыніі прыняць удзел у падпісаньні пратаколу вынікае з нашай прапановы зрабіць падпісаньне пратаколу мажлівым для ўсіх дзяржаў, якія таго пажадаюць. Савецкі ўрад ніколі не даваў сваёй санкцыі на гэты захоп, але ён лічыць, што гэта не разьвязвае да гэтага часу праблема ў адносінах паміж СССР і Румыніяй не павінна служыць повадам да парушэньня міру. Наш станов ,чы адказ на запытаньне Польшчы аб лёсе Румыніі ў пратаколе зьяўляецца лепшай ілюстрацыяй шчырасьці нашых мірных намераў.

Сьледам за гэтым польскі ўрад спрабаваў ажыцьцявіць сваё глыбокае жаданьне „высунуць" ім яшчэ пры асуджэньні нашай старой прапановы аб падпісаньні дагавору аб ненападзе), абяднаць на гэтым грунце супроць Савецкага Саюзу пад сваёй гегемоніяй усе акраінныя дзяржавы. Дэманстрацыя гэта, аднак, не ўдалася. Пацверакор заяве Польшчы аб тым, каб пакт быў адначасова падпісан усімі акраінымі дзяржавамі, урады Літвы і Фінляндыі лічылі лепшай форму чарговага далучэньня да пратаколу, падкрэсьліўшы гэтым самым, што яны не ўнаўнаважвалі п. Патэка клапаціцца аб іх інтарэсах і прэстыжы.

Але, як бы там ні было, пратакол у сучасны момант ужо падпісан і падпісан у той форме, якая была намечана тав. Літвінавым.

Якія-ж пэрспэктывы ставіць перад намі падпісаньне пратаколу? Было-б вельмі лёгкамысным з нашага боку думаць, што ад гэтага часу ўсякая небясьпека нападу на нас з боку нашых суседзяў з Захаду зусім выключана. Мы ведаем, як мала самастойна палітыка акраінных дзяржаў і як мала падаюць значэньня дагаворам урады капіталістычных краін.

Але ўсё-ж магчымасьць адначасовага нападу на нас з боку ўсіх падпісаўшых пратакол дзяржаў цяпер будзе некалькі цяжэйшай. Цяжэйшай ён таму, што пр такол сам па сабе падрывае ваяўнічыя імкненьні некаторых з нашых суседзяў, ці тых, хто стаіць за іх сьпіною, а таму, што ён палягчае барацьбу рабочых і сялянскіх мас капіталістычных дзяржаў супроць імпэрыялістычных імкненьняў і ўрадаў. Менавіта на гэтым патрымальні працоўных мас і грунтуецца дыпляматычная праца савецкага ўраду па ўзмацненьні міру. Мабілізацыя грамадзкай думкі працоўных мас капіталістычных краін супроць вайны і ваенных падрыхтовак—вось той агульны напрамак нашай надворнай палітыкі, з пункту гледжаньня якога прыхоўзіцца расцэньваць падпісаньне прынятага 9 лютага СССР, Польшчай, Румыніяй, Латвіяй і Эстоніяй пратаколу.

ПОСЬПЕХ САВЕЦКАЕ ДЫПЛЁМАТЫІ У БАРАЦЬБЕ ЗА МІР.

ПЕРШЫЯ ВОДГУКІ НА ПАДПІСАНЬНЕ САВЕЦКАГА ПРАТАКОЛУ

„СССР умацаваў раўнавагу на ўсходзе Эўропы"

ПАРЫЖ, 11-II. Левабуржуазная «Волянтэ» выказвае задаволеньне наконт падпісаньня Маскоўскага пратаколу і піша: „Пратакол зьяўляецца шчасьлівым ажыцьцяўленьнем сур'ёзнага імкненьня савецкага ўраду забясьпечыць спакой. Цяпер павет заключаны ворагі савецкага ўраду, якія раптам абвясьцілі пратакол чарговым манэўрам, прымушаны ведаць, што савецкая дыпляматыя ўмацавала раўнавагу на Ўсходняй Эўропе».

Нарэшце, газэта падкрэсьлівае, што прамова Літвінава пры падпісаньні пратаколу была лічыцца працягам яго адважных выступленьняў у Жэневе на карысьць разброеньня".

Літва незадоволена паводзінамі Эстоніі і Латвіі.

КОЎНЯ, 11-2. Літоўскі афіцыёз «Летувос Айдзо» наконт падпісаньня Маскоўскага пратаколу піша: «Польшча здолела пагрозамі і інтрыгамі прымусіць Латвію і Эстонію падпісаць пратакол адначасна з бю. У зьвязку з гэтым Польшча выступіла ў роли як бы палітычнага кіраўніка гэтых дзяржаў». Газэта зазначае, што ні Літва, ні Эстонія не праводзілі ў гэтым пытаньні самастойнае палітыкі і паказалі свае «вассальную залежнасьць» ад Польшчы.

Газэта піша ўрэшце, што Літва застаецца пры сваёй ранейшай думцы, згодна якое прыбалтыцкія дзяржавы не паміма былі ўдзельнічаць у супольным з Польшчаю падпісаньні пратаколу, а далучыцца да яго пазней.

Польшча купіла латвійскі сялянскі саюз.

РЫГА, 10-2. 5 га лютага, паведамляе «Сацыял-Дэмакратс», на пасяджэньні камісіі сойму па замежных справах сялянскі саюз заявіў, што Латвія можа заразжа далучыцца да пратаколу. Ульмаміс (лідэр сялянскага саюзу) дадаў пры гэтым: „Латвія ні ў якім разе ня можа парушыць сваёй ранейшай палітыкі нэйтралітэту і зьвязаць сябе якім-небудзь блёкам, падпісаўшы пратакол разам з Польшчаю".

8-га лютага лідэры сялянскага саюзу цалкам зьмянілі свой пункт гледжаньня. Выяўляецца, што фірма «Такман», зьвязаная з сялянскім саюзам, атрымала за гэтыя тры дні ад палякаў канцэсію на манапольны прывоз польскага вугалю ў Латвію. Гэтаю цаною палякі купілі перагляд сялянскім саюзам яго пункту погляду на карысьць Польшчы, а таксама згоду сялянскага саюзу падпісаць гандлёвы ўгавор і чыгуначны канвэнцыі з Польшаю, проці якіх сялянскі саюз супярэчыў яшчэ 5 лютага

Заява румынскага даверанага ў справах у Варшаве.

ВАРШАВА, 11-2. Нядзельныя і сёньнішнія газэты ўстрымліваюцца ад апісаньні падпісанага ў Маскве пратаколу.

Афіцыёз «Эпока» зьмяшчае заяву румынскага даверанага ў справах у Варшаве Нану, у якой зазначана: „Падпісаньне Маскоўскага пратаколу зьяўляецца для Румыніі вельмі спрыяючым варункам, бо яно выразна падкрэсьлівае польска-румынскую салідарнасьць і зьмяшчае новы момант—фармальнае абавязацельства СССР ня ўжываць сілы зброі для канчатковага ўпарадкаваньня спрэчак на эўрапейскай прыме Савецкага Саюзу. Гэтыя два моманты гарантуюць захаваньне спакою на Ўсходняй Эўропе і будуць спрыяць эканамічнаму росквіту зацікаўленых нацый, бо самая пагроза вайны перашкаджае эканамічнаму разьвіцьцю народаў".

ЭСТОНІЯ ЗДАВОЛЕНА ВЫНІКАМІ ПАДПІСАНЬНЯ.

РЭВЕЛЬ, 11-2. Уся эстонская праса са задаволеньнем паведамляе аб падпісаньні Маскоўскага пратаколу, і асабліва адзначае той факт, што у падпісаньні ўзяла ўдзел таксама і Латвія.

У Саюзе ССР.

Рабочая дэлегацыя ў Наркамземе РСФСР.

МАСКВА, 11-2. 11-га студзеня НК Земляробства РСФСР наведала рабочая дэлегацыя Массавету ў ліку 80-90 чалавек. Дэлегацыю спаткаў намесьнік наркома Александр Іванавіч Муралаў. Тав. Муралаў азнаёміў дэлегацыю з асноўнымі палажэньнямі сельска-гаспадарчае палітыкі. Члены дэлегацыі высунулі т. Муралаву шмат запытаньняў. Тав. Муралаў даў патрэбныя адказы.

РАЗГОРТВАЕЦЦА БУДАЎНІЦТВА Ў РАЙЁНЕ ДНЕПРАБУДУ.

НАМЕЧАНА ЗЛУЧЫЦЬ ДНЕПРАБУД З ДАНБАСАМ СПЭЦЫЯЛЬНАЙ МАГІСТРАЛЬЮ.

МАСКВА, 11-2. У старшыні СНК СССР тав. Рыкава адбылася нарада па пытаньнях вынарыстаньня энэргіі Днепрабуду. У нарадзе ўзялі ўдзел т. т. Куйбышаў, Варашылаў, Ломжынаўскі, Калінін, Чубар і шмат выдатных спэцыялістаў. У ліку іншых прадстаўнікоў ведамстваў у нарадзе ўзялі ўдзел акадэмік Іпацьцеў, праф Графтыё, праф. Александраў, праф. Кароч чаен прэзыдыуму ВСНГ СССР Долгаў і інш. Нарада абмяркоўвала пытаньні будаўніцтва ў райёне Днепрабуду хімічных і мэталюргічных заводаў, а таксама пытаньне аб злучэньні Днепрабуду з Данбасам спэцыяльнай магістраллю, каб выкарыстаць энэргію Днепрабуду ў намечанай вугольнай прамысловасьці. Нарада прыняла да выведу аб патрэбе распрацаваць шэраг праблем, выкінутых ВСНГ СССР у зьвязку з выкарыстаньнем энэргіі Днепрабуду, у тым ліку і пробленю пабудовы ў райёне Днепрабуду магутнага мэталюргічнага заводу.

Неадноўленыя ў выбарчых правох выключаюцца з прафэсыянальных саюзаў.

Тлумачэньне УЦСПС.

МАСКВА, 11-2. УЦСПС растлумачвае, што члены прафсаюзаў, пазбаўленыя выбарчых правоў, застаюцца ў шэрагах прафсаюзаў толькі ў працягу аднаго году. За гэты час пазбаўленыя правоў но уць дамагацца вырашэньня пытаньня аб аднаўленьні іх у выбарчых правох. Пры год пазбаўленыя выбарчых правоў выключаюцца са складу прафсаюзу.

У РСФСР адчыняюцца новыя выш. тэхн. навуч. установы

ЛЕНІНГРАД, 11-2. На губканферэнцыі навуковых працаўнікоў заслуханы даклады загадчыка Галоўпрафасьветы РСФСР тав. Вышынскага і начальніка галоўнае управы вышэйшых тэхнічных навучальных устаноў т. Аралава. Яны паведамілі, што надыходзіць заснаваньне шэрагу новых вышэйшых тэхнічных навучальных устаноў, галоўным парадчам, у райёнах прамысловасьці і сыравіны.

Даклядчыкі падалі шэраг прыкладаў клясава-варожых выступленьняў прафэсуры. Тав. Вышынскі зазначыў, што на РСФСР ёсьць кала 2.000 прафэсароў і дацэнтаў, час абраньня іх на катэдру ўжо скончыўся. У бліжэйшыя тыдні ў Ленінградзе пачнуцца перавыбары па та іх катэдрах. Перавыбары ня маюць нічога агульнага з чысткаю: прафэсура, якая задавальвае патрэбаваньням, будзе ізноў зацьверджана. Што-ж датычыць асоб, якія страцілі навуковую кваліфікацыю, альбо асуджаны вузаўскаю грамадзкасьцю, дык яны будуць заменены іншымі.

Канфэрэнцыя абрала на ўсесаюзны зьезд навуковых працаўнікоў, які адчыняецца 23-га лютага ў Маскве, дэлегацыю з 34 чалавек. У ліку дэлегатаў новых акадэмікі т. т. Бухарын, Разумаў, Мар, Ольденбург і інш.

Нашы трыеры лепшыя за заграничныя.

ВЫПУСК ТРЫЕРАЎ ПАВЯЛІЧАН.

ВАРОНЕЖ, 8 2. У выніку ліста т. Рудзутака, завод „Трыер" павялічвае сваю прадукцыю. Жалезам і чыгуном завод забясьпечан. Атрымана належная колькасьць сітаў. Завод выпушчае 15 трыераў за дзень і праз некаторы час выпуск будзе даведзен да 20-ці. Да гэтага часу завод ня мае зацьверджанага стандарту.

З 10-ці савецкіх гаспадарак, куды былі пасланы трыеры на спробу, адна ка прыслана толькі ад аднае. Камуна імя Леніна ў сваёй адэсцы піша, што савецкі трыер значна лепшы за трыер сыстэмы «Гейда». Ён меншы памерам але больш прадукцыйны і лепш адсартоўвае збожжа.

Дабралёт на службе працоўных.

МАСКВА, 11-2. Ажа з вясковых настаўніц Барэніі, якая брала ўдзел у перавыбарах саветаў, заблудзіла і адморозіла сабе ногі. Яе знайшлі сялане і завезьлі ў больніцу гораду Пудажа.

З прычыны таго, што горад Пудаж, знаходзіцца за 250 верст ад чыгункі, і хутка перавезьці хворую ў Ленінград на аперацыю нельга, пудажскі саюз працаўнікоў асьветы зьвярнуўся па тэлеграфе ў Маскву з просьбаю даставіць хворую настаўніцу ў Ленінград на самалёце. Праўленьне Дабралёту, згодна просьбы ЦК працаўнікоў асьветы, пасылае сёньня, 12-га лютага, дзеля гэтага адзін з сваіх пасажырскіх самалётаў з лётчыкам Міхеевым у Пудаж.

XII ЗЬЕЗД КП(б)Б.

СПРАВАЗДАЧА ЦЭНТРАЛЬНАЙ КАНТРОЛЬНАЙ КАМІСІІ КП(б)Б.

Даклад Старшыні ЦКК КП(б)Б тав. КАЛНІНА.

Якія задачы стаялі перад ЦКК КП(б)Б.

Перад ЦКК РСІ стаялі задачы: правядзеньне рашучай барацьбы в усіві вярашкодамі, якія сустракаюцца а шляху разгортваньня самакрытыкі; больш рэзкая пастаноўка пытаньня аб барацьбе з бюракратызмам і сьвіжэньня і дзяржаўнага апарату; палепш ньне дзяржаўнага апарату праз рацыяналізацыю яго і мерапрыемствы па вызвіжэньні тых перашкод якія есьць на шляху паскораньня тэмпу індустрыялізацыі нашай краіны; кантроль і праверка выкаваньня дырэктыў партыі і ўраду і барацьба за адзінства партыі і чыстка партыі ад элементаў, што разлагаліся.

Плян работы ЦКК РСІ ў асноўным зводзіўся да наступнага: у галінесавецкага апарату праверка работы рэарганізаваньня а савецкага апарату, абсьледаваньне і правядзеньне поўных мерапрыемстваў па палепшаньню работы і раньвалізацыі візнаго савецкага апарату, спрачэньне справаздачнасьці і праверка правядзеньня савецкай дэмакратыі.

У галіне гаспадарчага будаўніцтва плян у асноўным зводзіўся да праверкі таго, як праводзіцца капітальнае будаўніцтва, зьвіжэньне будаўнічага інвэнтару, як ідзе работа мясцовай прамысловасьці, як праводзіцца пасеўная кампанія клапэрацыяй, савгасамі, калгасамі, як ідзе 20 проц. зьвіжэньне адміністрацыйных выдаткаў, як прапуе чыгуначны транспарт.

У галіне культурнага будаўніцтва: школьнае будаўніцтва, ліквідацыя непісьменнасьці, падрыхтоўка кваліфікаванай рабочай сілы, абсьледаваньне пасобных тэхнікумаў і г. д.

У галіне абслугоўваньня савецкім апаратам працоўных масаў плян зводзіўся, галоўным чынам, да таго, каб праверыць работу судовых органаў, міліцыі, установ грамадзкага хараваньня, страхкасы і г. д.

У мінулым годзе мы мелі надзвычайна шмат розных паза плянавых заданьняў. Ня гледзячы на гэта, наш плян быў нами выкаван. Якасьць работы за мінулы год, на што мы асабліва павінны зьвярнуць увагу, значна палепшылася.

Мэтады работы ЦКК КП(б)Б.

Якім чынам мы праводзілі работу? Рабоча Сялянская Інспэкцыя ваці на быць арганізатарам мас, Рабоча-Сялянская Інспэкцыя павінна цягнуць шырокія і сялянскія масы ў сваю работу ў адносінах барацьбы з бюракратызмам, у работу па палепшаньні дзяржаўнага апарату і па цэлым радзе іншых мерапрыемстваў.

Ці праведена была НК РСІ гэта работа? Я павінен сказаць, што за справаздачны перыяд ЦКК і НК РСІ гэту работу пасавілі ва ўсёй шырыні перад сабою і, галоўным чынам, згрупавалі ўвагу на ўцягваньне шырокіх рабочых і сялянскіх мас у сваю работу. Упершыню НК РСІ паставіў работу такім чынам, каб вынесьці работу ЦКК і НК РСІ у шырокія масы і зрабіць Рабоча-Сялянскую Інспэкцыю сапраўды такой, каб яна адпавядала сваёй назве на замысьле тав. Леніна.

Якія мы маем у гэтых адносінах вынікі? Я прачытаю толь і некалькі лічбаў. Калі ўзяць усе кантрольныя камісіі Беларусі, дык мы за справаздачны перыяд уцягнулі ў сваю работу рабочых і сялян, прыкладна 7140 чал. Гэта цэлая армія, якая, пры правільнай арганізаванасьці зможа прынесьці вялізарную дапамогу ў рабоце ЦКК і НК РСІ і з гэтай армяй магчыма значна пасунуць работу ўперад.

Цэнтральная Кантрольная Камісія і НК РСІ супольна з Бюро Скаргаў было ўцягнута ў работу 1012 чал., у гэты лік уваходзяць непасрэдна рабочыя ад варштату. Прыцягваліся да нашай работы вытворчыя камісіі, эканомкамісіі, фабкомы, лёгкая кавалерыя, дабраахвотнікі.

У гэтых адносінах нам аказвалі значную дапамогу прафсаюзы, асабліва вытворчыя камісіі, эканомкамісіі, наогул—візавыя зьвеньні. Трэба адзначыць, што найбольш высунуліся ўперад у сэнсе ўцягненьня рабочых і сялянскіх мас у работу акруговых кантрольных камісій — Гомель, Віцебск, Менск і Бабруйск.

На апошнім месцы стаіць Мазырская кантрольная камісія.

Якім чынам мы рабілі справаздачу перад рабоча-сялянскімі масамі? Якія вынікі мы маем у гэтых адносінах, калі параўнаць з мінулым годам?

Калі ў мінулым годзе па агульных і пасобных пытаньнях мы зрабілі перад масамі 291 даклад, дык у гэтым годзе мы зрабілі, прыкладна, 608 дакладаў. Калі летась у нэтральным і мясцовым друку мы вынасьцілі, прыкладна, 432 артыкулы, дык у гэтым годзе—988 артыкулаў. Недахоп у гэтых адносінах заключаецца ў тым, што мы дагэтуль ня маем добра наладжанага вучоту ўсіх тых актыўных сіл, якія прымаюць удзел у рабоце ЦКК і акруговых кантрольных камісіях, і якія магілі-б быць і павінны быць крыніцаю вылучэньня на гаспадарчую і савецкую работу.

Мы таксама пасапраўднаму дэбра не навучыліся арганізоўваць усю гэту семітысячную армію так, каб яна дала большую карысьць, чым мы зараз маем.

Самакрытыка дапамагла аздараўлехьню апарату.

Перайду да пытаньня аб правядзеньні лёзунгаў самакрытыкі рабочай, савецкай і ўнутрыпартыйнай дэмакратыі.

Як у нас стаіць справа, ці дабіліся мы ажыцьцяўленьня гэтых лёзунгаў, ці не? Я думаю, што мы у гэтых адносінах маем вялізарныя вынікі. Паперша, праз самакрытыку выкрываліся і выкрываюцца цэлы рад ненармальнасьцей.

Перш за ўсё я хачу спыніцца на тым, што яшча існуе няправільнае разуменьне лёзунгу самакрытыкі пасобнымі таварышамі. Падам некалькі фактаў. 17-га студзеня 1929 году, адзін з работнікаў Наркамвему, Лабаноўскі, сказаў на пасяджэньні прэзыдыуму ЦКК у адносінах да самакрытыкі наступнае: «Гэта не самакрытыка, а Шэмякін суд. Як можна так у газэце пісаць пра мяне?". Вы памятаеце, што ў газэтах быў цэлы рад артыкулаў аб скажэньні правільнай лініі, аб правым ухіле ў вышэйшым замельным кантролі. Вось у адказ на гэта і дау такую адзнаку самакрытыцы т. Лабаноўскі

Адзін начальнік раённай міліцыі рабіў даклад у адным раёне. Па яго дакладу выступала шмат рабочых, сялян, служачых. Крылі. Пасьля скавэньня сходу гэты начальнік зараз-жа занёў судовую справу за «дыскрэдытаваньне савецкай улады» у адносінах да тых, якія крылі яго даклад.

Ня лепш стаяла справа і ў Мазыры, калі па дакладу райвыканкому выступалі рабочыя і крытыкавалі дзейнасьць... зубнога доктара. Гэта справа таксама была накіравана ў суд, рабочых павінны былі судзіць, але, гэта справа ня была праведзена. Адзін пракурор у сваім заключэньні у адносінах газэтнай заметкі, напісанай камуністам, у якой выкрываюць учынкі начальніка Допру, піша, што гэты камуніст на меу вялікага права пісаць у газэце і выкрываць няправільныя учынкі гэтага начальніка папраўчага дому, бо ён... не пашасіў дазволу адпаведных партарганізацый. І пасьля гэтага, «адпаведная партарганізацыя», камуністу, які напісаў заметку, зрабіла вымову і зьняла з работы «за склоку».

У Менску таксама былі такія выпадкі. Два камсамольцы напісалі ў РСІ і патрабавалі таго, каб Белмясгандаль палепшыў работу. Гэтых камсамольцаў называлі бузацёрамі і звольнілі з работы «за бузацёрства». Калі адзін з судных работнікаў Мазыра камуністы, напісаў, разам з беспартыйнымі, у «Правду» артыкул—„Судзьдзі-значыцы", дык бюро АК паставіла пытаньне аб зьняцьці з работы гэтага аўтара і паставіла абмеркаваць пытаньне аб яго партыйнасьці.

На другім артыкуле, які быў надрукаваны ў „Правде"—«Чалавек з цэнтру». Калі Мазырскі акруговы камітэт партыі разгледзіў гэта пытаньне, то вынес пастанову такога зьместу: «Прасіць ЦК КП(б)Б аб тым, каб прасіць цэнтральны орган „Праўду" неправераных артыкулаў не зьмяшчаць, бо гэта дыскрэдытуе арганізацыю і адказных працаўнікоў».

Член былога складу Аршанскага акруговага партыі, калі адзін з членаў прэзыдыуму ЦКК зрабіў у Воршы даклад аб неабходнасьці пашырэньня і правядзеньня лёзунгу самакрытыкі, патрабаваў скліканьня закрытага пасяджэньня бюро акруговага партыі для абгаварэньня гэтага дакладу, як дакладу, які дэзарганізуе і б'е на партыйным кіраўніцтве.

Вось як адносіліся пасобныя таварышы да пытаньня самакрытыкі. Натуральна, што такое разуменьне правядзеньня лёзунгу самакрытыкі і такія адносіны ў значнай ступені перашкаджалі укараненьню і ажыцьцяўленьню лёзунгу самакрытыкі. Мне думаецца, што значна большымі былі-б у нас вынікі ад правядзеньня лёзунгу самакрытыкі, калі-б у нас на месцах было больш увагі па ўсіх тых заявах і указаньнях, якія робяць рабочыя масы і радавыя члены партыі. Часамі на гэтыя заявы і на гэтыя ўказаньні не рэагуюць, і гэта таксама зьяўляецца мінусам пры правядзеньні і паглыбленьні лёзунгу самакрытыкі.

Інстытуцыя, якая больш узмоцнена праводзіла лёзунг самакрытыкі ў жыцьцё, якая ў значнай ступені дапамагла партыі правесьці гэты лёзунг самакрытыкі,— гэта наш друк. Друк надзвычайна многа аддаў увагі лёзунгу самакрытыкі ў першы перыяд; у апошні час гэтая ўвага некалькі паслабла. Ня маюць рацыі тыя таварышы, якія кажуць, што ў друку вельмі многа скажэньняў, няправільнасьцей і інш. Мне думаецца, што гэта зусім няправільна. Я гэтым падам лічбы аб гэтым, якія абвяргнуць гэтыя довады. Трэба сказаць, што друк сваю ролю ў адносінах правядзеньня лёзунгу самакрытыкі ў нас у Беларусі выканаў з усёй сілай. Трэба, каб у далейшым друк працягваў сваю работу, не паслабляючы яе, а яшча больш узмацняючы.

Я ня буду спыняцца на тэй ролі ва ўсёй гэтай справе, якую адыгралі рабкоры, спынюся на адмоўных зьявішчах у гэтым руху. У нас сярод рабкораў былі пасобныя выпадковыя элементы, якія пад сьцягам рабкора робяць розныя ўчынкі,—гэткая справа барысаўскага «рабкора» Фрыда.

У Гомельшчыне надзвычайна яскравы прыклад—справа Мяжоньвікава і г. д.

Але побач з гэтымі адмоўнымі зьявішчамі рабкоры аказалі вялікую дапамогу ва ўсёй нашай рабоце.

Ці правільна наш друк высьвятляў тыя ці іншыя выкрываючага характару матэрыялы і тыя недахваты, якія есьць? Я тут буду гаварыць аб тых матэрыялах, якія праверены кантрольнай камісіяй РСІ.

Калі прагледзець усё гэта, дык калі 78 проц. усіх зьмешчаных у друку артыкулаў і атрыманых намі з рэдакцыі заметак нацэньзуюцца і толькі 22 проц. не нацэньзуюцца.

Куды друк больш за усё зьвярнуў увагу? Недахваты гаспадарчых органаў—27 проц.; недахваты прадпрыемстваў—26 проц., наогул па гаспадарчых пытаньнях 53 проц. з усіх матэрыялаў, аб савецкіх установах—20 проц., аб візавым савецкім апараце—10 проц., аб кааперацыйных органах—7 проц., аб партыйных арганізацыях—4 проц., аб прафсаюзных—3 проц., аб камсамольскіх—2 проц. Я думаю, што на апошняй частцы можна было-б значна больш завастрыць увагу друку, не паслабляючы, зразумела, увагі па асьвятленьні пытаньняў гаспадарчага і савецкага будаўніцтва.

Аб рабочай дэмакратыі.

Ці ёсьць у нас яшчэ выпадкі зажымаў? Ёсьць у цэлым разе мець. Ці ёсьць парушэньні рабочай дэмакратыі? Ёсьць. Як можна назваць інакш, калі не зажымам, такі факт, калі ячэйка КП(б)Б Менскага Мясгандлю зьняла камсамольцаў за тое, што яны крычалі аб злачынствах і аб неабходнасьці палепшыць пастаноўку работы. А нарушэньні дэмакратыі? Напрыклад, у Гоме і на шчацінай фабрыцы пры перавыбарах фабрычна-заводзкага камітэту хіба ня было поўнага парушэньня рабочай дэмакратыі з боку самой партыйнай ячэйкі.

Зразумела, было. А хіба гэтага ў Магілеве няма? Ёсьць цэлы рад фактаў. Нам належыць яшчэ больш напісаць для таго, каб тое, што было ўказ на ў чарвеньскай адозьве ЦК УсеКП(б), было поўнасьцю праведзена і рашучым чынам. Трэба змагацца з усякімі спробамі, якія будуць парушаць правядзеньне дырэктывы партыі, данай чэрвеньскім лістом ЦК УсеКП(б). У галіне правядзеньня савецкай дэмакратыі мы маем цэлы рад парушэньняў. Напрыклад, у Мазыры, калі сталі таварыць цэламу раду ра отойкаў, што нельга дапускаць такіх рэчаў, дык гэтыя работнікі аказалі: „Я ў «кажеском корпусе» ня вучыўся", „калі селяніна ня вылаеш матам ад добрага сэрца, нічога добрага ня будзе" і г. д.

А вось нядаўна таварышы з Воршы выступілі і скажуць, ці зусім законна абраны ціперашні склад Горанкага райвыканкому, калі падыйсьці да гэтага пытаньня з пункту погляду савецкай дэмакратыі. Ёсьць выпадкі, калі якога-небудзь работніка за тое, што ён добра «накрыў» члена гарсавету, выклікалі на другі-ж дзень у гарсавет і давалі «трэпку», папярэджваючы, каб ён не адважваўся так выступаць, бо «нельга дыскрэдытаваць тых людзей, якіх мы самі вылучылі і абралі». Трэба в усёй рашучасьцю змагацца з такімі адмоўнымі зьявішчамі.

Савецкі і судовы апарат.

Мы праверылі, як працуе рэарганізаваны дзяржаўны апарат, пераведзены на функцыянальную сыстэму. Што мы там знайшлі? Мы знайшлі, што ва ўсіх тых выпадках, калі з боку кіраўнікоў установ, з боку саміх працаўнікоў было жаданьне сапраўды перавесьці ўсю работу на функцыянальную сыстэму, там якасьць работы палепшылася, а там, дзе гэта работа была праведзена нядбайна, няправільна, там якасьць работы, зразумела, не палепшылася.

Нашы дзяржаўныя ўстановы надзвычайна слаба прымаюць меры да таго, каб самім праводзіць рацыяналізатарскую работу, а ўсю сваю ўвагу сканцэнтроўваюць на тым, што вось, прыдзе РСІ, і ў нас з галавы да ног будзе праведзена рацыяналізацыя.

Нам удалося выкрыць цэлы рад ненармальнасьцей у рабоце судовага апарату. У спрэлніх у нас у судовых органах з моманту пачатку сьледзтва да скончэньня судовага працэсу праходзіць 345 дзен. Натуральна, што цэлы рад спраў трацінь сваю востраньць і значэньне. А калі паглядзець, як абстаіць права ў сэнсе залежаньня спраў, дык тут мы будзем мець малюнак яшчэ горшы.

Таму зараз уводзяцца ў гарадох і ў вёсках, як практыка, таварыскія суды, якія павінны ўзяць на сябе задачу раз ладу дробных спраў больш спрошчаным парадкам.

Таварышы, вы ведаеце спарву по ланкіх судовых работнікаў, віцебскіх, вы напэўна ведаеце і аб гомельскіх судовых працаўніках, мазырскіх. Усё гэта гаворыць аб тым, што трэба рашучым чынам палепшыць склад судовых працаўнікоў. Толькі гэта дасьць нам магчымасьць правільна паставіць гэту работу.

Рэвалюцыйная законнасьць.

Ці былі ў нас парушэньні рэвалюцыйнай законнасьці? Былі. Калі Аршанскі Акруговы Камітэт (старога складу) разглядае судовыя справы і вынесьце, якую спыніць і якую ня спыняць, хіба-ж гэта не парушэньне рэвалюцыйнай законнасьці? А ў Віцебску хіба ня было такіх выпадкаў?

Пераходжу да пытаньня аб міліцыі, як адной з арганізацый, якая надзвычайна цесна штодня мае дачыненьне да працоўных мас. Па сучасным складзе міліцыю нельга назваць работа-сялянскай, а можна назваць толькі сялянскай, бо праслойка рабочых у ёй складае ўсяго якіх-небудзь 10-12 проц., а рэшту складаюць выключна сяляне. Трэба дабіцца такога палажэньня, каб сапраўды быў у нас моцны рабочы склад міліцыі.

Да гэтага часу на міліцыю быў усклазён цэлы рад зусім непатрэбных функцый. Мне думаецца, што будзе правільна, калі я скажу, што тыя пастановы, якія прынялі СНК, значна палягчаюць стан міліцыі.

Некальні заўваг аб працдысцыпліне нашых савецкіх устаноў. Калі мы паглядзім лічбы свачасовага прыходу на работу, дык яны паказваюць што ў нас працоўная дысцыпліна ў савецкіх установах на зусім на вышыні. Трэба будзе заняцца гэтай справай, сапраўды паставіць работу такім чынам, каб можна было падняць больш высока тэмп работы нашых савецкіх устаноў.

20 проц. скарачэньня адміністрацыйных выдаткаў.

Мы ня можам зараз назваць даклад-ную лічбу выкананьня дырэктывы аб 20 проц. скарачэньні адміністрацыйных выдаткаў, бо яграз зараз ідзе праверка.

Калі ўзяць усе ўстановы на дзяржаўным і мясцовым бюджэце, гандлю, кааперацыі, чыгункі (без МБВ і ўсіх тых чыгунак, праўленьні якіх не знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі), дык скарачэньне павінна даць 7.075.000 р. На дзяржбюджэце дырэктыва выканана поўнасьцю складае 20,8 проц. На мясцовым бюджэце, уключаючы сюды ліквідацыю раёнаў і акруг, якая была праведзена ў 1927 годзе, скарачэньне складае 23,4 проц. На транспарце (выключна па Зах. чыг.)—скарачэньне на 24 проц. Што датычыць мясцовай прамысловасьці, дык мы даклада ня можам назваць лічбы, але скарачэньне прыкладна павінна даць па рэспубліканскай прамысловасьці—21,6 проц., па мясцовай прамысловасьці без Мазыра, бо мы не атрымалі матэрыялаў аб ім,—19,7 проц., ці суму у 212.000 руб., кааперацыя—паўгісьёна рублёў, ці скарачэньне на 15 проц., крэдытныя ўстановы—17,2 проц.

Барацьба з бюракратызмам і цеганінай.

У пачатку свайго дакладу я сказаў, што мы ўцягнулі самыя шырокія масы рабочых у работу ЦКК-НК РСІ, гаварыў таксама аб абсьледваньні міліцыі, суду і г. д.

Усё гэта мы рабілі пад пунктам погляду барацьбы з бюракратызмам. З гэтай жа мэтай было рэарганізавана Бюро Скаргаў пры Наркамце РСІ і у акругах, пры яграх была лёгкая кавалерыя і г. д.

У выніку ўсёй гэтай работы значна ўрос за гэты год лік скаргаў на дзяржапарат, які дасягнуў цэнтраў 50 60 у дзень.

Барацьба з бюракратызмам вялася намі ў двух напрамках: праз Бюро Скаргаў і па больш буйных справах праз кантрольныя групы. Калі па кантрольных групах у мінулым годзе было разглежана ўсяго 192 справы, дык у гэтым годзе разглежана ўжо 261 справа з прыцягненьнем 347 чалавек. Гэтыя справы разьмяркоўваюцца так: па цэнтральныя, акруговыя і раённыя савецкія ўстановы з агульнае колькасьці 261 падае 72, на гаспадарчыя органы — 93, на кааперацыю — 37, на сапстрах, біржу працы і падобныя органы — 28, на суд і міліцыю — 13. Па гэтых справах перадана пракурору для прыцягненьня да суду 43 чалавека, вынесена строгая вымова—10, проста вымова—90.

Я лічу, што ў сэнсе барацьбы з бюракратызм, з парушэньнямі клясавай лініі мы павінны ў далейшым з усёй рашучасьцю і з усёй сілай працягваць работу і па тавіць яе так, каб наш дзяржапарат працаваў больш выразна, чым ён зараз працуе.

Аб чыстцы савецкага апарату.

У мінулым годзе, ды ня толькі у мінулым годзе, мы ўвесь час гэтым пытаньнем займаліся. Летась мы ўсяго вычысьцілі 300 чалавек. Але ў нас няма гарантый, што вычышчаныя праз некаторы час зноў увезуць на працу.

У нас, у дзяржапараце, ёсьць больш чым выстарчальная колькасьць чужых нам элементаў.

Калі мы возьмем такую лічбу, што ў акруговай зачыненай камісіі Віцебскай акругі былых адказных служачых царскага часу мы маем 25 проц., дык гэта сьведчыць аб вялікай вісьвічанасьці нашага апарату. А што ж мы робім у сэнсе вылучэньня? Вельмі мала амаль нічога. Чыстку апарату нам трэба правесьці в усёй рашучасьцю.

Трэба правесьці работу па чыстцы ўсіх дзяржаўных апаратаў у адкрытым парадку, запрасіць да гэтай работы ўсю рабочую савецкую грамадзкасьць да таго, каб гэтая неабходная мерапрыемства правесьці ў бліжэйшым часе.

Практычна на мясцох нашы партыйныя арганізацыі павінны здзяйсьніць чынам сябе падрыхтоўваць. Што значыць падрыхтоўваць? Гэта значыць, што ўсе тыя заявы, якія ёсьць у сэнсе бюракратычных а пасля таго ці іншага супрацоўніка, пры агульнай рабоце на чыстцы скарыстаць. У той жа час трэба паставіць, як адну з важнейшых задач, каб наш друк, як у цэнтры, так і ў акругах па гэтых пытаньнях зараз больш ударыў.

Гаспадарчае і культурнае будаўніцтва.

Калі мы возьмем адно з буйнейшых будаўніцтваў—Асінбуд, дык тут таксама па першапачатковым праэкце было выяўлена, што ўсё будзе каштаваць 13.500.000 руб. Да моманту праверкі—увосну мінулага году—было выяўлена, што будзе каштаваць 16.963.000 рублёў, але як відаць, канчатковым праэктам наўрад ці мы ўложымся ў 17.000.000 рублёў.

Як абстаіць справа ў бягучым годзе? Думаю, што добра будзе, калі мы вазострым увагу на гэтым пытаньні. У мяне асабіста няма ніякай упэўненасьці, што летаньні памылкі не паўторацца у гэтым годзе. З фінансаваньнем таксама абстаіць ня зусім добра. У нас ёсьць цэлы рад выпадкаў пры новым будаўніцтве, калі мы разчахваемся значна больш, чым ёсьць сродкаў. Калі гаварыць аб адносінах мясцовай прамысловасьці, дык трэба проста сказаць і проста паставіць пытаньне, што мясцовая прамысловасьць ня была выстарчальна ўвязана з агульным планам разьвіцьця рэспубліканскай прамысловасьці.

Зямельнае пытаньне.

Перш за ўсё аб савгасах і калгасах. Мы ў гэтым годзе адалі вялікую ўвагу калгасам і савгасам в двух пунктах погляду: паперша, як ажыцьцяўляецца дырэктыва аб перадачы калгасам і савгасам тэхнічных прадпрыемстваў і, падругое, як абстаіць справа арганізацыйна са станам калгасаў і савгасаў. Што да пытаньня аб палепшаньні пастаноўкі работы ў савгасах і калгасах, дык мы тут таксама маем поўныя дасягненьні, але ўсё-ж як калгасам, так і савгасам застаецца пажадаць яшчэ шмат лепшага. Хоць у многіх савгасах павысілася ўрад аінасьць, хоць у сэнсе забесьпячэньне жывёлай, цягавай сілай і інш інвэнтаром становішча значна лепш, чым некалькі год таму назад але ўсё ж ёсьць цэлы рад выпадкаў, калі савгасы яшчэ не зьяўляюцца паказальнымі і не распаўсюджваюць свайго ўплыву на навакольнае сялянства; у той-жа час прадукцыйнасьць малочнае жывёлы ў іх надзвычайна нізкая. Ня гледзячы на тое, што ў гэтым годзе савгасы правялі цэлы рад мерапрыемстваў, якія да некаторай ступені палепшылі іх уплыў, як, напрыклад, шляхам даны па епшанага насеньня і г. д., але ўсё-ж у іх ёсьць яшчэ шмат дэфактаў. Што датычыць калгасаў, дык у 1928 годзе яны далі такі рост, што за адзін гэты год было утворана во вых калгасаў столькі-ж, колькі да гэтага арганізавалася за ўвесь перыяд існаваньня савецкай улады.

Бліжэйшай задачай зьяўляецца абавязкова дабіцца ўзмаваньня самых калгасаў, палепшаньня арганізацыйнай пастаноўкі іх справы і рашучае работы па палепшаньні ва ўсіх адносінах саміх калгасаў.

Я ня буду закранаць пасеўнае кампаніі і лясоў мясцовага значэньня, а перайду проста да зямельных судоў. На гэтым пытаньні трэба спыніцца таму, што амаль на ўсіх акруговых партыйных канфэрэнцыях становішча зямельных судоў і практыка работы выклікала надзвычайна рэзкія і шматлікія выступленьні. Я сам, будучы ў Гомелі і Воршы, меў магчымасьць назвіраць, як вя ра в ступал тяна ы ша па г тых п авах

Гэта, п мой сьведчыць аб тым што работа зямельных камісій была невыстарчальна выразна і правільна пастаўлена. Мы раз лядалі некалькі спраў з пункту погляду праверкі, як гэтыя справы праведзены, і з гэтых спраў відаць, што тут была зусім неправільная пастаноўка справы.

Я ня буду шмат спыняцца на пытаньні, якія тут былі скажэньні. Прыкладаў можна прывесьці шмат, прыведу толькі адзін. Кулак найчасьцей батрачку; сын гэтага кулака пачынае жыць з батрачкай: батрачка уключаецца ў сьпіс членаў сям'і. Калі-ж у батрачкі нарадзілася дзіця, сын кулака выганяе яе з дому. Батрачка падае ў суд просіць спагнаць аліменты; суд выносіць пастанову аб выдаленьні з гэтае гаспадаркі поўнае маемасьці і з гэтае гаспадаркі поўнае маемасьці выдаткаў, бо акраз зараз ідзе праверка.

Калі ўзяць усе ўстановы на дзяржаўным і мясцовым бюджэце, гандлю, кааперацыі, чыгункі (без МБВ і ўсіх тых чыгунак, праўленьні якіх не знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі), дык скарачэньне павінна даць 7.075.000 р. На дзяржбюджэце дырэктыва выканана поўнасьцю складае 20,8 проц. На мясцовым бюджэце, уключаючы сюды ліквідацыю раёнаў і акруг, якая была праведзена ў 1927 годзе, скарачэньне складае 23,4 проц. На транспарце (выключна па Зах. чыг.)—скарачэньне на 24 проц. Што датычыць мясцовай прамысловасьці, дык мы даклада ня можам назваць лічбы, але скарачэньне прыкладна павінна даць па рэспубліканскай прамысловасьці—21,6 проц., па мясцовай прамысловасьці без Мазыра, бо мы не атрымалі матэрыялаў аб ім,—19,7 проц., ці суму у 212.000 руб., кааперацыя—паўгісьёна рублёў, ці скарачэньне на 15 проц., крэдытныя ўстановы—17,2 проц.

Аб адзінстве партыі.

Апошняя частка майго дакладу—гэта пытаньні барацьбы за адзінства партыі, аб чыстцы партыі і г. д. Зусім ясна, што ў нас у партыі ня можа быць ні правых, ні левых уклёнаў, таму што нідзе ва ўсім сьвеце няма больш левай партыі чым камуністычная партыя. Усякія адхіленьні ў бок правага або левага ўхілу будуць весьці выключна да лініі, якая будзе накіравана супроць партыі, супроць ленінізму, супроць таго, што ленінская партыя павінна праводзіць. Пасьля XV зьезду партыі нами былі прыняты меры да таго, каб вызваліць нашу партыю ад трацкістаў. Нами было прыцягнута да партыйнай адказнасьці на ўсёй Беларусі 86 таварышоў.

Склад прыцягнутых да адказнасьці такі: рабочых 58, з іх ад варштату толькі 24, сялян 2, служачых 26 чал.

Выключана з КП(б)Б 53 чал. за ўдзел у арганізацыях трацкісцкае апазіцыі.

Пасьля XV партыйнага зьезду ЦКК разам з ЦК далі дырэктыву ўсім партыйным арганізацыям аб тым, каб зварачвалі больш увагі на перавыхаваньне ўсіх тых радавых членаў партыі рабочых, якія да моманту дыскусіі і у часе дыскусіі правялі тыя ці іншыя хістаньні.

Ці была гэта работа выстарчальна праведзена? Мне думаецца, што яна невыстарчальна была праведзена. Тут можна было-б значна больш і глыбей паставіць работу ў сэнсе праверкі і пераканаваньня радавых членаў партыі, якія хісталіся. Але так ці інакш некаторая работа ў гэтым кірунку праводзілася.

Ці была выстарчальнай работа з боку ЦК у сэнсе вызваленьня партыі ад трацкісцкай апазіцыі? Гэта работа была выстарчальнай, таму што мы, галоўным чынам, прымалі такія меры ў адносінах тых, хто праводзіў арганізацыйную работу вакол трацкістаў, а не ў адносінах да тых рабочых, якія крыху хісталіся. У адносінах хісткіх служачых партыйцаў прымаліся больш рашучыя меры для таго, каб пазбавіць іх ад годнасьці членаў партыі.

Як зараз стаіць работа? Мне думаецца, што пытаньне надзвычайна яснае. Трэба кіравацца тэй дырэктывай, якая дана ЦК УсеКП(б) у адносінах да прыцягненьня дзейнасьці трацкісцкай апазіцыі. Зараз трэба рашучым чынам гэту дырэктыву выконваць. Па пытаньні аб правай небясьпецы мы сустракаем такія заявы: „Вы пакажэце нам асоб, і мы будзем змагацца з правай небясьпекай, тады будзем ведаць, дзе хаваецца правая небясьпека".

Вось прыклад: у Воршы на гарадзкім актыве выступае сакратар адной з чыгуначных ячэек і кажа, што мы пытаньні абмяркоўвалі і ашуквалі, дзе якія ўхілы ў нас ёсьць, дзе есьць правая небясьпека, і відзе не знайшлі правай небясьпекі. Тут-жа выступае член бюро тэй самай ячэйкі і кажа, што гэта зусім няправільна, бо хіба ня правую небясьпеку зьяўляюцца выпадкі, калі кандуктары на чыгунках езьдзяць у другі раён, купляюць хлеб таньней, прыяжджаюць у Воршу і прадаюць яго даражэй. Вось гэта правая небясьпека.

Калі я сказаў, што гэта проста спэкуляцыя, ён ня мог зразумець—як гэта спэкуляцыя, а чаму ня правая небясьпека? (сьмех).

Зараз трэба завастрыць увагу на тым, каб уся наша партыйная маса вела прычыны і сутнасьць правай небясьпекі. Тады толькі можна будзе ўсюды правільна змагацца з ёю.

Аб прымірэнцтве. Мне думаецца, што трэба в асобнай рэзалюцыі падкрэсьліць наступнае: у нас часта партыец сьпіць рад бясьпечнасьцяў, вельмі пра іх, але ён ня лічыць патрэбным сказаць таму, каму трэба, каб зараз-жа выкрыць гэтыя бясьпечнасьці, адносіцца да іх прымірэнча. Мне думаецца, што трэба паставіць пытаньне так, каб кожны член партыі, які ўбачыць які-небудзь непарадак, паставіў у сябе в ячэйцы або у акруговай кантрольнай камісіі пытаньне аб гэтым. Толькі тады мы можам правільна змагацца з тымі ці іншымі адмоўнымі зьявамі як унутры партыі, так і ў галіне савецкага і гаспадарчага будаўніцтва.

Некалькі заўваг па пытаньні аб чыстцы канцылацкага складу. На савецкіх ячэйках вычышчана, прыкладна, каля 12 проц. канцылацкага складу. З чым мы тут сустракаліся? Паперша, сустрака іся з надзвычайна вялікай групай канцылатаў партыі, якія па 4-5 го зьяўляліся канцылатамі—перавод х у партыю ўсё адцягвалі. Ня было такой выразнай пастаноўкі, што калі ня прымаюць у партыю, дык трэба выключыць з кандыдацкага складу.

Падругое, мы ў часе праверкі ўстанаўлялі, што нашы партыйныя арганізацыі надзвычайна мала займаліся выхаваньнем кандыдатаў партыі. Як правіла, партыйныя ячэйкі не вялі ніякай работы для таго, каб сапраўды падрыхтаваць кандыдатаў, каб пры прыёме ў партыю яны былі большменш падрыхтаванымі.

Аб хваравітых зьявах, якія мелі месца ў партыі. Летась, калі прэзыдыум ЦКК даклад партыйнаму зьезду, за началася на тое, што мы прыцягнулі да партыйнай адказнасьці з агульна а складу членаў КП(б)Б рыкладна, 3,62 проц. У гэтым годзе мы прыцягнулі да партыйнай адказнасьці 5 20 проц., значна больш чым летась. Чаму гэта? Намойму мы ў гэты годзе выкрылі значна больш хваравітых зьяў дзякуючы таму, што гэтаму дапамог лёзунг самакрытыкі.

У мяне таварышы пытаюцца, ці досыць мы былі жорсткія? Мне асабіста думаецца, што ў гэтым годзе мы надзвычайна жорстка падыходзілі ў цэлым радзе выпадкаў. Якія прычыны хваравітых зьявішч? Агноўнымі прычынамі былі, клясавая барацьба, што абвастрылася, у паўнай ступені—таксама прыводзіць да таго, што дробна-буржуазнае асяродзішча пачынае больш актывізавацца, больш рашуча абараняць свае правы і адпаведным чынам уплывае на поўную групу членаў партыі. У нас ёсьць цэлы рад выпадкаў і прыкладам досыць частых выпадкаў, калі члены партыі так ці інакш зьвязваюцца з дробна-буржуазным асяродзішчам, адрываюцца ад рабочых мас.

Возьмем такі факт, як рэлігійныя абрады. Рэлігійныя абрады ў гэтым годзе значна павялічыліся ў параўнаньні з мінулым годам.

Калі я быў у Гомелі, мне далі дасканала выданую брашурку—я ня памятаю, якой рэлігійнай арганізацыі. Гэта гаворыць аб тым, што яны надзвычайна ўзмоцненым тэмпам вядуць работу. А хіба яны не стараюцца захапіць над свой уплыў больш адсталыя групы рабочых? Бязумоўна, стараюцца. Члены ж партыі не знаходзяцца ў ізаляваным станоўшчы. Найбольш адсталыя з іх таксама падпадаюць пад уплыў варожых нам сіл.

Праўда, ня зусім добра пастаўлена антырэлігійная прапаганда. Наогул, намойму, хваравітыя зьявішчы, што ёсьць у нас у партыі, у значнай меры залежыць ад таго, наколькі глыбока пастаўлена палітыка выхаваўчая работа сярод членаў партыі і сярод рабочых.

На пытаньне аб палітыка-выхаваўчай рабоце сярод членаў партыі і рабочых трэба больш зьвярнуць увагі.

Аб чыстцы партыі. Мне думаецца, што зараз гутаркі аб тым, што чыстка партыі непатрэбна, ня можа быць. Мне думаецца, што няма ўжо зараз таварышоў, членаў партыі, якія-б гаварылі, што непатрэбна чыстка партыі. Я ведаю, што ўсе акруговыя канфэрэнцыі ў нас, у Беларусі, выказаліся за чыстку партыі і пры тым неадкладную, рашучую чыстку партыі.

Мне думаецца, што тут трэба гаварыць аб тым, каб партыйныя арганізацыі падрыхтоўваліся да правядзеньня чысткі партыі, бо гэта надзвычайна вялікая і складаная задача. Чым лепш усе партыйныя арганізацыі будуць падрыхтаваны, тым лепш мы правядзем гэту работу.

А што трэба рабіць? Трэба зараз паставіць на ўсю шырыню перад усімі членамі партыі на агульных сходах пытаньне аб неабходнасьці чысткі партыі. Гэта—першае. Другое—трэба неадкладна, каб райённыя камітэты партыі прыступілі да складаньня характарыстыкі тых партыйных ячэек, якія ёсьць у даным раёне, каб да моманту чысткі мы ведалі, якія ёсьць ячэйкі. Калі будзе чыстка, мне цяжка сказаць.

Мне думаецца, што

Палягчэньне абкладаньня серадняцкага сялянства

НОВЫ ЗАКОН АБ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫМ ПАДАТКУ.

ПАСТАНОВА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ САЮЗУ ССР.

У разьвіцьці сельскае гаспадаркі за апошнія гады дасягнуты значныя посьпехі: пашырылася пасеўная плошча, асабліва пад тэхнічнымі культурамі, шырока распаўсюдзілася шматпольле, ураслa жывезагадоўля, павялічылася забясьпечанасьць сельскае гаспадаркі машынамі, значна прасунулася ўперад каапераваньне гаспадаркі і ў прыватнасьці ўзрос лік калгасаў і г. д. Аднак гэтых посьпехаў недастаткова для зад валеньня хутка ўрастаючай патрэбнасьці горада і вёскі ў прадуктах сельскае гаспадаркі. У асабліваści адстае у сваім росьце збожжавая гаспадарка.

Недастатковы рост збожжавых пасеваў пры вельмі нізкай ураджайнасьці выклікае перабой ў забясьпечаньні насельніцтва хлебам, а вывяз хлеба заграніцу зусім спыніўся.

Урад Саюзу ССР лічыць неабходным дабіцца ў самы кароткі тэрмін рашучага паскарэньня ўздыму сельскае гаспадаркі. Ужо ў бягучым годзе перад Саюзам Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік стаіць задача пашырыць пасеўную плошчу, прынамсі, на 6-7 млн. дзесяцін і павялічыць ураджайнасьць, прынамсі, на 3 проц.

Для таго, каб паскорыць разьвіцьцё сельскае гаспадаркі, у асабліваści праз веру адставае збожжавае гаспадаркі, урад ужо правёў рад мер: павышаны загатоўчыя цэны на хлеб; урадам вырашана не паніжаць іх і у наступным гаспадарчым годзе; асыгнавана на сельскую гаспадарку па дзяржаўным бюджэце на 1928-1929 г. каля 600 млн. руб. супроць 300 млн. руб. мінулага году; шырока разгорнута кантрактацыя пасеваў, павялічаны водпуск сродкаў па с.-г. крэдыце, вытворчасьць с.-г. машын значна пашыраецца ў бягучым годзе да разьмераў, якія ў тры разы перавышаюць даваенную вытворчасьць; значна павялічана забесьпячэньне с.-г. гаспадаркі гатовым насеньнем і мінэральнымі ўгнаеньнямі, усё пашыраецца дапамога калгасам, арганізуюцца новыя савгасы на неасвоеных сялянамі землях.

Аднак, дасягнуць рашучых посьпехаў у справе ўздыму сельскае гаспадаркі можна толькі пры актыўным удзеле і росьце зацікаўленасьці саміх бяднацкіх і серадняцкіх мас сялянства ў пашырэньні сваёй гаспадаркі.

У мэтах заахвочаньня памагатыўнай сялянства па ўкладзе сваёй гаспадаркі, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і СНК Саюзу ССР, побач з вызваленьнем ад падатку бедноты ў колькасьці 35 проц. агульнага ліку сялянскіх гаспадарак і на Саюзе Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік і захаваньнем усіх ільгот калектывам, прызнаюць неабходным значна палегчыць цяжар адзінага с.-г. падатку для асноўнай серадняцкай масы сялянства і пастанаўляюць:

1. Панізіць агульную суму адзінага с.-г. падатку на 1929-30 год да 375 млн. руб.

2. У раёнах, дзе абкладаньне адзіным с.-г. падаткам будзе праводзіцца па насеве, вызваліць ад абкладаньня ўвесь прырост пасеўных плошчаў за 1929-30 і 1930-31 гады ў параўнаньні з плошчамі, улічанымі пры абкладаньні адзіным с.-г. падаткам у 1928-29 годзе. Гэту ільготу прадаставіць усім адзінаасабовым гаспадаркам, акрамя яўна кулацкіх, а таксама ўсім калектыўным гаспадаркам.

Заўвага. Адзінаасабовыя і парадак вызначэньня яўна кулацкіх гаспадарак, на якія не распаўсюджваецца указаная ільгота, устанаўляюцца ўрадамі саюзных рэспублік і краявымі (абласнымі) выканаўчымі камітэтамі у адпаведнасьці з дырэктывамі ўраду Саюзу ССР.

3. У стэпавых акругах Украінскай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі і у тых акругах Цэнтральна-Чорназемнай вобласьці, дзе абкладаньне будзе рабіцца па пахаці, панізіць норму прыбытку ад зямлі дзесяціны пахаці супроць 1928-29 г. а) на стэпавых акругах Украінскай ССР—на 3 руб; б) на указаных акругах Цэнтральна-Чорназемнай вобласьці—на 2 руб.

4. Залежныя і цалінныя землі ў выпадку іх распашкі вызваліць ад абкладаньня адзіным с.-г. падаткам у працягу 2-х год, незалежна ад таго, ці робіцца абкладаньне па пахаці або па насеве.

5. Каб заахвоціць і яшчэ больш зацікавіць сялянства ў правядзеньні мер, якія павышаюць ураджайнасьць: а) устанавіць скідку ў разьмеры 10 проц. з вылічанага акладу падатку для кожнае гаспадаркі ў тых земельных таварыствах, якія ажыцьцяўляюць на справе прасьцейшыя мерапрыёмствы па павышэньні ўраджайнасьці, прадугледжаныя п становай ЦВК Саюзу ССР ад 15 красьнежня 1928 г. аб мерах па ўзьнаяцьці ўраджайнасьці; у тых сяленьнях, дзе гэтыя мерапрыёмствы будуць праведзены не земельным таварыствам цалкам, а паасобнымі гаспадаркамі,—прадаставіць такім гаспадаркам скідку ў разьмеры 5 проц. з акладу падатку; б) вызваліць поўнасьцю ад абкладаньня адзіным с.-г. падаткам прыбыткі ад закладзеных адзінаасабовымі і калектыўнымі гаспадаркамі вопытных вучасткаў з новымі культурамі або новымі ўдасканаленымі прыёмамі апрацоўкі ў разьмерах да паловы дзесяціны; в) у раёнах, дзе абкладаньне будзе праводзіцца па насеве, панізіць для гаспадарак, якія вядуць шматпольны севазварот, на 15 проц. устаноўленую для данай мясцовасьці норму прыбытковасьці дзесяцічы п севу; г) у засушных раёнах Расейскай Сацыялістычнай Федэрацыйнай Савецкай Рэспублікі і Украінскай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі абкладаць у працягу 3 гоў (1929-1930, 1930-1931 і 1931-32 акладных гадоў) плошчы, занятыя сеянымі травамі, па нормах прыбытковасьці сенажаці і, акрамя таго, плошчы, занятыя шматгадовымі сеянымі травамі, на першы год зусім вызваліць ад падатку.

6. Для заахвочваньня разьвіцьця малочнае гаспадаркі і тэхнічных культур:

а) панізіць у два разы нормы прыбытковасьці кароў для раёнаў прамысловага масларобства:

у гэтых-жа раёнах прамысловага масларобства абкладаць плошчы, занятыя сеянымі травамі, па нормах прыбытковасьці заліўнае сенажаці;

выдзяленьне раёнаў прамысловага масларобства ўскладзьці на саветы народных камісараў Расейскай Сацыялістычнай Федэрацыйнай Савецкай Рэспублікі, Украінскай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі і Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі;

б) захаваць усе ўстаноўленыя ільготы для тэхнічных культур, у прыватнасьці абкладаньне насеваў бавоўны, ільну і буракоў па нормах прыбытковасьці паніжаных удвая супроць збожжавых культур.

7. Панізіць у параўнаньні з 1928-29 годам абкладаньне прыбытку ад зямлі ў наёмных с.-г. машын з тым, каб у абкладаемы прыбытак гаспадаркі ўключаваўся: а) ад 25 да 50 проц. прыбытку ад складаных с.-г. машын з механічнымі рухавікамі; б) ад 10 да 25 в оц. прыбытку ад астатніх складаных с.-г. машын. Прыбыткі ад трыераў і сартовак не падлягаюць абкладаньню.

8. Для ўнясеньня ўстойлівасьці ў гаспадарчыя разьлікі сялянства не павышаць у працягу трох год (1929-1930, 1930-1931 і 1931-1932 гадоў) норм прыбытковасьці паляводзтва, лугаводзтва і жывёлагадоўлі, па якіх будзе вылічвацца падатак з кожнага плацельшчыка ў 1929-30 г. Захаваць на той жа тэрмін стаўкі падатку, устаноўленыя на 1928-29 год (арт. арт. 29, 30, 31 і 32 палажэньня аб адзіным с.-г. падатку ад 21-га красавіка 1928 году).

9. Для палягчэньня цяжару абкладаньня шматдзецяіх гаспадарак і ў мэтах памяншэньня драбінасьці гаспадарак: а) у мясцовасьцях, дзе падатак вылічваецца з агуленай сумы прыбытку на гаспадарку, прадаставіць скідку: гаспадаркам, якія маюць 7-8 едакоў,—у разьмеры 5 проц., гаспадаркам, якія маюць 9 і 10 едакоў,—у разьмеры 10 проц., а маючым 11 і больш едакоў—у разьмеры 15 проц. акладу падатку; б) процантныя надбаўкі да вылічанага па нормах прыбытку ад сельскае гаспадаркі ў залежнасьці ад агульнае прыбытковасьці двара (арт. 27 палажэньня аб адзіным с.-г. падатку ад 21 красавіка 1928 г.) адмяніць для ўсіх гаспадарак з прыбытковасьцю да 500 руб.

Прапанаваць урадам саюзных рэспублік дакладна ўстанавіць разьмеры гэтых надбавак па 27 артыкуле па раёнах у межах ад 5 да 10 проц., у залежнасьці ад абкладаемага прыбытку гаспадаркі, замест ужываемай у бягучым годзе надбаўкі ад 5 да 25 проц.

10. Бязумоўна забараніць абкладаньне серадняцкіх гаспадарак у індывідуальным парадку, но па нормах (арт. 28 палажэньня аб адзіным с.-г. падатку ад 21 красавіка 1928 г.).

Абкладаць на запраўдны прыбытковасьці ў індывідуальным парадку, а не па нормах найбольш багатыя кулацкія гаспадаркі ў колькасьці на больш 3 проц. агульнага ліку ў сялянскіх гаспадарак у сярэдзіне па Саюзе ССР.

11. Даручыць Савету Народных Камісараў Саюзу ССР распрацаваць на падставе сучаснае пастановы праект закона палажэньня аб адзіным с.-г. падатку і прадставіць яго на зацьверджаньне Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР у тыдневы тэрмін.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР
М. КАЛІНІН.

Старшыня Савету Народных Камісараў Саюзу ССР
А. І. РЫКАЎ.

Вык. абав. сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР
А. ТАЛАКОНЦАЎ.

Масква. Крэмль, 8 лютага 1929 г.

УЗМАЦНІМ ПАДРЫХТОЎКУ ДА СЯЎБЫ.

Мабілізаваць усю ўвагу сяўбе.

На калегіі Наркамзему б ла заслуханая інфармацыя т. Адамовіча аб ходзе падрыхтоўкі да весьняй сяўбы. Па гэтаму пытаньню калегія Наркамзему пастанавіла ўжыць цэлы шэраг мерапрыёмстваў.

Калегія адзначыла, што з боку полага шэрагу установ назіраюцца недапушчальныя адносіны да гаэтных заместак і наогул да распараджэньняў, якія датычацца весьняй сяўбы. Сакратарыяту Наркамзему даручана распрацаваць загад па НКЗ аб увачарговым і хуткім выкананьні як АКРЗА, так і ўсіх падпарадкаванымі НКЗ установамі ўсіх заданьняў па весьняй кампаніі, а таксама аб тэрміновым расьсьледаваньні ўсіх гаэтных дапісак як у цэнтры, так і на месцах. Гэткае-ж распараджэньне навінны выдаць Белсельтрэст, Белсельсаюз і Белкалгассаюз.

Калегія пастанавіла прасіць ЦКК РСІ выдаць загад усім наркаматам і установам, якія маюць дачыненьні да правядзеньня весьняй сяўбы, аб вытрымлівым і тэрміновым выкананьні пытаньняў, зьвязаных з весьняй сяўбой, а таксама аб тэрміновым разгляданьні на гаэтныя дапісі.

Апроч гэтага, пастаноўлена прасіць Наркамюст выдаць загад усім сьледчым і судовым органам аб тэрміновым расьсьледаваньні і разгляданьні ў судох усіх пытаньняў, якія датычацца несвоечасовага правядзеньня мерапрыёмстваў па весьняй сяўбе.

Для праверкі падрыхтоўкі да сяўбы на месцах ад Наркамзему камандыруюцца т. Масюкоў, Адамовіч, Клімаў, Тафеенка, Ялісеяў, Савіцкі, Хабенка і Воўкаў; ад Навукова-Дасьледчага Інстытуту вызначаюцца 4 спецыялісты. Белсельтрэсту і Белкалгассаюзу таксама прапанавана вылучыць і камандыраваць на месцы адпаведную колькасьць сваіх супрацоўнікаў.

Адначасова з гэтым пастаноўлена прасіць Сакратарыят ЦВК БССР мабілізаваць членаў �цВК сялян-вылучэнцаў, якія працуюць у іншых установах, для высылкі на месцы ў мэтах дапамогі па правядзеньню сяўбы. Пастаноўлена таксама прасіць ЦК КП(б)Б мабілізаваць адпаведную колькасьць адказных акруговых працаўнікоў для высылкі іх на месцы в тэй-жа мэтай.

Для перыядычнага выслухоўваньня ходу падрыхтоўкі да сяўбы Калегія Наркамзему пастанавіла прасіць ЦВК БССР даць загад аб гэтым усім АВК і РВК.

Вясна не за гарамі—патрэбен пералом у падрыхтоўцы да сяўбы.

У Койданаўскім і Самахвалавіцкім раёнах агранамічны вэрсавал прыцягваўся да перавыбараў саветаў і на мог прымаць належнага ўдзелу у разгортваньні зернаачышчаньня. У Вузьдзенскім раёне на ўсіх савецкіх гаспадарках няма ніводнай зернаачышчальнай машыны. А там, дзе машыны ёсьць, савгасы на прымаюць захадаў, каб прасунуць іх у вёску.

Менскі АВК выдаў загад аб абавязковым выбраньні попелу. Аднак, калі ездаўна было праверана акрэа, як праводзіцца выбраньне попелу савгасамі і калгасамі, дык выявілася, што яны амаль нічога не зрабілі ў галіне зьбіраньня гэтага каштоўнага ўгнаеньня. Асабліва дрэнна абстаіць справа са зьбіраньнем попелу ў г. Барысаве—у гэтым буйным прамысловым асяродку БССР. Ні гарсавет, ні земчастка Барысаўскага РВК не зьвярнулі на гэту кампанію належнай увагі і ніхто пальцам не краўў, каб распачаць зьбіраньне попелу.

Белсельтрэст да гэтага часу не зрабіў захаду, каб савгасы перадалі ўсе свае весьняя лішкі сельска-гаспадарчай каапэрацыі. Гэта сваё адносіна і да калгасаў. Ёсьць такія калгасы і савгасы (савгас «Прылукі», адна с. г. арцель Барысаўскага раёну), якія да гэтага часу на скончылі малаціць свае збожжа. На лініі спажывецкай каапэрацыі таксама трэба прыняць захады, каб апошняя перадавала сел. гасп. і крэдытнай каапэрацыі ўсе запасы фунтавога збожжа.

Мы стаім сёзета перад крызісам недахопу насеньня лубіну і канюшыны. Вызначаныя да завозу разьмеры гэтых культур не могуць задавольніць патрэбы запатрабаваньні. У сувязі з гэтым паўстае рашучая задача загатоўкі гэтых культур на мясцовым рынку. Пачынаючы в 14-га лютага, ва ўсіх раёнах будуць склікацца раённыя нарады па пытаньню загатовак насеньня, асабліва лубіну і канюшыны. У працы гэтых нарад будуць прымаць удзел прадстаўнікі АКРЗА, Акрселькрэдытсаюзу, загатчыкі савгасаў раёнаў, прадстаўнікі калгасаў, старшыні ўсіх сельска-гаспадарчых крэдытных таварыстваў і агранамічны персанал.

Апрачаса з гэтым АКРЗА навеціў правесьці праверку падрыхтоўкі да сяўбы на мясцох. Будзе праведзена праверка праны ўсіх крэдытных таварыстваў, наколькі апошнія справіліся з задачамі прапрацоўкі плянаў сяўбы, прыстасаваўшы іх да мясцовых умоў.

У кожным раёне будуць арганізаваны месячныя сельска-гаспадарчыя курсы для сялянскага актыву. Пры Воранецкім і Мар'іна-Горскім сельска-гаспадарчых тэхнікумах будуць арганізаваны сельска-гаспадарчыя курсы для камсамольскага актыву. Падаўна былі закончаны курсы для прапаршкоў малочнай каапэрацыі. Зараз жа ў Менску адчыніліся курсы—канферэнцыя для кіраўнікоў сельска-гаспадарчых гурткоў.

Апроч гэтага, праводзіцца праца па арганізацыі новых калгасаў і заканчэньне арганізацыі тых калгасаў, якія былі пачаты ў мінулыя гады.

Ачышчаем сялянскае насеньне.

(ВІЛЬШЧЫНА, Ш. С. М., МЕНШЧЫНА).

Ачыстку насеньня школа распачала з 15 студзеня. Да апошняга часу ачышчана 600 п. сялянскага насеньня.

Ахоплены працай на ачыстцы насеньня 20 вакольчых вёсак. На ўсіх вёсках праведзены сходы з мэтай агітацыі на ачыстку. Сялянства ўсюды на гэта згаджалася.

У пункты, далейшыя ад школы, вывозяцца машыны. Машыны: «трыер», «трыумф» і «зьмейка» выходзяць у поўнай нагрузцы.

Згодна пляну, на машынах школы патрэбна да весны ачысьціць 4500 пуд. насеньня.

Школа таксама абменьвае насеньне сялянства: аўсу 800 пуд. і ячменю 80 пуд.

Каст. Манарэвіч.

Зернаачышчэньне праходзіць слаба.

Барысаў, 11-2. Падрыхтоўка да сяўбы праходзіць чарадашным крокам на ўсім раёне. З с.-с. няма ніякіх вестак аб ходзе зернаачышчэньня.

Да гэтага часу ачышчана толькі 200 тон насеньня. Склікаецца нарада старшынь с. с. і старшынь крэдытных таварыстваў, на якой будзе пастаўлена на пытаньне аб ходзе насеўкампаніі і зернаачышчэньня.

15 лютага склікаецца нарада старшынь сяжыведкаў каапэрацыі, дзе будуць абгаварваць пытаньне аб удзеле каапэраціі ў насеўкампаніі. Наогул падрыхтоўка на месцох праходзіць нездавальняюча.

ЦК КП(б)Б.

Заслухаўшы адозву ЦК КП(б)Б да агранамічных работнікаў БССР, аб'ядначанае пасяджэньне Прэзыдыумаў Цэнтральных Бюро Сэкцый Спецыялістаў саюзу сельска-гаспадарчых і лясных рабочых ад імя 3.000 спецыялістаў сельскай і лясной гаспадаркі заўважае, што задачы, пастаўленыя пралетарыятам, яго камуністычнай партыяй і савецкай уладай у галіне рэканструкцыі сельскай гаспадаркі на сацыялістычных пачатках праз пабудаваньне новых і ўзмацненьне існуючых савгасаў, праз масавую калектывізацыю бяднацка-серадняцкіх сялянскіх гаспадарак, праз падвышэньне ўраджайнасьці на 45 в оц. і пашырэньне пасеўнай плошчы на 15 проц. за 5 гадоў, зьяўляюцца зусім рэальнымі і навукова-абгрунтаванымі.

Праз ажыцьцяўленьне гэтых задач будзе створана моцная база сыравіны, што забясьпечыць шварні тэмп разгортваньня сацыялістычнай індустрыі з тым, каб дагнаць і перагнаць тэхніку і эканоміку перадавых капіталістычных краін.

ЦБ сэкцый заклікаюць ЦК КП(б)Б у тым, што 3.000 спецыялістаў-агранамаў, дасьледчыкаў, кіраўнікоў савгасаў, культурытэхнікаў, мэліяратараў, землеўпарадкавацеляў, лесаводаў і лесаўпарадкавацеляў, арганізаваных у шэрагах саюзу сельска-гаспадарчых і лясных рабочых, усе свае сілы, энэргію, арганізатарскія здольнасьці, навуковы і тэхнічны вопыт накіруюць на тое, каб пад кіраўніцтвам КП(б)Б арыўдзеле с.-г. і лясных рабочых, правоўнага сялянства і ўсёй савецкай грамадзянасьці выканаць пастаўленыя партыяй і савецкай уладай задачы.

Нахай жыве партыя пралетарыяту—партыя бальшавікоў-камуністаў.

ЦБ АГРАСЭКЦЫІ. ЦБ ЗЕМСЭКЦЫІ. ЦБ ЛЕСАВОДАЎ.

Эпідэмія сініх васількоў.

Сіняе неба. Сіняя водлакі. Сіняя далячынь. Сіняя росы. Сіняя, любая, замілая нам васількі.

Якая прыгожасьць, якая ідылія! Васількі, васількі, ва ільні... І к охкая маленькая Стася Антанінаўна, дачка гандляра II разраду Лясоўскага, паедзе летам на дачу ў бліжэйшае вёску, будзе расхад ваць па межах, будзе любавацца хвалямі жыта, будзе рваць сінія васількі. А потым запляце зачараваныя вянкі...

Прыдзе ноч, пёная, душная, купальская. Васковыя дзяўчаты пойдуць гай паліць. І Стася Антанінаўна, разам з сваёй таварышкай Ганнай, аргументаванымі, каб нихто на прыкмеціў, каб на ўбачыла злое пока, угрунь пабягуць да Прові. Пастаяць хвілінудругую, агледзяцца, а потым з замілаючым сэрцам кінуць на рэчку вянкі.

— Ці ўсплыве вянок з сініх васількоў?

— Ці выйду замуж сёлета?

* * *

У такт Стасі Антанінаўны «паэты» усялякіх «груп» і «груповак» апяваюць васількі:

Васількі мае,
Сіня-сініх,—
Струны сэрца трывожыце вы...

Васількі калытаюць нервы, даюць натхненьне Сініх, сініх, сініх. Прачытаўшы верш—у вачох пасівее; людзі пакажуцца такімі добрымі, ласкавымі, шчырымі; васковыя хаты—заламаныя, шырэй—паўстануць завіцеными ў вянкі в сіня-сініх васількоў.

Ідылі, мяккасьць, прыгожасьць. Эпідэмія апапэтызаваных васількоў захапіла на тол кі мяшчанскіх далікатэс, ва толькі пачынаючых «паэтаў», але і людзей практыкі, абызвешчыны - гаспадарнікаў, адміністратараў, сельрайвіканкомаўцаў...

Перад намі груда селькораўскіх дапісак. Кожная в іх—пазграбная, грубая, „чужынская" апавядае аб пагражаючай эпідэміі сініх васількоў. Эпідэмія пайшла на эвіяу, як гэта бывае звычайна, а з самага верху, з потым пасьлядоўна дайшла да нізоў. Цэнтру—акруга—раён—сельсавет—вёска, вось яе маршрут. Васількі ў газэце, васількі ў часопісі, васількі ў песьні, васількі ў тэатры.

А людзі правінцыі заўсёды знаходзяцца пад уплывам «цэнтравікоў». Ідылія ва і ськоў адбіваецца на практыцы, на хвалюючым сёньня. У Менску і Магілеве, у Полацку і Віцебску, у Мазыры і ў Гомелі, па ўсёй Беларусі эпідэмія сініх васількоў прыняла пагражаючыя разьмеры.

Праўда, аб гэтай эпідэміі чыноўнікі на хочуць ведаць. Яны спакойна кажуць, што падрыхтоўка да весьняй пасяўной кампаніі ідзе пасьпяхова.—«Рыхтуемся, даём дырэктывы, папярэджваем».

А што вы, савецкія чыноўнікі, адкажуць на гэта, што зернаачышчальныя абовы не працуюць, што попел ма зьбіраецца, што аграном пехатой на 30 градусным марозе ідзе ў вёску агітаваць за шматпольле, што закон уладу аб павышэньні ўраджайнасьці не папулярызаваны і што вы ўсе разам гуляеце ў пасяўную кампанію?

* * *

Васількі прыгожыя, сіня-сінія павінны алмысьці ў спадчыну, у навуковыя лабараторыі Акадэміі Навук. Людзі практыкі, людзі хвалюючага сёньня павінны абвясьціць бязьлітасную вайну васількам.

Ідылі трэба пакласьці канец. Усе падставы для гэтага ёсьць: сялянне не мяшчанскія далікатэсы, не пачынаючыя «паэты», якія вараць «аб зорах, аб сініх васількох і сіняй далячыні».

Селяніна вядзе барацьбу і з васількамі, і з касьцёрам і з «шаўкавістымі» мохам.

Але барацьба гэта прымітыўная, серадняковая, саматужная, а таму яна і ня мае належных посьпехаў.

Наша задача—дапамагчы селяніну; неабходна растлумачыць яму новыя мэтады барацьбы. Яму неабходна даць у рукі сродкі, пры дапамозе якіх можна ў бліжэйшы часы зьнішчыць ідылію васількоў.

Наш лёзунг, наш дэвіз—сартыроўку на сані, васількі на попел!

Цім. Зарэчны.

Ці падрыхтаваны мы да сяўбы?

Трэба ўзмацніць выраб асыпнікаў і запасных частак.

У гутарцы з нашым супрацоўнікам старшыня Белсельсаюзу т. Дубіна паведаміў:

Плян забесьпячэньня сродкамі с-г. вытворчасьці ў надыходзячую сяўбу з боку Белсельсаюзу па розных с-г. машынах і прыладах выкананы ў наступных разьмерах: плугоў 100 проц., барон 88 проц., кульціватараў 118 пр., асыпнікаў 44 пр., куп'ярэзаў 127 пр., селлак—101 пр., сартыровак—109 пр., трыераў 113 пр., малочнага інвэнтару—50 проц. і розных запасных частак 50 проц.

Такім чынам, як відаць з вышэйпададзеных лічбаў, мы забясьпечаны рознымі с-г. машынамі на ўсе 100 пр. Толькі дрэнна абстаіць справа з асыпнікамі і запаснымі часткамі да плугоў і трактараў. Для нашых умоў надыходзяць асыпнікі тыпу Ястржэмскага, якія да гэтага часу выпускалі с-г. майстэрні імя Бурбіса, але зараз, калі гэтыя майстэрні ўвайшлі ў склад Белмаштрэсту, апошні адмаўляецца ад вырабу асыпнікаў з прычыны недахопу сталых падзяй частак неабходных матар'ялаў. Зараз мы маем 2000 асыпнікаў, а да весны патрабуецца яшчэ 600 асыпнікаў. Што-ж датычыцца запасных частак да плугоў і трактараў, дык мы будзем мець іх на 10.000 р., але гэта, аднак ня можа задаволіць нашы патрэбы.

Невыкананьне пляну па машынах і інвэнтару тлумачыцца наступнымі прычынамі: скарачэньне імпартнага пляну больш як на палову і затрымка з выдачай ліцэнзій на вызначаныя кантынгенты машын і прыладаў. У сувязі з гэтым могуць не пасьпець да сезону сэпаратары і інш. малочны інвэнтар.

У Маскве таксама пакуль-што адзяляюць нам мала камэрацій, пергаментаў і інш. патрэбных у малочнай прамысловасьці матар'ялы, ня гедзячы на свае часовую валюту. Апроч гэтага, Белмаштрэст ня досыць добра разгарнуў працу па вырабу малочных пляшак і бідонаў.

Што-ж датычыцца запасных частак да плугоў і трактараў, дык выпуск першых залежыць ад Белмаштрэсту, а другіх ад «Сельхозснабжения» у Маскве. Белмаштрэст атрымаўлецца ад заказаў на нарэзку аэлаваў і лемехаў да плугоў, а «Сельхозснабжение» ад заключанага в Цэнтраземскладам у свой час дагавору на дастаўку запасных частак да трактараў на 10.000 руб.

Трэба тут адзначыць, што «Сельхозснабжение» да гэтага часу не аформіў дагаворы, заключаныя імі з Цэнтраземскладам на забесьпячэньне БССР машынамі, мэталётаварамі, дробным інвэнтаром і запаснымі часткамі. Такое становішча ставіць нас пагрозу выкананьне гэтага дагавору з боку «Сельхозснабжения».

Пагроза недахопу насеньня лубіну і канюшыны.

Зараз трэба спыніцца на тым, як праходзіць забесьпячэньне насеньнем. На сёньнішні дзень мы забясьпечаны канюшынай на 26 проц., цімафейкай—64 проц., сераделяй—33 проц., вікай—46 проц., лубінам—2 проц., аўсу—48 проц., ячменю—61 проц., лёну-пераробу даўганю—103 проц., насеньнем кораньплодаў—74 проц., гародніны і лугавым насеньнем—82 проц. Апрача вызначаных запасаў, загатоўкамі на мясцовым рынку мы маркуем дадасьці да 1-га красавіка: аўсу да 61 проц., ячменю—100 проц., цімафейкі—82 проц., сераделі—100 проц., вікі—93 проц., лубіну—40-50 проц.

Найгорш абстаіць справа з насеньнем лубіну і канюшыны. Пытаньне аб выдзяленьні для БССР з саюзных запасаў 12.000 пуд. канюшыны разглядалася ў США, далей справа гэта была перададзена тав. Рудзутаку, а апошні даручыў разглядзець яе вы спэцыяльнай камісіі пад старшынствам тав. Вайцэра, але пакуль што яна яшчэ да апошняга часу на выраша на. У такім-жа становішчы знаходзіцца пытаньне аб выдзяленьні для БССР 9.000 тон насеньня аўсу, малочнага інвэнтару, згодна падзенай нашы спэцыфікацыі. Што-ж датычыцца насеньня лубіну, дык няма ніякай надзеі на завоз яго з па-за межаў БССР.

БССР павінна быць забясьпечана мінэральным угнаеньнем.

Суперфасфатам мы забясьпечаны на 63 проц., калійнай солі—50 проц., сульфат-амоніі—60 проц., фосфарнай мукі—137 проц., тамасшлаку і касьцяной мукі зусім няма. У сувязі з недахопам суперфасфату і калійнай солі і немагчымасьці атрымаць тамасшлаку і касьцяной мукі (першых груп—з прычыны адсутнасьці імпартнага кантынгенту, а другіх—недахопу вытворчасьці у Саюзе). Белсельсаюз узьняў хадайніцтва перад Наркамзнадзем СССР аб выдзяленьні для БССР патрэбнай колькасьці суперфасфату, але гэта пытаньне пакуль-што ня вырашана. Зараз-жа адгружаецца ўжо 140 вагонаў імпартнага суперфасфату за разрахунак гатоўкай.

А. БАЛІЦКІ

КАГО МЫ ВУЧЫМ У НАШЫХ ШКОЛАХ.

Культурная рэвалюцыя патрабуе ўмацненьня клясавай барацьбы культурным фронце. З пашырэньнем сацыялістычнага сэктару нашай гаспадаркі і культуры,—актывізуюцца і пераходзяць у наступ капіталістычныя элементы. Яны наступаюць на школу, спрабуюць праводзіць сваю ідэалёгію ў літаратуру, мастацтва і навуку. Самая рашучая барацьба з капіталістычнымі элементамі патрэбна і на культурным фронце. Неабходна рашучае змаганьне з правымі ўхіламі паасобных культасьветных працаўнікоў, паасобных пісьменьнікаў і паасобных навуковых працаўнікоў.

Ва ўсёй школьнай працы мы павінны паставіць перад сабой пытаньні: каго мы вучым, чаму вучым, як вучым і хто вучыць? Гэтыя пытаньні павінны быць пастаўлены з пункту погляду праверкі правільнасьці нашай клясавай лініі, з пункту погляду барацьбы з капіталістычнымі элементамі. Каго мы вучым—гэта пытаньне зьяўляецца актуальным нават і для нашай масавай чатырохгадовай школы.

Чаму-ж гэта так?

Справа ў тым, што ўсеагульнага абавязковага навучаньня мы яшчэ не ўвялі, а гэта азначае, што каго-ж мы ня прымаем яшчэ нават і ў пачатковую школу. Каго ня прымаем—бедняка ці кулака?

У гэтым сутнасьць пытаньня. Яшчэ вастрэй стаіць пытаньне, калі мы падыходзім да другога канцэнтру семігодкі, да прафшколы. Ко сетка гэтых навучальных установ невялікая, і за іх ідзе змаганьне паміж асобнымі сацыяльнымі пластамі насельніцтва, бо гэтыя навучальныя установы зьяўляюцца подступам да тэхнікуму, да ВУЗ'у. І асабліва рашуча трэба паставіць пытаньне ў тых навучальных установах, якія рыхтуюць спэцыялістаў сярэдняй і вышэйшай кваліфікацыі па розных галінах гаспадаркі, культуры і савецкага будаўніцтва.

У адказе—«каго мы вучым», мы павінны пытаньне паставіць так, каб усе нашы культасьветныя установы вялі да верху ў першую чаргу абслугоўвалі рабочых, батракоў, бяднейшае і серадняцкае сялянства.

Калі ў нашых нават масавых школах не хапае месц, дык нахай гэты недахоп прыпадае на непрацоўныя і эксплеататарскія колы насельніцтва. Праўда, наша масавая школа павінна ахапіць усё дзіцячае насельніцтва, але гэтак справа будзе стаяць тады, калі ў нас будзе ўведзена ўсеагульнае абавязковае навучаньне. А пакуль гэтага няма, пакуль месц для ўсіх не хапае, пытаньне стаіць, каго павінна ахапіць наша школа ў першую чаргу.

Зараз, калі клясавая барацьба яшчэ ня скончылася, калі ў сацыялістычнае будаўніцтва павінны быць уцягнуты ўсе рабочыя, усе бяднацкія і серадняцкія масы сялянства, мы павінны рашуча паставіць пытаньне, каб нашымі культасьветнымі установамі ў першую чаргу абслугоўвалися самыя шырокія колы рабочых, батракоў, бяднацкія і серадняцкія колы насельніцтва. Ад таго, як хутка вацца рабочыя і беднота ў школу, што паставіць зрабіць, каб уцягнуць іх, што праблему у гэтым напрамку інспэктар нарасьветы можна судзіць аб правільнасьці і выразнасьці клясавай лініі гэтага працаўніка.

Тыя лічбы, якія ў нас ёсьць, кажуць нам, што справа з тым, каго мы вучым стаіць на зусім добра. Так, у Круглянскім раёне, Аршанскай акрузі, вар ча ца дзяцей беднаты, якая вызвалена ад с.-г. падатку, толькі 18,5 проц. агульнага ліку вучняў. Між тым на гэтаму раёну ад падатку вызвалена 34 проц. сялянскіх гаспадарак. Адгэтуль відаць, што ўзьвышная вага беднаты ў школах значна меншая, чым удзельная вага яе сярод усяго насельніцтва раёну; такім чынам, можна зрабіць вывад, што ў Круглянскім раёне беднота слаба ўцягнута у школы.

Па выбарчаму абсьледваньню, якое зроблена ў пачатку 1928-29 навуч. году па 16 чатырохгадовых і 5 семігадовых школах Менскай і Аршанскай акруг, процант беднаты, уцягнутай у школы, большы (31,1). Але і гэты процант нас задаволіць ня можа, бо мы павінны паставіць пытаньне аб уцягненьні ў школы ўсёй беднаты, усіх дзяцей рабочых і калгасьнікаў, а таксама і таму, што на тых-жа вестках на дзяцей батракоў і беднаты прыпадае вялікі процант адсеву са школы да канца навучальнага году. У гэтых школах у 1927-28 г. амаль палова дзяцей батракоў і больш чэрці дзяцей беднаты на працягу навучальнага году адсеялася, між тым, як сярод іншых сярэднякоў процант адсеву зусім нязначны, а дзеці заможнага сялянства, служачых, саматужнікаў і іншых зусім не адсейваюцца.

Больш дакладныя зьвесткі мы маем па другому канцэнтру школ семігодак. 1928-29 год зьяўляецца першым годам, калі ў сельскія школы-семігодкі рабіўся асобны прыём у другія канцэнтры на падставе сацыяльнага адбору паступаючых з ліку дзяцей скончыўшых чатырохгодкі і першы канцэнтр семігодак. Гэта мерапрыёмства дало магчымасьць палепшыць сацыяльны склад вучняў другога канцэнтру.

Паводле не так, па сяміх акругах (з Гомельшчыны вестак няма) сацыяльны склад дзяцей пятых груп школ-семігодак на 1 кастрычніка 1928 г. выявіўся ў процантных адносінах да агульнага ліку дзяцей у наступных лічбах:

1)	дзяцей рабочых, у тым ліку і с-гасп.	11,52 проц.
2)	дзяцей батракоў	1,19 »
3)	дзяцей сялян, якія ня плацяць падатку	12,25 »
4)	дзяцей сялян, якія плацяць падатак ад 1 р. да 50 руб.	36,43 »
5)	дзяцей сялян, якія плацяць падатак ад 50 да 170 р.	6,53 »
6)	дзяцей служачых і вайсковых	11,01 »
7)	дзяцей з дзіцячых дамоў	5,88 »
8)	дзяцей гарадзкой і мястачковай беднаты	5 08 »
9)	дзяцей саматужнікаў	7,86 »

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР.

Пастанова
Савету Народных Камісараў БССР

пра парадак скарыстаньня сродкаў ад рэалізацыі 2-ое пазыкі індустрыялізацыі народнае гаспадаркі.

На падставе інструкцыі Савету Працы і Абароны пра парадак разьмеркаваньня і скарыстаньня дзесяціпроцантнага адчаньня на мясцовыя патрэбы ад сум, рэалізаваных ад 2-ое дзяржаўнае ўнутранае пазыкі індустрыялізацыі народнае гаспадаркі СССР ад 28 верасьня 1928 году (З. З. СССР 1928 г., № 62 арт 575), Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Скарыстоўваць сумы адлічэньняў ад 2-е пазыкі індустрыялізацыі народнае гаспадаркі, рэалізаванай сярод сельскага насельніцтва: а) на капітальныя ўкладаньні ў сельскую гаспадарку, б) на сельскае больничное і школьнае будаўніцтва і в) на дарожнае будаўніцтва.

2. Скарыстоўваць сумы адлічэньняў ад 2-ое пазыкі індустрыялізацыі народнае гаспадаркі, рэалізаванай сярод гарадзкога і мястэчкавага насельніцтва на фінансаваньне а) камунальнага будаўніцтва ў гарадох і мястэчках і б) мясцовае прамысловасьці.

3. Сумы адлічэньняў ад 2-е пазыкі індустрыялізацыі народнае гаспадаркі, рэалізаванай сярод вайскоўцаў і чыгуначнікаў, перадаюцца поўнасьцю тым округам, на тэрыторыі якіх праводзілася падпіска сярод паказаных катэгорый, і скарыстоўваюцца на паводле гэтае пастановы.

4. Мерапрыемствы, якія маркуецца паводле гэтае пастановы ажыцьцявіць, павінны абгаварвацца на шматрокіх сходах, пленумах райённых і акруговых выканаўчых камітэтаў.

5. Мерапрыемствы, праведзеныя на сродкі ад адлічэньняў 2-ое пазыкі індустрыялізацыі народнае гаспадаркі, павінны насіць на сабе адзнаку, што яны іменна праведзены на сродкі ад рэалізацыі 2-ое пазыкі індустрыялізацыі народнае гаспадаркі.

6. Парадак правядзеньня адлічэньняў ад 2-ое пазыкі індустрыялізацыі народнае гаспадаркі і парадак выдаткаваньня іх устанаўліваецца Народным Камісарыятам Фінансаў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Нам. Кіраўніка Справаў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР А. Дубавіцкі.

4 лютага 1929 году,
г. Менск.

Постановление
Совета Народных Комиссаров БССР

о порядке использования средств от реализации 2-го займа индустриализации народного хозяйства.

На основании инструкции Совета Труда и Обороны «О порядке распределения и использования десятипроцентного отчисления на местные нужды от сумм, реализованных по 2 му государственному займу индустриализации народного хозяйства СССР от 28 сентября 1928 г. (З. З. СССР 1928 г., № 62, ст 575), Совет Народных Комиссаров БССР постановляет:

1. Использовать суммы отчислений от 2-го займа индустриализации народного хозяйства, реализованного среди сельского населения: а) на капитальные вложения в сельское хозяйство, б) на сельское больничное и школьное строительство и в) на дорожное строительство.

2. Использовать суммы отчислений от 2-го займа индустриализации народного хозяйства, реализованного среди городского и местечкового населения на финансирование: а) коммунального строительства в городах и местечках и б) местной промышленности.

3. Суммы отчислений от 2-го займа индустриализации народного хозяйства, реализованного среди военных частей и железнодорожников, передаются полностью тем округам, на территории которых проживались подписка, среди указанных категорий, и используются на основании этого постановления.

4. Мероприятия, подлежащие осуществлению на основании этого постановления, должны обсуждаться на широких собраниях, пленумах окружных и районных исполнительных комитетов.

5. Мероприятия, проведенные на средства от отчислений 2 го займа индустриализации народного хозяйства, должны иметь отметку о том, что они именно проведены на средства от реализации 2-го займа индустриализации народного хозяйства.

6. Порядок проведения отчислений от 2-го займа индустриализации народного хозяйства и порядок расходования этих отчислений устанавливается Народным Комиссаром Финансов.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.

Зам. Управляющего Делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР А. Дубовицкий.

4 февраля 1929 года.
г. Минск.

Пастанова
Савету Народных Камісараў БССР

пра спэцыяльныя сродкі навуковых устаноў і спэцыяльныя сродкі для аховы помнікаў мастацтва і старажытнасьці.

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Дазволіць Народнаму Камісарыяту Асьветы па адзелах Галоўнавукі і Галоўмастацтва і падпарадкаваных ім навукова-даследчых і навукова-мастацкіх устаноў мець спэцыяльныя сродкі.

2. Спэцыяльныя сродкі гэтых устаноў складаюцца ад:

а) уваходнай платы, платы за наведваньне арганізуемых гэтымі ўстановамі лекцый, канцэртаў, выставак і відовішч, за карыстаньне кнігамі, дапамогамі і калекцыямі, продажу выданьняў і права на выданьні;

б) продажу кніжных дублікатаў з бібліятак і іншае непатрэбнае і нягоднае маемасьці, а таксама ад рэалізацыі нягоднае і непатрэбнае музэйнае маемасьці;

в) з лябараторый, майстэрняў, габінэтаў вытворчых прадпрыемстваў, арганізаваных гэтымі ўстановамі;

г) ад эксплятацыі будынкаў, земельных участкаў і іншае маемасьці, а таксама ад выкананьня розных даручэньняў, якія не вынікаюць з прамых функцый устаноў;

д) от ахвяраваньняў, дарчэньняў, якія ад рэалізацыі фондаў немузэйнага значэньня.

3. Даць права Народнаму Камісарыяту Асьветы па ўгадненьні з Народным Камісарыятам Фінансаў цэнтралізаваць у Галоўнавуцы ўсе сумы 60 проц. адлічэньняў ад рэалізацыі фондаў немузэйнага значэньня.

4. Атрыманьне, хаваньне і выдаткаваньне спэцыяльных сродкаў і справаздачасьць па іх робіцца паводле пастановы СНК ад 4 жніўня 1927 году «Аб спэцыяльных сродках устаноў, якія знаходзяцца на дзяржаўным бюджэце» (З. З. БССР 1927 г., № 33, арт. 169)

5. Рэалізацыя маемасьці немузэйнага значэньня, а таксама нягоднае і непатрэбнае музэйнае маемасьці ў кожным асобным выпадку праводзіцца асобнай камісіяй у складзе прадстаўнікоў: Народнага Камісарыяту Асьветы, Народнага Камісарыяту Фінансаў і Народнага Камісарыяту Рабоча-Сялянскае Інспэкцыі.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Нам. Кіраўніка Справаў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР А. Дубавіцкі.

4 лютага 1929 году,
г. Менск.

Постановление
Совета Народных Комиссаров БССР

о специальных средствах научных учреждений и специальных средствах для охраны памятников искусства и старины.

Совет Народных Комиссаров БССР постановляет:

1. Разрешить Народному Комиссариату Просвещения по отделам Главнауки и Главискусства и подчиненным им научно-исследовательских и научно-художественных учреждений иметь специальные средства.

2. Специальные средства этих учреждений составляются:

а) с пос уплаченной платы за посещение организуемых этими учреждениями лекций, концертов выставок и зрелищ, за пользование книгами, пособиями и коллекциями, продажи изданий и права на издания;

б) от продажи книжных дубликатов из библиотек и прочего ненужного и негодного имущества, а также от реализации негодного и ненужного музейного имущества;

в) от лабораторий, мастерских, кабинетов, производственных предприятий, организованных этими учреждениями;

г) от эксплоатации строений, земельных участков и прочего имущества, а также от исполнения различных поручений, не вытекающих из прямых функций учреждений;

д) от отчислений 60 проц. от сумм, вырученных от реализации государственных фондов немузейного значения;

е) от помощи государственных учреждений и общественных организаций и от ахвяраваньняў ліц и прочих случайных доходов.

3. Предоставить право Народному Комиссариату Просвещения по согласованию с Народным Комиссариатом Финансов централизовать в Главнауке все суммы 60процентных отчислений от реализации фондов немузейного значения.

4. Получение, хранение и расходование специальных средств и ведение отчетности по ним производится на основании постановления ЦИК и СНК БССР от 4 августа 1927 года «О специальных средствах учреждений, находящихся на государственном бюджете» (С. З. БССР 1927 год. № 33, ст. 169).

5. Реализация имущества немузейного значения, а также негодного и ненужного музейного имущества в каждом отдельном случае производится специальной комиссией в составе представителей: народных комиссариатов Просвещения, Финансов и Рабоче-Крестьянской Инспекции.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.

Зам. Управляющего Делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР А. Дубовицкий.

4 февраля 1929 г.
г. Минск.

Больш увагі двухтыднёвіку ашчаднасьці.

Да ўсіх арганізацый і членаў саюзу сувязі.

Урад і партыя, надаючы асабліва важнае значэньне прыцягненьню зьберажэньняў насельніцтва праз ашчадныя касы на патрэбы індустрыялізацыі нашай краіны і разьвіцьцё народнае гаспадаркі, паставілі задачай перад касамі ашчаднасьці прыцягненьне ў БССР новых укладаў у суму 4 міл. рублёў.

Праца на акумуляцыі народных зьберажэньняў, а асабліва зьберажэньняў сялянскага насельніцтва ў касах дзяржаўнага крэдыту ў нас да апошняга часу вельмі слабая.

Ажыцьцяўленьне задач па максымальнаму ўцягненьню сялянства ў касы ашчаднасьці накладвае вялікую адказнасьць на апарат п-т. ведамства і на прафсаюз сувязі, паколькі асноўнаю сферай кас ашчаднасьці на вёсцы зьяўляюцца касы пры прадпрыемствах п-т. ведамства.

У далейшым ня можа быць пярпіма такая слабая дзейнасьць гэтай часткі кас, і сакавыя арганізацыі—саюз сувязі—павінны аказаць свой уплыў на ўзмацненьне гэтай працы.

Для стварэньня спрыяючых умоў для выкананьня кантрольных заданьняў па ўкладах і ўкладчыках урад БССР пастанавіў у перыяд часу між 15 лютага і 15 сакавіка правесьці шырокую кампанію па ўзмацненьню ашчадных справы—«двухтыднёвік ашчаднасьці»—і паставіў задачу да першага красавіка бяг. году выканаць 75 проц. гадавога заданьня.

Зусім відавочна, што для пасьпяховага правядзеньня гэтай кампаніі патрабуецца належная падрыхтоўка з мабілізацыяй увагі ўсёй савецкай грамадзкасьці да гэтай важнейшай кампаніі, пры гэтым у першую чаргу, зразумела, павінна падрыхтавацца і сама ашчадная апарат у асобе прадпрыемстваў сувязі.

Між тым выяўлена, што ў некаторых акругах і раёнах падрыхтоўка да гэтай важнейшай кампаніі з боку апарату п-т. ведамства праходзіць вельмі слабо, а ў некаторых месцах зусім недбайна.

Прэзыдыум Цэнтральнага Праўленьня саюзу сувязі зварочвае увагу саюзных арганізацый і членаў саюзу на необходнасьць максымальнай актыўнасьці ў правядзеньні гэтай кампаніі і заклікае саюзную масу ўзяць пад свой строгі кантроль ход падрыхтоўкі да кампаніі і яе правядзеньне.

Акрэдаміраваньні саюзу, рабкомы, прафупаўнаважныя, вытворчыя камісіі і парады павінны:

1) неадкладна заслухаць даклады адміністрацыі прадпрыемстваў о ходзе ў акругах і раёнах аб тым, што імі прароблена да падрыхтоўкі к «двухтыднёвіку ашчаднасьці»

2) абмеркаваць на пасяджэньнях праўленьня і рабочкомаў парадак удзелу саюзных арганізацый у гэтай кампаніі, прычым у прыватнасьці, у плян правядзеньня гэтай кампаніі па лініі саюзу павінна быць уключана:

а) забесьпячэньне актыўнага ўдзелу ў працы асабліва сельскіх дістанцыяў;

б) выезды на раёны членаў праўленьня акрэдаміраваньняў для праверкі дзейнасьці прадпрыемстваў сувязі па правядзеньню кампаніі і ўцягненьне ўсіх членаў саюзу ў гэтую працу, прыстасоўваючы да гэтых выездаў абследаваньні мізавых саюзных органаў па лініі саюзу;

в) абмеркаваньне вытворчымі камісіямі і парадамі ступені дапасу пасьці гадзін заняткаў кас ашчаднасьці ў райёнах для абслугоўваньня сялянства з мэтаю выяўленьня, наколькі ўстаноўленыя часы занятку здавальняюць сялянскае насельніцтва;

г) ход падрыхтоўкі і правядзеньня самой кампаніі павінны быць асьветлены на агульных сходах членаў саюзу, у насьцегазетах, у акруговым цэнтральным друку і часопісі «Пролетарий Связи».

Саюзная маса павінна прылажыць усе натугі да таго, каб кампанія была праведзена з максымальным посьпехам і каб устаноўленыя ўрадам кантрольныя лічбы па ўкладах і ўкладчыках у разьмеры 75 пр. гадавога плану былі да 1-га красавіка выкананы.

Прэзыдыум цэнтральнага праўленьня саюзу упэўнен, што саюзныя арганізацыі і кожны член саюзу зразумеюць важнасьць гэтай кампаніі і прымуць усе залежачыя ад іх меры да ажыцьцяўленьня задач, пастаўленых урадам, як саюз, што найбліжэй стаіць да працы ашчадных кас, зможа аказаць свой уплыў на прадпрыемства сувязі і прымусіць іх неаслабна прыступіць да выкананьня гэтых вялікіх задач.

Ніводнага члена саюзу, які актыўна на ўдзельнічаў бы ў правядзеньні двухтыднёвіка ашчаднасьці.

Кампанію двухтыднёвіка ашчаднасьці пад кантроль шырокай саюзнай масы

Прэзыдыум Цэнтральнага праўленьня саюзу сувязі.

ПРА САМААБКЛАДАНЬНЕ ЗАБЫЛІ.

(Гутарка з начальнікам падатковага кіраўніцтва НКФ БССР Кардашэнкам).

Справа самаабкладаньня пакуль-што стаіць вельмі дрэнна. Прыкладная сума самаабкладаньня, якая павінна быць сабрана па БССР, складае прыблізна 1500000 руб. Прычым, дырэктывы, дадзеныя па правядзеньню гэтай кампаніі—поўная дабраахвотнасьць пры прыёме самаабкладаньня, якіх больш ускладняюць правядзеньне кампаніі.

Самымі адказнымі моментамі ў правядзеньні кампаніі самаабкладаньня зьяўляюцца: добра падрыхтаваць пытаньне, на што ў данай вёсцы або сельсавеце трэба правесьці самаабкладаньне. Напрыклад, рамонт школы, набудова лазьні, шляхавае будаўніцтва і г. д. Усе гэтыя мерапрыемствы і іх матэрыяльнасьць неабходна папярэдне абмеркаваць па групах і сходах беднаты, а пасьля ўжо праводзіць сходы насельніцтва па прыняцьню самаабкладаньня. І, урэшце, ня менш важная праца—сабраць сродкі па самаабкладаньню.

Поўных даных з акруг аб ходзе кампаніі па самаабкладаньні мы, на жаль, яшчэ ня маем, але і тыя, якія ёсьць у Наркамфіне, дастатковы для агульнай характарыстыкі прахаджэньня кампаніі па самаабкладаньню. Гэтыя даныя гаворяць аб тым, што на ўсіх акругах, за выключэньнем Аршанскай і часткова Бабруйскай, справа самаабкладаньня разгорнута яшчэ недастаткова. Па некаторых акругах, як Віцебшчына і Гомельшчына, праца па правядзеньню кампаніі пачалася толькі ў лютым месяцы. Досыць сказаць, што па Гомельшчыне да 1 лютага самаабкладаньне прынята ўсяго толькі па 155 насельных пунктах на суму 300 0 руб., каб зразумець, якая надзвычайна вялікая работа стаіць перад гэтымі акругамі.

Як характарны момант у сёлетняй кампаніі па самаабкладаньню, трэба ад начыць тое, што сёлета на сходах грамадзян самаабкладаньне прымаецца куды лягчэй, чым летась. Масавых выпадкаў адмовы ад правядзеньня самаабкладаньня сёлета амаль няма.

Наркамфін зьвярнуў увагу ўсіх акруговых фінансавых аддзелаў на неабходнасьць узмацненьня работы ня толькі па правядзеньню сходаў для прыняцьця самаабкладаньня, але таксама і па збору сродкаў па апошняму.

Перад месцамі ў справе разгортваньня кампаніі па самаабкладаньню бліжэйшымі задачамі зьяўляюцца:

Папершае, дапамагчы райвыканкомам і сельсаветам у тэхнічным афармленьні ўжо прынятага сходамі самаабкладаньня. Падругое, у тых мясцох, дзе самаабкладаньне яшчэ ня прынята, дапамагчы ініцыятарам яго правядзеньня. Нарэшце, паскорыць збор сродкаў па самаабкладаньню з тым, каб усе вызначаныя па апошняму мерапрыемствы маглі быць своечасова выкананымі і, урэшце, забясьпечыць поўнае правядзеньне ўсіх вызначаных сходамі мерапрыемстваў шляхам загатоўкі будаўнічага матэрыялу, каб можна было своечасова распачаць будаўніцтва або іншую якую работу.

ХРОНІКА.

Да арганізацыі Інстытуту прамысловасьці.

9-га лютага адбылося пасяджэньне Акадэмічнай Рады Беларускай Акадэміі Навук супольна з пэдагогічнымі ВСНГ. Дзяржплану і Наркамзему па пытаньню арганізацыі Інстытуту Прамысловасьці, задачай якога зьявіцца ўсебаковае вывучэньне прамысловасьці Беларусі. Інстытут будзе існаваць пры Беларускай Акадэміі Навук на аўтаномных пачатках, кіраваць ім будзе ВСНГ.

Акадэмічная Рада ўхваліла арганізаваць Інстытут Прамысловасьці і даручыла прэзыдыуму БАН прапрацаваць праэкт інстытуту і падаць яго на зацьверджаньне СНК БССР.

Водгук праэкту, пабудова Інстытуту пэўнна распачацца сёлета. На будаўніцтва яго ў гэтым годзе павінна быць адпушчана 300 000 р.

Інстытут Прамысловасьці мае складацца з 3 х аддзелаў: хіміка-тэхнічнага з цэлым шэрагам лябараторый, энергетычнага з лябараторыямі цёпла-сілавой, гідрадынамічнай і электратэхнічнай, аддзелу будаўнічых матэрыялаў і арганічнай прамысловасьці.

Перабраны 24 местачковыя саветы.

На перавыбары местачковых саветаў зьявілася усяго 63.4 проц. выбаршчыкаў супроць мінулых 42,6 проц. Жаночых прысутнічала 54,8 пр. (у мінулыя выбары 35,8 проц).

Абрана 739 сяброў саветаў, з якіх 192 жаночы; з гэтай колькасьці 20,4 проц. камуністаў і 99 камсамольцаў.

Па нацыянальнасьці абраныя падзяляюцца: беларусоў 53,6 проц., яўрэяў 38,6 проц., расейцаў 2,4 проц., палякаў 3 проц., іншых 2,4 проц.

Ільготы дзецям б. піліткаторжан.

Наркамасьветы в даў пастанову абтым каб дзеці членаў усесаюзнага таварыства былых політкаторжан і ссыльнапасяленцаў прымаліся ва ўсе навучальныя ўстановы БССР на адзінакавых умовах з дзецьмі рабочых.

Пераапрацоўка статуту адзінай савецкай працоўнай школы.

Наркамасьветы БССР вядзе пераапрацоўку статут адзінай савецкай працоўнай школы. У статут будуць унесены карэктывы, якія выкліканы а сучасным жыцьцём.

Каб мець думку шырокіх колаў настаўніцтва, гэта пытаньне будзе настаўлена на абгаварваньне райённых настаўніцкіх канфэрэнцый і інспэктарскіх нарад пры акруговых інспэктаратах асьветы.

Матэрыялы, якія паступяць з месц, будуць абгаворваны ў НКА і да чэрвеня пераапрацаваны статут будзе паладзен на зацьверджаньне СНК БССР.

Захаваньне заробку для паступлючых у Камвуз БССР.

Згодна пастановы Наркамправы БССР, асобы, якія камандзіруюцца ў Беларускі Камуністычны Унівэрсытэт імя Леніна, павінны атрымаць для падрыхтоўкі ў Унівэрсытэт двухмесячны адпуск з захаваньнем свайго заробку на гэты час на займаемай імі пасадзе.

Забесьпячэньне студэнцтва практыкай і стажорствам.

Сёлета студэнты Беларускай Сельска-Гаспадарчай Акадэміі, Віцебскага і Менскага Політэхнікуму, Дзяржаўнага Вітэбскага Інстытуту і студэнты-людзі Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту будуць поўнасьцю забясьпечаны практыкай і стажорствам.

Усяго мае быць накіравана на стажорства і практыку звыш 1000 чал.

Вынаходзтва т. Дамбэ.

Дзелавод Віцебскага Акрвыканкому тав. Дамбэ працуе над канструяваньнем варштату для выробу алоўкаў. ЦВК БССР выдаў тав. Дамбэ на заахвочэньне вынаходзтва адчасовую дапамогу ў суме 150 руб. Апроч гэтага, бюро дапамогі рабочаму вынаходзтву пры ВСНГ БССР выдала т. Дамбэ на заахвочэньне вынаходкі 100 руб.

Запрашэньне прафэсара Розанава на міжнародны кангрэс фізыолягаў.

Дырэктар фізыолягічнага Інстытуту БДУ прафэсар Л. П. Розанаў атрымаў пэрсональнае запрашэньне прыняць удзел у XIII міжнародным кангрэсе фізыолягаў. Апошні пачнецца 19 жніўня б. г. у горадзе Бастоне (Амэрыка).

Прафэсар Розанаў азнаёмлены з навуковымі дасьцягненьнямі ў галіне фізыолёгіі а таксама і з шэрагам навуковых амэрыканскіх устаноў.

Новы сцэнары.

Анатоль Вольны разам з рэжысэрам Файнцымэрам напісаў і здаў у Белдзяржкіно новы сцэнары „Отель Савой". Новы сцэнарыі малюе гістарычны пэрыяд у Гомелі, падобны на нашай „Стрэкапытаўшчыны". Рэжысэр Файнцымэр заканчвае падрыхтоўчую працу да здымкаў, якія будуць весьціся ў Гомельшчыне і Ленінградзе.

Злучэньне фармацэўтычнага заводу з заводам „Чырвоны Хімік".

ЦП саюзу хімікаў згадзілася з пастановай Белгаспладам аб злучэньні фармацэўтычнага заводу з заводам «Чырвоны Хімік».

Злучаны завод буде знаходзіцца ў памяшканьні фармацэўтычнага заводу. Рабочых заводу «Чырвоны Хімік» будуць перавезены на працу на фармзавод. Злучэньне заводаў мае быць праведзена ў лютым месяцы.

Арцелі для выпрацоўкі будаўнічых матэрыялаў.

Беларускі саматужны прамысловы саюз распачаў арганізацыю на ГСФР арцелі для выпрацоўкі цэглы, камянёў і інш. будаўнічых матэрыялаў.

У арцелі будзе занята звыш 1.400 чалавек.

Гэтыя арцелі зможуць выпрацоўваць сёлета наступную колькасьць будаўнічых матэрыялаў: цэглы—19 мільёнаў штук, камянёў—45 тон і бетонных вырабаў прыблізна на 3 з палов мільёны руб.

Дайце кіно-фільмы па сельскай гаспадарцы.

Пры правядзеньні з сялянкамі гутарак па сельскай гаспадарцы ў Цэнтральным Доме Сялянина можна заўсёды ад іх пачуць, што значна лепш было-б будаваць гаспадарку, калі-б кожная гаспадар быў пісьменны ў гэтай справе. Вінават у няпісьменнасьці сялянина былы царскі ўрад, які не клапаціўся аб паширэньні сельска-гаспадарчых ведаў сярод сялян. Але гэтае было раней. Цяпер мы бачым зусім іншае. Наш Рабоча Сялянскі ўрад на кожным кроку змагаецца з няпісьменнасьцю наогул і ў прыватнасьці з сельска-гаспадарчай няпісьменнасьцю нашага селяніна.

Дзеля гэтага з боку ураду ўжываюцца усе магчымасьці: выдаюцца часопісі, зьмяшчаюцца розныя парады на сельскай-гаспадарцы ў альманахах і настольных календарох і г. д. Усё гэта дае магчымасьць селяніну набыць неабходныя веды. Трэба яшчэ сказаць і аб сельска-гаспадарчых курсах, якія штогод праводзяцца ў кожным раёне.

Значны посьпех у перадачы сельска-гаспадарчых ведаў могуць зрабіць і кіно-фільмы па сельскай гаспадарцы. Але іх у нас вельмі мала. Чэ ядома, чаму да гэтага часу Белдзяржкіно не выпусьціла адпаведных кіно фільм па сельскай гаспадарцы, а ў іх адчуваецца значная патрэба.

У Цэнтральным Доме Сялянина нечалы разоў дэманстраваўся кіно-фільм «Распрацоўка» і цікава адзначыць, што сяляне задавалі пытаньні— аму ня стаяць больш карціна па с'льскай гаспадарцы, бо, па іх думы, гэта найлепшы спосаб распаўсюджваньня сельска-гаспадарчых ведаў сярод сялянства.

Адпаведным органам трэба паклапаціцца аб арыгінальнай карціне па сельскай гаспадарцы для дэманстраваньня іх на лекцыях, як у Цэнтральным Доме Сялянина, так і наогул у нарадах.

А.

СУД.

НА ПАЖАРЫ Ў КРАСНАЛУНАХ.

Упоч на 6-та мая 1928 году у м. Красналунах, Халопяніцкага раёну ад невядомай прычыны загарэўся дом Гірша Гурэвіча. На пажар пачалі зьбягацца жыхары мястэчка, каб дапамагчы тушыць будынкі і выратаваць маемасьць Гурэвіча. Прыбегчы на пажар, Максім Гайсёнак заўважыў на гародзе мяшок з рэчамі і вопраткай Гурэвіча, скаціў яго на плечы і кінуўся ўцякаць, але жонка Гурэвіча заўважыла гэта і стала крычаць. Тады Гайсёнак кінуў мяшок і схаваўся сярод бульбы каў.

Праз некаторы час Яўхім Рыўкін зноў заўважыў, як Максім Гайсёнак скаціў другі мяшок з рэчамі і набег да дому свайго сябра, вядомага злодзея Гірсона Каменда. За Гайсёнак кінуўся ўдагон член сельсавету, дагнаў і затрымаў яго, прычым у Гайсёнка быў адабраны рыдлёвы жонкі Гурэвіч і мяшок з тытуном.

Праз некаторы час загарэлася хата Бориса Гурэвіча. Калі апошні праз вакно убачыў полымя і ўбег у хату, то застаў там Гірсона Каменда, які разьбіваў з лямпы на падлозе газу і запальваў ад Калі Борух Гурэвіч закрычаў, Каменд скаціў красла, ударыў ім на вакну, разьбіў шкло і раму і выскачыў на вуліцу, дзе скаціў частку рэчаў, выносных з пажару, і зьнік.

Распачалося пашукоўне сьледства. Насельніцтва м. Красналукі, незадаволь тарыцца ваннымі ўчынкамі Каменда, выносла прыгавор аб высяленьні яго з Красналук, як сацыяльна небясьпечнага.

Мінскі акруговы суд прыгаварыў: Гірсона Пайлава Каменда на тры з паловай гады зьняволеньня, з адбываньнем у працах на тры гады, з высылкай з Менскай акругі на адзінаццаць гадоў; Максіма Гайсёнка—на два гады зьняволеньня з суровым адмежаваньнем, адасьцца ваншы да яго амністыі ў адпаведнасьці дасягнутага дзядзіцтва БССР, скарацілі пакараньне нападаму.

Я.

Я. Я. Бурвель.

4-га лютага г. г. тэлеграф прынёс в Ленінграду вестку аб сьмерці загадчыка менскай 34-ай школы—Янкі Яўмава Бурвеля.

Я. Я. Бурвель радзіўся ў горадзе Несьвіжы ў 1888 г. Сын рабочага—муляра. Я. Я. свае юнацкія гады сам праводзіць за гэтай працай, дапамагаючы бацьку.

Не зважаючы на цяжкае матэрыяльнае становішча сям'і, бацька з апошніх сіл б'ецца, каб даць сыну адукацыю. Я. Я. прыватна рыхтуецца і ў 1908 годзе здае экзамен за поўны курс Несьвіскае настаўніцкае семінарыі на годнасьць настаўніка

З гэтага году Я. Я. працуе настаўнікам вясковых школ (Станькаўскай, Пучынскай і Макаўчыцкай) аж да Кастрычніцкае рэвалюцыі. Вялікі Кастрычнік застае Я. Я. на фронце.

З 19-га лістапада 1918 году Я. Я. прызначаецца на пасаду настаўніка 29 ае беларускае школы ў г. Менску, у 1919 г. пераводзіцца ў нова-адчыненую Сав. Бел. Прац. школу 1-ай ступені на Фальчарскай вул., пасьля польскай акупацыі Наркамасьветы даручае Я. Я. Бурвелю арганізаваць Менскі павятовы АНА, якім ён загадвае па 1921-шы год. З 1921 па 22 год Я. Я. працуе ў Барысаўскім выканаўчым камітэце і, урэшце, з 8-га ліпеня 1922 году прызначаецца загадчыкам менскай 34-ай школы, дзе і працуе да апошніх часоў.

Актыўная грамадзкая чыннасьць Я. Я. Бурвеля пачынаецца з першых дзён Кастрычніка.

У якасьці прафэсыянальнага прапаўніка Я. Я. Бурвель шырока вядомы на нашу настаўніцтву і як сакратар саюзу настаўнікаў г. Менску і, з 20-21 г. як сакратар Белпрацасьветы.

Настаўнікі і сябры, якія блізка сутыкаліся з Я. Я., добра памятаюць кіпучую, натхнёную натуру, якая адсунула і цалкам аддавалася грамадзкай справе.

Шчыры, сумленны працаўнік, чулы таварыш, ён гараў на працы і ахвяраваў ёй усе свае сілы. Яны заўчасна зьнікі. На 34-ым годзе ў Я. Я. развівацца Базэдава хвароба, як вынік нервовай працы. Але, не зьвяртаючы ўвагі на хваробу, ён ня кідае працы і, нават прыкаваны да ложка, не пакідае кіраўніцтва школай.

Ц. П. саюзу Белпрацасьветы робіць усё магчымае, каб падтрымаць слабеючыя сілы таварыша, аж да пасылкі ў спэцыяльную клініку па лячэньні ў гор. Ленінград. У апошнія часы былі атрыманы весткі аб паляпшэньні яго стану, сам хворы пісаў, што неўзабаве мяркуе прыступіць да працы. Але ж падарваны цяжкаю працаю арганізм ня вытрымаў, і на 41-шым годзе жыцьця яго ня стае.

Настаўнікі і вучні 34-ай школы.

ЦІ НЯ ЧАС ПАЧЫСЬЦІЦЬ ЦАРКОЎНІКАЎ З БДВ?

(Амаль фэльетон).

Неяк не шанцуе пачаму Белдзяржвыдавецтву з выданьнем календароў...

Летась выдалі календар, але з маленькім спазьненьнем. Не пасьпелі працаўнікі Белдзяржвыдавецтва, як кажуць, „агляцца", а Украінскае Дзяржаўнае Выдавецтва з кожнай хаты, з кожнай кватэры віншавала нашых таварышоў з БДВ з «Новым рікам».

У выніку «маленькага» спазьненьня з выпускам леташняга пасьпешнага календара Белдзяржвыдавецтву прыйшлося апошні распраданьць з вялікай стратай. Якія страты панесла наша выдавецтва ад сваёй недбайнасьці, мы сказаць не бярэмся, гэтым, відаць, у свой час займаліся адпаведныя органы, якія і сказалі свае слова.

Зараз зерад нашы настольны календар на 1929 год таго-ж самага Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва...

Пераглядзелі мы яго раз, пераглядзелі другі і аж зласьць узяла.. Жывем мы, кажучы словамі некаторых працаўнікоў БДВ, «слава богу» ўжо дванаццаты год пасьля Вялікага Кастрычніка, і дакольле вас запытаць—нашэпта-ж мы бароліся?..

Ня толькі не шанцуе працаўнікам з Белдзяржвыдавецтва, але выданьне апошняга календару наводзіць нас на сумныя думкі.

Ці ў іх там сяхзіць усе з дзіркай у галаве, ці, наогул, асобы з «духовного звання», а толькі...

Пераглядаючы настольны календар, пачынаецца зрабіць вывад, што ў працаўнікоў Белдзяржвыдавецтва «ня ўсе дома», або яшчэ горш таго—працуюць асобы, месца якіх сядзець дома і «возносить молитвы ко господу».

Запытайцеся любога школьніка з першай класы, і ён вам адкажа, што і мая зьяўляецца міжнародным святам пралетарыяту, а вось на Белдзяржвыдавецтву—гэта «яўрэйская сьвята—апошні дзень вялікадня».

Пераглядзьце гэты календар, і вы ўбачыце, што працаўнікі Белдзяржвыдавецтва народ „інтэрнацыянальны"... толькі ў адносінах клерыкалаў усіх колераў.

Нагадваньне аб сьвяце ў іх знойдзе і католік, і праваслаўны і іудэй,—запамятвалі толькі нашы бедныя аб магометанах і іншых «вероисповеданиях»...

Патрэбна от, патрэбна на Белдзяржвыдавецтву добрая мітла.. Бо інакш... Інакш, чаго дорага, у Белдзяржвыдавецтве пачнуць выдаваць жыцьцяпісы сьвятых айцоў праваслаўнай царквы і іншыя «вельмі карысныя для души книжкі»...

В. Зайцаў.

БІБЛІАГРАФІЯ

А. САПОЖНІКАЎ. ЯСЬКА ДЫ МІХАСЬКА. Ст. 40, цана 15 к. Менск, БДВ.

Апошні час БДВ пачало даволі спраўна выдаваць дзіцячую літаратуру. Чарговая кніжка—«Яська ды Міхаська»—ёсьць апрацоўка з выданьня на расейскай мове. Пералік слоў пра зьмест кнігі:

Пазычыны Яська звычайна ўжыту пакіроўваўся ў горы для палажэньня. Там ён яшчэ убачыў, як забаўляўся на вады мядзьведзь (Міхаська), скідаючы з гор камяні. Апошні мядзьведзь сарваўся з гары і мо ка пабіўся. Яська пачаў яго лячыць і „так вось і нашло знаёмства паміж гэтым дзіваком-пустэльнікам... ды зьвяром-дранежнікам"... (Ст ст. 25-27).

Мова кніжкі наогул добрая, але часам сустрэкаюцца заганы стылістычнага і моўнага парадку: с... мядзьведзь пакаціўся з крутой гары ў бяздонные (ст. 8). Але ў бяздонные с... дарога б'ець нешлёгка. Яська сымой крыку ўніз і палоў у лес (ст. 10).

Якое-ж гэта бяздонье, калі дарога нешлёгка і так лёгка ў яго сысьці?

„... прыбёршыся задам да яго, лажаў мядзьведзь" (ст. 11). І прыбёршы задам ножа сядзець, а не ляжаць.

„Жыцьця была вельмі чудна"... (ст. 14). Чудна можа быць чалавек, а ня жыцьця.

„Сякорай ён іх (дончачкі В. Л.) здольна абсек"... (ст. 23). Пазычыць «здольна» нельга пераносіць на нижэйш прадмет.

Такія словы як «рододендромы», «чагаз» «чаг» і «стуска» трэба было вытлумачыць, ці замяніць (некаторыя) адпаведнымі зразумелымі беларускімі. Трэба замятаць, што дзіцё не заўсёды зможа атрымаць ад сваіх бацькоў тлумачэньні і, такім чынам, гэтыя словы застануцца для дзіцяці незразумелымі.

Есьць пэўныя дэфэкты характару. Зусім незадушчальна ў дзіцячай літаратуры такія рэчы, як «замкнос, напрыклад, чалавек. Ну, дык пазнікаў бабу" (ст. 15). Нікіцць іх без залежнага тлумачэньня з боку старэйшых нельга, бо часам гэтыя словы падтрымаюць у дзіцяці прымацаваныя ад сталых бацькамі веру ў знахарак. Але не заўсёды можна атрымаць патрэбнае тлумачэньне. Таму апрацоўчыя лепш-бы зрабіў, каб выкінуў зусім гэтае месца. Таксама трэба замяніць вылічэньне часу с... да Пятра... (ст 28) і да розных сьвятаў («ад сала», «да сёмухі» і г. д.).

Прыдзіраецца кніжцы, каб у ёй меней успамінаўся Ленін: с... каб цябе нагэтра, бо яна лёгка можа ўвійсьці ў слоўнік дзіцяці, дый праз... кнігу!

Але такіх месцаў і шмат у кніжцы няма. Наогул-жа кніжка напісана добра: лёгка і жывой мовай. Сюжэт знаёмдання гаспрацоўкі ці ака. У такіх дзяцей малюнкі. Цана на кніжку невялікая—15 кап.

Кніжку можна раіць дзецям малодшага школьнага ўзросту.

В. Л—ч.

Апавяшчэньні.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

Сёньня ніво «Падхода шчасьця» (7 з пал. і

АСТАЦТВА—КРЫТЫКА.

М. ЛІПНІЦКІ.

Жанчыне.

Жанчына, любая, таварыш,
Мой спадарожнік дарагі!
Ты сьмела йшла ў дыму пажарышч
Ў завеях сьнежнае пургі.
Ты не бразгочаш на раялі
І не лапочаш «ля-франсэ»,
Але з табой мы Вільню бралі,
Прайшлі франты амаль што ўсе.
Рука з рукой, плячо з плячом
Ішла ты ў бойку з намі побач:
Бінтом, вінтоўкай, сухаром
Ты, як магла, давала помач.
Я помню бой. Ляжу ў кустох...
Струменіць кроў з глыбокіх ран.
Ты са спагадаю ў вачох
Падносіш мне з вадою жбан.
Паход. Нас банда абстраляла:
Як дождж сыпнуў сьвінцовы шрот...
Ты пад агнём каня трымала,
Пакуль я ладзіў кулямёт.
Пукішкі... Не забыць ніколі,
Як у нядзелю ты прышла
І разам з пахам сонца, волі
Акрайчык хлеба прынясла.
Шапнула: ведай пра падзеі...
Ішчэ кіпіць... Гараць агні...
Бушуюць сьнежныя завеі—
Змаганьня радасныя дні.
Мінулі бойкі і франты...
Зноў задымелі качагаркі...
Ужо на новым фронце ты—
Па адбудове гаспадаркі.
Вінтоўку цыркуль замяніў,
Бінты—балянсы апэрацый;
Тады я лёс з табой злучыў:
Ты стала жонкаю і маці.
Дзень цэлы—праца на заводзе,
Пад вечар—вольных пяць хвілін.
І вось усьмешкаю на сходзе
Ты гладзіш боразны маршчын.
Прыемна бачыць, як заўзята
Ты крыеш працы недахоп,
Або чынушу-бюракрата
Бярэш за цьвёрды медны лоб.
Прышла да хаты. Адпачынак.
Вячэра. Жвавы разгавор:
Пра рост актыўнасьці жанчыны,
Пра сход, ячэйку, Аўтадор.
А потым, скончыўшы вячэру,
Сядзіш за кніжкаю аж сьвет:
Пра дні камуны, Робэсп'ера,
Або дванаццаты партзьезд...
І так да новых формаў быту
Накіравала ты шагі...
Таварыш, любая сястрыца,
Мой спадарожнік дарагі!

БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ КАПЭЛЯ.

На ўсім працягу векавечнага прыгнечаньня беларускага народу (раней палянізацыі, пазьней русіфікацыі) беларуская інтэлігенцыя несла свае здольнасьці і таленты на карысьць чужой культуры. А мова беларуская, і беларуская песьня, захоўваліся і развіваліся толькі ў сялянскай хаце.

На нашых вачох арганізоўваліся асновы беларускія культурныя ўстановы, на нашых вачох адбывалася іх часьпяховая праца,—іх росквіт і іх лікідація дасягненьні. На нашых вачох заснаваўся і быў студыйны беларускі хор Галоўпалітасьветы, які пазьней (8 сакавіка 1928 году) быў рэарганізаваны ў Беларускую Дзяржаўную Капэлю.

Студыйны хор заснаваўся ў 1926 г. па ініцыятыве тагочаснай музычнай падсэкцыі Інбелкульту. Шляхам конкурснага адбору галасоў хор даведзены быў да 74 асоб; у гэты лік увайшлі і 17 асоб з хору, які абслугоўваў у той час вандроўны белтэатр.

Магутны па свайму складу, але малады хор апынуўся ў цяжкім становішчы. Самае галоўнае—гэта адсутнасьць адпаведнага рэпэртуару. Вялікі лік беларускіх народных песень, сабраных у розныя часы як паасобнымі зьбіральнікамі, так і экспэдыцыямі Інбелкульту, зьяўляўся сырым неапрацаваным матар'ялам. Запісваліся толькі мэлёдыя песьні на адзін голас і не заўжды. Для хору-ж патрэбны, а для такога багатага сваімі тэхнічнымі магчымасьцямі хору, якім зьяўляўся студыйны хор, патрэбна была і гарманізаваная песьня ў адпаведнай для хору апрацоўцы. Значыць, першай найгалоўнейшай мэтай гэтага хору было набыцьцё гарманізацый, якія і рабіліся, як на заказу Наркамасьветы выдатным расейскім кампазытарам (Грэчанінаў, Іпалітаў—Іванаў, Нікольскі) так і па просьбе кіраўнікоў-арганізатараў хору В. А. Селіха і А. А. Ягорава кампазытарамі, якія працавалі на Беларусі (М. В. Анцаў, М. І. Аладаў, У. В. Тэраўскі, М. М. Чуркін, Т. А. Шнітман, А. Турэнкаў, М. Равенскі).

Трэба адзначыць, што нашы кампазытары ня толькі бясплатна рабілі гарманізацыі, а некаторыя з іх і іншымі спосабамі садзейнічалі росквіту сьпеўнай справы. Так: М. В. Анцаў увесь багаты запас сваіх гарманізацый і кампазыцый аддае да паслуг Капэлі і мае прачытаць для Капэлі цыкл лекцый аб беларускай песьнятворчасьці. М. І. Аладаў увесь час дапамагае харавой справе ня толькі як кампазытар-гарманізатар, але нават і як акампаніятар капэлі ў часе канцертаў.

З пачатку свайго заснаваньня хор ня меў ні сталага памяшканьня для сваіх заняткаў, ні належных сродкаў. Ня гледзячы на гэта, пачатая справа ня толькі ня спынілася, але дала свае вынікі: хор і яго кіраўнікі, адухаўлёныя адзінай думкай, запаленыя адзіным агнём, з шчырасьцю і поўнай адданасьцю вывучаюць рад мастацка-апрацаваных народных песень, песень рэвалюцыйных і песень нацыянальнасьцяў БССР. Пачынаецца росквіт хору

Да больш выдатных выступленьняў хору трэба аднесьці наступныя:

Першае: (19 лістапада 1926 г.) на Акадэмічнай Канфэрэнцыі; аб гэтым было адзначана нават замежнымі ўдзельнікамі канфэрэнцыі ў сваіх часопісах.

Выступленьне 29-3 1927 г. у канцэрце, прысьвечаным 100-годзьдзю з дня сьмерці Л. Бэтховэна, у яго 9-й сымфоніі, напісанай для аркестру, хору і салістых.

Удзел хору ў пастаноўцы І Беларускай дзяржтэатрам оперы «Русалка» (на беларускай мове) 14 і 15 мая 1927 г. (Рэцэнзію глядзі ў «Савецкай Беларусі» 18-У—1927 г. № 110).

На ўсе рэвалюцыйныя сьвяткаваньні і ўрачыстасьці і—гадавіны рэвалюцыйных падзей хор кожны год прымаў удзел з адпаведным рэпэртуарам, а гэтак сама і на партыйных зьездах і зьездах саветаў БССР.

Самым гучным акордам ў гісторыі Капэлі можна лічыць выступленьні яе ў Маскве ў дні Кастрычніковых сьвяткаваньняў (1927 г.) на працягу 10 дзён у Дзяржаўнай Акадэміі Мастацкіх Навук СССР і па фабрыках і заводах Масквы, дзе яна адразу „завалявала сымпатыі як сярод навуковага і мастацкага сьвету Масквы, так і сярод пралетарскіх мас чырвонай сталіцы («Зьвязда» 1928 г.№ 1, артыкул Навук. Сакрат. Дзярж. Ак. Маст. Навук Ю. Самарына і адозва на імя СНК БССР ад Акадэміі Мастацкіх Навук 17-XI—27 г. № 1394).

На прапанове Галоўмастацтва БССР Капэля злучылася з харавою клясай музтэхнікуму, дзе яна, апрача сваёй былой чыннасьці, нясе абавязкі ў пастаноўках опэр, якія падрыхтоўвае оперная кляса музтэхнікуму.

Вітаючы Капэлю як установу, з першай гадавінай яе існаваньня, адзначаючы пройдзены ёю начэсны шлях, пажадаем ёй далейшага посьпеху і росквіту ў справе мастацкага выхаваньня рабоча-сялянскіх працоўных мас Беларусі.

Пажадана, каб пры Капэле была ўтворана спэцыяльная кляса падрыхтоўкі сьпевакоў з шырокіх працоўных мас.

Мажор.

АБ П'ЕСАХ ДЛЯ ВЯСКОВЫХ ДРАМГУРТКОЎ.

За апошнія гады БДВ побач з выданьнем іншай літаратуры зьвярнула ўвагу на выданьне дзіцячае літаратуры, масавае—папулярнае літаратуры для сялян, а таксама і п'ес. Але ўсё-ж ня гледзячы на тое, што п'ес для вясковага тэатру ў параўнаньні з 1923 і 24 г. выдадзена больш, вёска і цяпер часта карыстаецца «подемыльчиками», ды іншай непатрэбнай, што выпадкова трапіла ў вёску. Прычыны гэтага, нам думаецца, у тым, што беларускія п'есы слаба прасунуты ў вёску. Вядома, што вінаваціць у гэтым толькі БДВ было-б няправільна, крыху віну можна ўскласьці і на тых хто закупляе літаратуру для вясковых палітасьветустаноў, а таксама на таго, каму належыць кіраваць працай нашых вясковых драмгурткоў, якія да рэчы сказаць да гэтага часу кідуць працу самапасам.

Бел. Дзярж. Выдавецтву трэба больш аддаць увагі выданьню п'ес, якія-б былі дапасаваны да вясковае сцэны, а таксама і на іх прасоўваньне не ў вёску для чаго зьнізіць плату, бо крыху дарагаватая. Як больш значныя недахопы у выданьні п'ес варта адзначыць бяссыстэмнасьць выданьня.

Тут варта-б было скарыстаць попыт РСФСР, дзе п'есы асабліва для вясковага тэатру выдаюцца не выпадковага зьместу, як гэта ў нас робіцца, а плянава і ў большасьці на тэму дня.

Скажам к прыкладу, у сучасны момант у нас надта важным пытаньнем высунута падвышэньне ўрадкайнасьці, калектывізацыя сельскае гаспадаркі, пидаўпа праходзілі перавыбары с.-сав., 2-хтыдневік ашчаднасьці і г. д. Калі і даваліся да гэтых кампаній п'есы, то з вялікім спазьненьнем.

Нашы драмгурткі прымаюць чынны ўдзел у працы хаты-чытальні, дапамагаюць у правядзеньні розных кампаній і калі мы не дамо своечасова адпаведных п'ес, драмгурткі ня будуць скарыстаны так, як гэта патрэбна, С.

ТАМ, ДЗЕ ПАХАВАНЫ ТАРАС ШЭЎЧЭНКА

...«Калі ехаць на параходзе ад Кіева па Дняпру, дык добрых вёрст трыцатыры трэба спусьціцца ўніз за Каніў. Там над самым берагам на высачэнай гары знайшоў сабе паселішча Тарас. Верхавіна тае гары ўдаўжкі будзе сажняў сто, а ўпапярок да 45. Гара на ўсход крута апускаецца да берагу Дняпра, і ідучы проста на ўзыйдзеш, а трэба падымацца хітрашчамі: ступіць разоў пяць уперад бокам, а потым павярнуцца тварам туды, куды быў патыліцаю, ды зноў падаешся назад, ды хапаешся за галінкі арэшніку, каб не паляцець стырчма. К захаду і да паўдняёвага захаду—тое самае»—так апісвае адзін з сяброў вялікага паэты Украіны Тараса Шаўчэнкі—Частакоўскі—тую гару над Дняпром, на якой па «Запавіту» паэты пахавана было 10-га мая 1861 году цела Шаўчэнкі *). А праз два тыдні той самы Частакоўскі ў лісьце да пецярбурска-украінскае грамады так паведамляе: «Оце учора (16-УІ) тільки що вивершив батькові Тарасу могилу сажень в дві завширки, а тепер піду аброблять; добрий люд поміг мені у сьому ділі... всі вони називають його батьком Тарасом, ратувавшим їх волю, а гору, на которій поховали—Тарасовою, замість прежнього названня Чернечою»...

Гэты Частакоўскі расказваў сялянам пра Шаўчэнку, чытаў яго вершы, прадаваў украінскія кніжкі. У такой дзейнасьці паліцыя ўбачыла вялікую небясьпеку. Паляцелі даносы, замятусіліся ўраднікі, спраўнікі і г. д. Скора Частакоўскага выслалі і забаранілі было яму наведваць магілу.

Толькі ў сьнежні 1882 году сваяк паэты Вартахамей Шаўчэнка пачаў клапаціцца аб рамонце магілы. Пісьменьнік П. Куліш напісаў адозву аб неадкладнай дапамозе магіле. Палтаўскае земства першым адгукнулася і дало на гэта пяцьсот рублёў, далей—іншыя; сабрана было каля 6 тысяч рублёў.

У 1884 годзе прывезьлі ў Каніў крыж, а ў 1888 годзе—чыгунную агароджу, а праз году хату павешан быў партрэт Шаўчэнкі і наняты вартаўнік Іван Яцлоўскі, які нават і дагэтуль вартуе магілу. У 1905 г. удалося купіць зямлю ў Каніве непта дзесяцін чатыры, на якой пасадзілі дрэвы.

У 1923 г. захадамі савецкае ўлады была адрамантавана магіла, сходы на гару, хата, а замест чыгуннага крыжа паставілі бюст Шаўчэнкі. У 1926 годзе пастановаю ўраду УССР уся магіла абвешчана дзяржаўным запаведнікам: «Магіла Шаўчэнка». Побач з гэтым запаведнікам, які мае 10,6 гэктараў, існуе «Лісо-степовий заповідник ім. Шеўченка», да якога належыць лес, востраў, степ наўкола магілы) звыш 1000 гэктараў).

Запаведнік «Магила Шевченка» узят на дзяржаўнае ўтрыманьне з 1926 году. Тады-ж было асигнавана 8.000 р. якія ішлі на ўтрыманьне персаналу запаведніка, на папаўненьне бібліятэкі запаведніку і на абалугоўваньне экскурсій. З асигнаваньняў 1927-28 г. 30.000 руб. частка была прызначана на правядзеньне конкурсу і набудову гасьцініцы. Трэба сказаць, што магілу наведвае вельмі многі людзей. За дзевяць месяцаў 1927 году з 1 студзеня па 1 кастрычніка на магіле пабывала каля 15000 тысяч экскурсантаў з іх: вучняў—38 проц., сялян—19 проц., служачых—22 проц., рабочых—14 проц., камсамольцаў і піянэраў—5 проц. і інш. розных асоб—2 проц.

Вядома, што пакінуць магілу Шаўчэнкі ў такім стане, як яна была да рэвалюцыі, зусім немагчыма. Тысячы народу кожны год наведваюць магілу. Шматлікія запісы ў кнізе наведваньня вымагаюць лепшага абсталяваньня магілы і перш за ўсё пабудовы гасьцініцы, арганізацыі музэю, кіно, і інш.

Яшчэ больш настойліва вымагалі наведвальнікі замяніць няўдала зроблены бюст добрым помнікам. Да 1926 г. бюст быў пазалочаны і толькі пасьля многіх скаргаў на гэта і артыкулаў у прэсе, яго пачарнілі, а разам з тым, зусім не да рэчы, быў пачэрнены прыгожы белы барэльеф Шаўчэнкі на ліцавым баку пастамэнту. З утварэньнем на Украіне інстытуту Тараса Шаўчэнкі, які яднае найвыдатнейшых літаратуразнаўцаў, які мае на мэце вывучаць Шаўчэнку і яго эпоху, вывучаць украінскую літаратуру ад часоў Катярэўскага і да нашых дзён, папулярызаваць сярод працоўных Украіны нашы здабыткі ў гэтай галіне, з утварэньнем у 1926 г. пры Наркамасьвеце шэўчэнкіўскага камітэту ў складзе дзесяцёў навукі і літаратуры, прадстаўнікоў ад сучасных пісьменьніцкіх арганізацый (ВУСПП, Плуг, Маладняк і інш.), справа аховы магілы, арганізацыя там музэю і наогул утварэньня ў запаведніку культурнага асяродзьдзя, пашлі значна лепш.

У 1927 г. абвешчан быў конкурс на праэкт помніку на магіле. З прычыны кароткага часу гэты конкурс ня даў патрэбных вынікаў. Цяпер шэўчэнкаўскі камітэт намеціў шэраг захадаў да ўвекавечаньня памяці Т. Шэўчэнкі; на першым месцы месца на ўвазе абвяшчэньне міжнароднага конкурсу на праэкт помніку; на чале конкурснае камісіі стаіць член інстытуту Т. Шэўчэнкі—С. В. Піліпенка. Перад гэтым у Харкаве будзе праведзен дыспут на тэму, якім мае быць помнік вялікаму паэту Украіны. Абгаварэньне гэтага пытаньня ў прэсе ўжо пачалося. Будзе арганізавана выстаўка папярэдніх праэктаў помніка. Гэтымі днямі пленум шэўчэнкаўскага камітэту павінен разглядзець і зацьвердзіць умовы міжнароднага конкурсу на помнік. Лепш абстаіць справа з набудовай гасьцініцы на магіле. Увосень 1927 г. шэўчэнкаўскі камітэт даручыў сваёй кіеўскай філіі скласьці праэкт гасьцініцы. Філія камітэту даручыла гэтую работу кіеўскаму мастацкаму інстытуту. У маі 1928 г. адбылося ўрачыстае пасяджэньне пленуму камітэту на магіле пад Канівам.

Пленум камітэту на магіле ператварыўся ва ўрачыстае сьвята украінскай рэвалюцыйнай культуры. Усе аглядзелі запаведнік, тое месца, дзе намечана было будаваць гасьцініцу, пасьля разглядзелі праэкт гасьцініцы. Пленум зацьвердзіў праэкт, зроблены студэнтам архітэктурнага аддзелу Галоўчанка. Гэта будзе будынак ва украінскім стылі прыблізна на 75-100 чалавек. Там маюць быць асобныя пакоі для культурна-асьветнай работы сярод экскурсантаў, заля, асобныя пакоі для навуковай працы, варанды і розныя пакоі-музэі, бібліятэка і інш. Таго-ж такі году і распачата была набудова гасьцініцы. Папярэдні плян вызначаў заканчэньне набудовы ў 1928 г., але вышла затрымка і летам гэтага году гасьцініца будзе закончана.

Толькі цяпер працоўныя Украіны і інш. рэспублік Савецкага Саюзу змогуць з большымі выгадамі пабываць на магіле, азнаёміцца з жыцьцём і творчасьцю паэты-бедняка, памяць аб якім так моцна жыве ў народзе, слава аб якім разышлася далёка за межы Украіны. Творы Шаўчэнкі перакладзены на мовы іншых краін, як англійскую, нямецкую, французкую, шведскую, японскую, турэцкую, гішпанскую, італьянскую і г. д.

Вось гэтыя захады савецкай улады да ўвекавечаньня памяці Тараса Шаўчэнкі, гэта—захады, прадыктаваныя гаспадарамі савецкае краіны рабочымі і працоўнымі сялянамі, гэта—найлепшы доказ вялікае пашаны гэніяльнаму кабзару і змагальніку за долю бедных, якім усё сваё жыцьцё быў Тарас Шаўчэнка.

Міх. Биковець

*) Ня так даўно выдана цэлая вязка недарагіх, але цікавых кніжак па гэтаму пытаньню: 1. Юр. Савченко—Дещо з історії могили Шевченка. 2, П. Петренко—Похорон Т. Шевченка. 3, Ол. Варавва—Прочанин на могилі Т. Шевченка. 4, Я. Хоменко—Народні переказы про Шевченку могилу. 5, В. Коряк—Життя Т. Шевченка. З гэтых кніжак мы й бярэм весткі для гэтага артыкулу.

НАШ ДРУК.

У гэтым артыкуле нам хочацца, не даючы апэнак асобных кніг, надзяліцца некаторымі лічбамі і разважаньнямі аб становішчы нашага кнігадруку наогул і некаторых асобных груп і даць кароткае параўнаньне беларускага друку з друкам іншых саюзных рэспублік.

1926 г. даў прырост супроць 1925 году на 122 кнігі, а 1927 супроць 1926 г. вырас на 169, дык на 1928 г. вышла больш чым у 1927 г. усяго 41 кн. (за 1927 г. вышла 652 кнігі, а ў 1928—689).

Недастатковы рост ліку кніг частова кампэнсуецца даволі значным ростам як тыражу, так і агульнай колькасьцю аркушаў-адбіткаў. Так 2 гады мы бачым наступны малюнак росту:

Агульны тыраж 1927 г. 1.785.015, 1928 г. 2.246.320.

Агульная колькасьць аркушоў-адбіткаў 1927 г. 13.071.270; 1928 г. 16.393.335.

Аднак узрост у гэтых графах нельга лічыць здавальняючым пры нашым недахопе ў кнігах. Той невялікі рост, які мы бачым ідзе выключна за кошт Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва, якое за мінулы год зрабіла вялізны крок уперад выпусьціўшы 300 кніг замест 168 у 1927 г. і дадаўшы адпаведна росту колькасьці гадоў, рост тыражу і агульнага лістажу.

* * *

1928 друкарскі год прынёс некалькі навінак, аб якіх нельга нічога не сказаць, або не казаць прыемнымі. Першаю навінаю зьяўляецца літаратура на тых мовах, на якіх у нас у БССР кнігі яшчэ да гэтае пары не друкаваліся—літоўскай, латыскай, і нямецкай.

Да 1928 году кнігі друкаваліся ў нас на 4-х дзяржаўных мовах БССР—беларускай, расейскай, яўрэйскай і польскай, цяпер-жа, для задавальненьня культурных запатрабаваньняў нац. меншасьцяў—літоўскай і латыскай,—пачалі друкаваць кнігі і на іх мовах, а таксама і на нямецкай мове.

Другою навінаю зьяўляецца дзіцячая літаратура. За мінулы год гэта была важнейшая друкарская навіна, якую наша прэса чамусьці абыйшла моўчкі. За цэлы год аб дзіцячых кніжках было зьмешчана ўсяго некалькі невялічкіх рэцэнзій, а між тым пісаць ужо ёсьць аб чым—за год вышла ў сьвет 80 дзіцячых кніжак з агульным тыражом 328.000 экз.

Калі гэту лічбу зьмясьціць у тое пустое месца, дзе навінна была сталіць раней дзіцячая літаратура, дык і сапраўды робіцца няспрытна, што наша грамадзкасьць ніяк не адгукнулася на гэта «нараджэньне».

Выпушчаная дзіцячая літаратура падзяляецца на дзіцячую дашкольную—прызначаную для дзяцей малодшага ўзросту і дзіцячую школьную, якая ў сваю чаргу падзяляецца ў асноўным на 2 сэрыі „Малады прыродазнаўца" і «Бібліятэка школьніка»,

Пераважная большасьць іх перакладзена з расейскага, а тыя, таксама ў значнай частцы перакладзены з англійскага і інш. Пераклады зроблены з такіх аўтараў, як Сетон-Томпсон, Ч. Робэртс, Амічыс і інш. Свае арыгінальнае дзіцячае літаратуры ў нас амаль няма. Нашы пісьменьнікі яшчэ не зьвярнулі на гэта належнай увагі.

Толькі для дзяцей малодшага ўзросту вышла некалькі беларускіх народных казак у настацкай апрацоўцы Я. Коласа, некалькі кніжак Бядулі, Александровіча і ўсё. Для старэйшага-ж узросту перакладная літаратура займае 80 проц.

БДВ, выдаючы дзіцячую літаратуру, пастаралася над яе знадворным афармленьнем. Усе кніжачкі маюць мастацкую вокладку і ў большасьці багата і ўдала ілюстраваны. Справа, вядома, не абышлася без некаторых лапсусаў. Для прыкладу можна паказаць хаця на адну з апошніх кніжак: «Як неўнік ратаваў курачку». Народная казка ў мастацкай апрацоўцы Я. Коласа, дзе сяляне на лузе маюць такі выгляд, быццам яны надаўна пілі воцат, такія крывыя і кісныя твары выйшлі ў іх. Але звычайна добры шрыфт, паперa і малюнкі надаюць дзіцячай кніжцы вельмі прывабны выгляд.

Выпускаючы прыгожыя і добрыя кніжкі для дзяцей, БДВ, здаецца, зусім не ўзяло над увагу кішэню сваіх спажыўцоў. Звычайна дзіцячыя кніжкі маюць цану высокую—50-60 кап., а адна, праўда, выданая вельмі прыгожа—каштуе 80 кап.

У значна лепшым становішчы, з гэтага боку, знаходзіцца літаратура для дзяцей старэйшага ўзросту, выданая з надворнага боку горш, асабліва ўдалая сэрыя „Малады прыродазнаўца" як па зьместу, так і па нізкасному кошту—25 кап.

За вельмі невялікім выключэньнем апавяданьні гэтае сэрыі надабраны вельмі жвавыя, захапляючыя, напісаныя лёгкаю моваю і добра перакладзены.

У кожнай асобнай кніжачцы гэтае сэрыі даюцца некалькі апавяданьняў з жыцьця розных зьвяроў і птушак, а ў пачатку знаходзіцца кароткі прыродазнаўчы нарыс І. Цьвікевіча.

Вельмі шкада, што ўсе гэтыя кніжкі перакладзеныя і даюць апісаньне жыцьця зьвяроў і птушак далёкіх краін.

Выпуск дзіцячае літаратуры не зьмяншаецца да апошняга часу.

* * *

Пры нашым агульным недахопе кніг, найбольш, у першую чаргу былі патрэбны на беларускай мове, падручнікі для школ. Сэрыя другіх катэгорый нашых кніг, падручнікі, па тыражу і агульнаму лістажу займалі першае месца, ды напоўна яны яшчэ і ня скора зыдуць з гэтага месца, бо патрэба і ў іх адчуваецца вельмі вялікая.

У 1928 годзе падручнікі займалі 30 проц. агульнага беларускага тыражу, і 53 проц. усіх аркушаў - адбіткаў.

Нельга не адзначыць, што нашы падручнікі, ня гледзячы на частае перавыданьне (у 1928 г. 36 проц. усіх падручнікаў былі перавыдадзены) і тое, што больш ¼ з іх перакладныя, маюць таксама вельмі высокі кошт.

Пераклады даюцца з расейскай мовы і хаця плацяць аўтарскага ганарару ня прыходзіцца, а толькі аплачваецца пераклад, часта бывае, што наш пераклад каштаваў даражэй чым расейскі арыгінал. Прыкладаў ёсьць даволі; вось яны: Бублікаў—Біалёгічныя гутаркі. На расейскай мове каштуе 1 р. 35 к., а на беларускай 2 р. Сталін—Пытаньні ленінізму. Рас. 1 р. 50 к.—1 р. 60 к., белар.—2 руб. Харабін—Нарыс геаграфіі сьвету. Расейск.—60 к., беларуск. выд.—90 к.

* * *

Агульны процант перакладной літаратуры ў нас не малы—у 1928 годзе ён дасягаў 20 проц. сярод усіх выданьняў, але гэта зусім ня значыць, што з перакладамі ў нас справа добрая. Асабліва гэта датычыцца мастацкай літаратуры.

Перакладной мастацкай літаратуры ў нас зусім яшчэ няма, калі ня лічыць некалькі дробных кніжак выдаденых ЦБ Маладняка. Нашыя часопісі таксама малавата даюць перакладной літаратуры.

Між тым ня гледзячы, што ў нас ня так шмат свае мастацкае літаратуры, яе (беларускую мастацкую літаратуру) перакладаюць на іншыя славянскія мовы куды больш, чым перакладаюць з чужых моваў на беларускую.

Нават за такі, параўнальна невялікі тэрмін, як апошні год, вышлі наступныя пераклады, асобнымі кніжкамі: (на расейскай мове), Гушча Т. „У Палескай глушы", Гартны „Трэскі на хвалях".

На украінскай: Бядуля—«Салавей», Крапіва—„Байкі", і цэлы альманах «Нова Білорусь».

На польскую: Колас—У прасторах жыцьця», Нёманскі—«Матка».

На харвацкай: Гушча «У палескай глушы». Апрача вышэйнамянёных паасобных кніжак у розных часопісях, асабліва ўкраінскіх, друкуецца значная колькасьць перакладаў з беларускага.

Той украінскі тыдзень, які надаўна адбыўся ў Маскве, вельмі дакладна паказаў, як мала суседзяя саюзныя рэспублікі ведаюць аб жыцьці другое. Практычныя пастановы, якія былі ўхвалены ў часе гэтага тыдню, нажміва зрушаць справу з месца.

Расейская прэса адзадушна сьцьвярджае, што ў РСФСР зусім ня ведаюць аб культурным жыцьці Украіны. Мы з свайго боку ня можам сказаць чаго небудзь іншага.

Наезды украінскіх пісьменьнікаў да нас і нашых на Украіну некалькі спрыялі агульнаму азнаямленьню, але гэтага мала. Нашыя часопісі нават не перадрукавалі тых уражаньняў украінскіх пісьменьнікаў, якія былі зьмешчаны імі ў розных часопісях.

У нас цяпер вялікі попыт на мастацкую беларускую літаратуру. Што гэта так—сьведчыць факт перавыданьня беларускае літаратуры па некалькі раз.

Творы Коласа, Купалы, Гартнага, Чарота, Зарэцкага, Александровіча і інш. выданы 2-гі і 3-ці раз.

Гэта сьведчыць, што мастацкая літаратура патрэбна. Той лік мастацкае літаратуры, які выдаецца цяпер ня можа задаволіць масу чытачоў.

У ўкраінцаў, напрыклад, можна бачыць шмат перакладной літаратуры. Перакладаў, як з расейскіх, так і заходня-эўрапейскіх аўтараў: Пушкіна, Шэкспіра, Міцкевіча, Лёндана, Бальзака, Мапасана і шмат іншых.

* * *

У нас яшчэ да гэтае пары не наладжана выданьне масавае таннае літаратуры.

Том твораў народнага паэты Янкі Купалы каштуе 2 р. 50 к.—2 р. 75 к. Творы другога народнага паэты Коласа таксама каштуюць 2 руб. Дэкламатар складзены Ляжневічам каштуе 2 руб. 30 кап. і г. д.

Пра творы народных паэтаў, ня гледзячы, што іх раскупляюць даволі бойка.

Цікава параўнаць становішча твораў нашых народных пісьменьнікаў хаця-б з «Кабзаром» Шаўчэнкі па Украіне. Там «Кабзар» выдаваўся і выдаецца ледзь ня ўсімі існуючымі і якія існавалі выдавецтвамі, па цане зусім даступнай. Напрыклад: «Кнігоспілка» выдала яго з каляроваю вокладкаю за 80 кап.

Заслугоўвае ўвагі і той факт, што „Салавей" Бядулі ў перакладзе на ўкраінскую мову каштуе (бяз 2 іншых апавяданьняў, якія знаходзяцца ў адной кніжцы з «Салаўём») 55 кап., а ў нас—2 руб.

Калі ў нас яшчэ не надышла пара выдаваць сваю-раман-газэту, дык усё-ж пара распачаць выданьне таннай літаратуры, даступнай па сваёй цане шырокім колам.

* * *

Ня кажучы пра РСФСР і нават Украіну, якая выдае ў год да 5 тысяч кніг і з якою нам цягацца нельга, нават Каўкаская рэспублікі (ня ўся Закаўкаская Фэдэрацыя) але паасобку Грузія і Азарбэйджан выдаюць значна больш, чым БССР. Абгаворыце нас у гэтым таксама і Узьбекістан.

Больш чым у БССР выходзіць кніг у РСФСР, УССР, Грузіі, Азэрбайджане, Узьбекістане, а менш толькі ў Арменіі і Туркменістане.

У Грузіі за 1927 год вышла 1184 кнігі, у Узьбекістане—1056 кніг (за 1928 год вестак яшчэ няма). У Азэрбайджане за 1928 год 926 кніг. У Туркменістане—165 кніг, Арменіі—335. У БССР за 1927 год—652, а ў 1928 годзе—693.

Вось некалькі фактаў, якія паказваюць становішча беларускага друку 1928 году.

Н. Н.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР.

Пастанова
Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР
пра ўвекавечаньне памяці ахвяр грамадзянскай вайны.

Для захаваньня назаўсёды памяці аб барацьбітох, загінуўшых у часы грамадзянскай вайны, у часы самага жорсткага змаганьня за савецкую ўладу, за перамогу рабочае клясы над капіталам, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

1. Прызнаць 11 ліпеня—дзень вызваленьня БССР ад белапалякаў—днём успамінаў ахвяр грамадзянскай вайны.

2. Даручыць райённым выканаўчым камітэтам, гарадзкім, местачковым і сельскім саветам:

а) зрабіць належныя захады для выяўленьня ўсіх магілак ахвяр грамадзянскай вайны, прывесьці іх у належны парадак, стварыць такія адносіны да іх, каб даглядз за магілкамі барацьбітоў за інтарэсы рабочае клясы стаў гонарам кожнага працоўнага;

б) паставіць на відных мясцох у памяшканьнях выканаўчых камітэтаў і саветаў і ў пасобных больш важных прадпрыёмствах жалобныя дошкі з імёнамі ахвяр грамадзянскай вайны;

в) ушаноўваць дзень сьмерці ахвяр грамадзянскай вайны вечарамі ўспамінаў назвамі іх іменьнямі вуліц, паселішч, школ і ўстаноў.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

23 лютага 1929 г.,
г. Менск.

Постановление
Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров БССР
об увековечении памяти жертв гражданской войны.

Для увековечения памяти о борцах погибших во время гражданской войны, во время самой жестокой борьбы за Советскую власть, за победу рабочего класса над капиталом, Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляют:

1. Признать 11 июля—день освобождения БССР от белополяков—днём памяти о жертвах гражданской войны.

2. Поручить райённым исполнительным комитетам, городским, местечковым и сельским советам:

а) принять надлежащие меры для выявления всех могил жертв гражданской войны, привести их в надлежащий порядок, создать такое отношение к ним, чтобы забота о могилах борцов за интересы рабочего класса стала гордостью для каждого трудящегося;

б) поставить на видных местах в помещениях исполнительных комитетов и советов и в отдельных более важных предприятиях траурные доски с именами жертв гражданской войны;

в) ознаменовывать день смерти жертв гражданской войны вечерами воспоминаний названиями их именами улиц, поселений, школ и учреждений.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

23 февраля 1929 г.
г. Минск.

Пастанова
Савету Народных Камісараў БССР
па дакладу завода-кіраўніцтва „Бальшавік".

Выслухаўшы даклад заводакіраўніцтва «Бальшавік» пра работу заводу за апошнія гады, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Адзначыць наступныя дасягненьні ў працы заводу:

а) канцэнтрацыю ўсяе буйнае скуранае прамысловасьці г. Менску і правядзеньне вялікай рэканструкцыйнай працы, якая выявілася ў пашырэньні перабсталяваньня часткі старых аб'яднаных заводаў (1 і 2-га), а таксама ў пабудове новых цэхаў—чырвонадубільнага і клеерна-жэлацінавага.

У зьвязку з гэтым капітальныя ўкладаньні за 1926-27 і 1927-28 г. г. склалі 1.211.000 руб., у тым ліку чырвонадубільны цэх 317.000 р. І асноўны капітал заводу павялічыўся з 453.800 р. на 1 кастрычніка 1925 г. да 1.628.800 руб на 1 кастрычніка 1928 г.

б) узрост коштаў абсталяваньня, якое на 1 кастрычніка 1925 г. ашацоўвалася ў 180.800 р., што складае 39,8 проц. асноўнага капіталу, а на 1-га кастрычніка 1928 г.—897100 р., што складае 54,6 п. асноўнага капіталу.

У зьвязку з мэханізацыяй вытворчасьці значна скарочаны ручныя работы, а таксама скарочаны і вытворчы цыкл;

в) значнае павялічэньне вытворчасьці заводу (у 1927-28 г. на 21,9 проц. у параўнаньні з 1926-27 г., а на 1928-29 г. запраектаваны ўзрост вытворчасьці на 86,6 проц. супроць мінулага году);

г) павялічэньне ліку рабочых з 384 у 1926-27 г. да 723 чал. у 1928-29 г.;

д) значнае павялічэньне вытворчасьці працы, што тлумачыцца канцэнтрацыяй і мэханізацыяй вытворчасьці (вытворчасьць працы ў 1926-27 г. павялічылася на 40 процантаў у параўнаньні з 1924-25 г. і на 8,7 проц. у 1927-28 г. у параўнаньні з 1926-27 г.);

е) падвышэньне выхаду гатовага тавару з адзінкі сыраду, што тлумачыцца лепшай арганізацыяй вытворчых працэсаў, лепшым скарыстаньнем сыраду і матар'ялаў, а таксама арганізацыяй пераапрацоўкі малакаштоўных адыходаў

ж.) некаторае зьніжэньне сабекошту (на 2,6 проц. за 1927-28 г.)

Але гэтае дасягненьне яшчэ вельмі незначнае, а ёсьць выпадкі (конскі крой), калі нават павялічыўся сабекошт, што тлумачыцца арганізацыйнымі перыядамі, які патрабуе завод, а таксама недастатковай увагай да гэтага пытаньня з боку адміністрацыі і грамадзкіх арганізацый заводу;

э) прапановам вытворчых камісій, нарад і часовай кантрольнай камісіі заводакіраўніцтвам надаецца належная ўвага і своечасна ўжываюцца захады да іх ажыцьцяўленьня (з 144 прапаноў ажыцьцёўлена 132).

2. Адзначыць наступныя недахопы ў працы заводу:

а) зусім мала закранулі арганізацыйны бок працы, асабліва мала зроблена ў галіне правільнага скарыстаньня рабочае сілы;

б) адсутнічае сыстэматычная і цілкавая праца ў галіне рацыяналізацыі, слаба пастаўлена вывучэньне вытворчага працэсу і яго арганізацыі;

в) вытворчая прапаганда, а таксама справа падвышэньня кваліфікацыі і тэхнічных ведаў рабочых пастаўлена вусім новы-старчальна;

г) няма абставін, якія-б спрыялі вынаходніцтву работы (адсутнасьць эканэртных камісій і органаў сазэйнічаньня вынаходніцтву). У значнай меры паказаным недахопы тлумачацца адсутнасьцю на заводзе кваліфікаваных рацыяналізаторскіх працаўнікоў;

д) тарыфна-нарміровачная праца пастаўлена невыстарчальна, у зьвязку з чым фактычныя нормы выпрацоўкі ў большасьці выпадкаў перавышаюць у значнай ступені ўстаноўленыя нормы;

е) вытворчасьць працы ў мінулым 1927-28 г. павысілася на 8,7 проц., пры ўзросьце зарплаты на 10,8 проц., што пакавае на недастатковы тэмп узросту вытворчасьці працы ў параўнаньні з тэмпам падвышэньня заработку;

ж) нездавальняючую працу па падвышэньню якасьці прадукцыі, што дакі нагоршаньне якасьці хрому і конскага крою;

з) завод пачаў будавацца бяз усякіх плянаў і плян быў зложаны толькі ў працэсе працы ў канцы будаўніцтва, таму былі дапушчаны памылкі ў будаўніцтве, якія выклікалі патрэбу пераробак і ў зьвязку з гэтым дадатковых выдаткаў. Прыняць да ведама даведку Народнага Камісарыяту РСІ, што вінаватым ў гэтым асобы былі прыцягнуты да адказнасьці;

і) зьніжэньне працоўнай дысцыпліны пры агульным высокім узроўні навыхадаў на работу (навыхады па няўважлівых прычынах павялічыліся ў 1927-28 г. у параўнаньні з мінулым годам на 28 проц);

к) актыўнасьць рабочых як у вытворчых нарадах, гэтак і па працы ў грамадзкіх арганізацыях узрасла і маецца агульнае падвышэньне культурнага і палітычнага ўзроўню рабочых, што відаць з падпісі на пазыку індустрыялізацыі на 75 проц. заработку, выпуску друкаванай газэты «Рабочае Вока» і г. д. Але разам з гэтым наглядаецца недастатковае наведваньне рабочымі вытворчых нарад, асабліва з боку работніц і рабочай моладзі;

л) вентыляцыйны завод абсталяваны недастаткова і ня ўсе памяшканьні заводу яе маюць, што зьяўляецца вялікім дэфектам, асабліва бяручы пад увагу ўмовы вытворчасьці;

м) на заводзе адсутнічае клюб, належным чынам культурна-асьветная праца, што ў значнай меры вынікаецца прычынай розных ненармальных зьявішчаў на заводзе (п'янства, хуліганства, антысэмітызм).

3. Зрабіць наступныя загады для зьніжэньня паказаных у арт. 2 недахопаў:

а) запрапанаваць заводакіраўніцтву выканаць у 1928-29 г. зьніжэньне сабекошту прадукцыі заводу з такім разьлікам, каб быў выкананы процант зьніжэньня за мінулы год і прадугледжанае прамфінпляном зьніжэньне ў гэтым годзе;

б) даручыць Народнаму Камісарыяту Гандлю распрацаваць разам з Народным Камісарыятам Земляробства, Вышэйшым Саветам Народнай Гаспадаркі і Народным Камісарыятам Аховы Здароўя сыстэму мерапрыёмстваў для палепшаньня якасьці зьёмкі, загатоўкі, перавозкі і захаваньня скуранога сыраду;

в) лічыць патрэбным, каб з боку прамысловасьці сыстэматычна адбываўся кантроль і інструктаж якаснага боку загатовак скуранога сыраду. Даручыць Народнаму Камісарыяту Гандлю разам з Вышэйшым Саветам Народнай Гаспадаркі распрацаваць пытаньне пра больш рацыянальную арганізацыю загатоўчай і складской гаспадаркі;

г) запрапанаваць заводакіраўніцтву і трэсту скуранай прамысловасьці ўжыць захады да зьніжэньня недахопаў у справе рацыяналізатарскай працы, прыцягваючы да гэтага шырокія колы рабочых праз арганізацыю заводзкога бюро рацыяналізацыі і далейшае наглядзеньне працы вытворчых нарад;

д) адзначаючы нізкі ўздым вытворчасьці працы ў 1927-28 г., запрапанаваць заводакіраўніцтву разгарнуць шырокую кампанію сярод рабочых за падняцьце вытворчасьці працы;

е) запрапанаваць заводакіраўніцтву і трэсту скуранай прамысловасьці зьвярнуць асаблівую ўвагу на падвышэньне якасьці прадукцыі, зрабіўшы належныя ўмовы працы для тэхнічнага персаналу, а таксама да ліквідацыі ў максымальнай ступені зьявішчаў паніжэньня працоўнай дысцыпліны.

Даручыць Вышэйшаму Савету Народнай Гаспадаркі і Народнаму Камісарыяту Працы разам з прафэсыянальнымі арганізацыямі намеціць шэраг мерапрыёмстваў да падвышэньня працоўнае дысцыпліны і вытворчасьці працы па прадпрыёмствах БССР і падаць канкрэтныя прапановы ў Савет Народных Камісараў не пазьней, як у тыднёвы тэрмін;

ж) запрапанаваць Вышэйшаму Савету Народнай Гаспадаркі разам з ЦСПСВ вывучаць пытаньне аб нормах выпрацоўкі і ўжыць канкрэтныя захады да выпраўленьня старых і складаньня такіх новых норм, якія адпавядалі-б працэсам вытворчасьці на заводзе;

з) з прычыны скарачэньня імпартных дубіцеляў і патрэбнасьці скарыстаньня дубіцеляў савецкай вытворчасьці, запрапанаваць трэсту скуранай прамысловасьці ў пачатку будаўнічага сэзону бягучага году расшчаць пабудову новай сокаваркі, каб яна забясьпечыла завод патрэбнай колькасьцю якасных сокаў;

і) бяручы пад увагу, што ў справе палепшаньня якасьці прадукцыі, побач з палепшаньнем сыраду немалы ўплыў маюць і мэтады апрацоўкі яе, запрапанаваць трэсту скуранай прамысловасьці з пачатку будаўнічага сэзону расшчаць пабудову новай лябараторыі, каб яна магла выконваць пастаўленыя перад дзяржаўнаю скурпрамысловасьцю задачы як у сэнсе агульнага кантролю над вытворчасьцю, гэтак і ў сэнсе хімічнага кантролю практыкавальнай і навукова-дасьледчай работы;

к) запрапанаваць заводакіраўніцтву ўзмацніць адміністрацыйна-тэхнічны апарат спэцыялістамі інжынэрамі;

л) запрапанаваць Вышэйшаму Савету Народнай Гаспадаркі забясьпечыць пабудову пры заводзе клюбу сталоўкі і ў далейшым улічваць патрэбу пабудовы аднаповерхных памяшканьняў для культурнага абслугоўваньня рабочых пры новабудуемых прадпрыёмствах;

м) лічыць патрэбным адчыніць пры заводзе «Бальшавік» дзіцячыя яслі, якія павінны быць адчынены яшчэ ў бягучым гаспадарчым сэзоне

н) запрапанаваць Вышэйшаму Савету Народнай Гаспадаркі набудаваць памяшканьне для школы фабзавучэ, якая абслугоўвала-б усю скураную прамысловасьць БССР;

о) бяручы пад увагу, што ў склад рабочых заводу „Бальшавік" улілася значная група рабочых з саматужных прадпрыёмстваў, даручыць заводакіраўніцтву разам з прафсыянымі і грамадзкімі арганізацыямі заводу ўзмацніць тэхнічную і палітыка-культурную выхаваўчую працу сярод рабочых, працу па інтэрнацыянальнаму выхаванню рабочых і па змаганьню з усякімі праявамі нацыянальнага шавінізму сярод рабочых заводу;

п) адзначаючы, што новы закон пра трэсты ў адносінах да скуранога заводу „Бальшавік" ня цалкам ажыцьцёўлен, запрапанаваць Вышэйшаму Савету Народнай Гаспадаркі БССР ажыцьцявіць гэты закон у тэрміновым парадку;

р) даручыць Народнаму Камісарыяту Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі прасачыць за выкананьнем гэтае пастановы і праз 4 месяцы даваць Савету Народных Камісараў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР А. Дубавіцкі.

6-га сакавіка 1929 г.
г. Менск.

2-тыднёвік ашч

Цікавы выпадак з се лянкай.
(Чэрвенскі раён).

Мы мелі такі выпадак і надта ха рактэрны, калі ў адну з кас прыйш сялянка і спыталася—ці можна пала жыць грашы. Ёй адказалі, што мож на і расказалі дасканальна аб карыс ці ўкладчыку ад касы ашчаднасьні Цётка паклала толькі 10 рублёў, Н заўтра гэта самая цётка прыходзіц у касу ашчаднасьці і просіць аб зва роце яе грошай. Загадчык касы, я гэта і трэба, нягледзячы на тое, шт была ў касе вялікая чарга, заг даў сялянцы выдаць яе ўклад,

Працаўнікі стараліся ўгаварыць каб сялянка хоць пакінула 50 капе на кніжку, але апошняя не згаджал ся. Калі былі выпісаны ўсе квіта цыі і належныя дакумэты для выдач грошай, засталося толькі атрымо іх, сялянка, калі загадчык аддаў на рукі грошы узяла толькі 5 ру лёў, а 5 заставіла ў касе.

На другі дзень, упэўніўшыся ў т што яе грошы будуць спакойна ляжа у касе ашчаднасьці і ў любую хвіл можна будзе іх узяць, гэта самая сялянка прынесла ў касу ашчаднас трыста рублёў з умоваю аб тым, ш калі яна памрэ, то яе грошы павін застацца яе 6-ці гадовай дачцы.

Вось вам характэрны прыклад т го, што яшчэ сялянства не дасканал на, а ў іншых выпадках і вусім ведае аб задачах і выгадах укл чыкам касы ашчаднасьці.

М. Процька.

Х

НАПЯРЭДАДНІ ЎСЕБЕЛА

IX Усебеларускі зьезд савета адчыніцца ў пачатку мая.

Прэзыдыум ЦВК БССР дл падрыхтоўкі скліканьня зьезд ўтварыў пад старшынства тав. Хацкевіча арганізацыйную камісію.

У сучасны момант па ўсей БССР праходзяць райённыя зьезды саветаў, якія закончацца да 1 красавіка. Упяршыню на райённых зьездах саветаў абгавар-

Прыезд тав. С

Учора раніцою прыехала МОПР'у і намесьнік сэкратара На вакзале тав. Стасаву скага ЦК МОПР'у. Таварыш С дам на вечары, прысьвечаным Таксама па запрашэньню прыехаў член Маскоўскага Гу адказны сэкратар Бранскага

Сход Менска

Учора ўвечары у клюбе імя Карла Мар а адбыўся сход актыву Менскай гара кой партарганізацыі, на ім выступіў дакладам аб 10-годзьдзі Камінтэрну прад

Пра ўдзел прафсаюзаў у падрыхтоўцы да пасеўнай кампаніі.

Не зважаючы на тое, што нізавык прафорганы правялі і праводзяць падрыхтоўчую працу да ўдзелу ў пасеўнай кампаніі, Центральныя прыўленьні саюзаў амаль нічога ня ведаюць аб тым, што робіцца на мясцох. Некаторыя ЦП саюзу яшчэ дагэтуль не абгаварылі ў сябе пытаньня аб удзеле ў падрыхтоўцы да пасеўнай кампаніі.

Наогул, трэба сказаць, што ЦП саюзаў у большасьці не забясьпечалі праверкі як дырэктыў ЦСПСБ, так і сваіх у галіне падрыхтоўкі прафарганізацый да ўдзелу ў прэвядзеньні пасеўнай кампаніі недастаткова яшчэ арганізавана, грамадзкая думка рабочых мас па пытаньні пасеўнай кампаніі.

Прэзыдыум ЦСПСБ запрапанаваў усім ЦП саюзаў і Акрпрафбюро ў бліжэйшыя дні правесьці праверку, як ажыцьцяўляюцца на мясцох дырэктывы ЦСПСБ і ЦП саюзаў па пытаньню падрыхтоўкі да пасеўнай кампаніі. Запрапанавана таксама ў бліжэйшыя дні арганізаваць і паслаць у вёскі рабочыя брыгады.

Ліквідацыя няпісьменнасьці ў Меншчыне.

Прэзыдыум АВК заслухаў даклад інспэкцыі нарасьветы аб стане ліквідацыі няпісьменнасьці ў Менску і на раёнах акругі. З дакладу відаць, што летась на ўсёй акрузе на ліквпунктах навучалася 10000 чал., а сёлета толькі на 12 раёнах і Менску ліквпунктамі ахоплена 17000 чалавек. У працу па ліквідацыі няпісьменнасьці ўцягнуты як партыйныя, камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі, студэнцтва і вучні старэйшых груп школ 7-годак.

З недахопаў можна адзначыць тое, што некаторыя раёны склалі пляны па ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці. Адсутнасьць апорных ліквпунктаў у большасьці раёнаў не дала магчымасьці наладзіць жывое мэтадычнае кіраўніцтва працай ліквпунктаў і груп індывідуальнага навучаньня.

Для апрацоўкі практычных пастаноў па дакладу абрана спэцыяльная камісія.

...рсавету акруговая камісія па адзна...ню царквы ад дзяржавы правяла агляд сы...нагогі на Ленінскай вул., № 16. Выявіл...ся, што памяшканьне гэтай сынагогі ўтры...моўваецца ў самым бесгаспадарчым стане...вішчы: падлога пахамана, дзьверы паспал...ны і г. д. Наогул, усё памяшканьне па...трабуе капітальнага рамонту.

Апрача таго, абшчына верующых ня ко...нвала дагавору на пытаньню вядзень...інвэнтарнай кнігі, і ўся маёмасьць нікі...не запісвалася.

Камісія пастанавіла забраць памяшкан...не сынагогі і перадала яго шавецкай арт...лі «Рэкорд».

З 23 сакавіка шавецкая арцель ужо зн...яла памяшканьне сынагогі. У бліжэйш...дні камісія правядзе абсьледаваньне памя...каньне сынагогі на Савецкай вул, у до...№ 93.

Нядбайнасьць пакрамі.

Яшчэ 15 студзеня Менскі акрвыканк...запрапанаваў „Торгтрою" пачаць ...рыхтоўку да будаўніцтва крэйдазага і ...ніковага заводу. Між тым «торфтро...дагэтуль яшчэ нічога не зрабіў.

Прэзыдыум Менскага Акрвыканкому ...такую нядбайнасьць вынес пастанову ...ставіць „Торгтрою" на від і запрапа...ваў прыняць усе меры, каб заводы б...своечасова пабудаваны.

ТЭАТР-КІНО

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.

НЯДЗЕЛЯ, 24-га САКАВІКА

АДКРЫТЫ СПЭКТАКЛЬ

МОСТ (на шляхох індустрыялізацыі).

П'еса ў 4 дзеях, 9 абразох.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА».	З аўторка, 19 сакавіка „КАТАРГА".
КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».	З аўторка, 19 сакавіка. „ПАТ І ПАТАШОН ПАЛІШЭЙСКІЯ".
КІНО ПРАЛЕТАРЫ	З аўторка, 19 сакавіка „ЗАКОНЫ ШТОРМУ" Драма ў 7 частках.
1-ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР «ЮНЫ ПІАНЭР».	З аўторка, 19 сакавіка „КРАСНЫЕ ДЬЯВОЛЯТА" 1-я серыя ў 6 частках.

АБВЯЩЧАЕЦЦА КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭНЬНЕ НАСТУПНЫХ ПАСАД

па Беларускаму Навукова-Дасьледчаму Інстытуту Сельскай і Лясной Гаспадаркі імя Ул. Леніна пры СНК БССР.

1. Спэцыяліст генэты-сыстэматык Центр. Бульб. Ст. аклад 130 р. у месяц.
2. Асыстэнт па сортавыпрабаванню „ „ „ „ 120 р. „
3. Асыстэнт па фітапаталёгіі „ „ „ „ 120 р. „
4. Нам. Заг. Адзд. Станцыі Белгеафізу . . 120 р. „
5. Геафізык „ „ „ . . 120 р. „
6. Інспэктар—Інструктар Мэтэаст. . . 100 р. „
7. Асыстэнт па хіміі балот Центр. Балота. Станцыі . 120 р. „
8. Асьпірант па Адзд. Мэліярацыі і Культуры балот . 90 р. „
9. Асыстэнт Адзд. Расьліннаводзтва . . 120 р. „

Заявы і дакуманты накіроўваць па адрасу: Беларускі Навукова-Дасьледчы Інстытут Сельскай і Лясной Гаспадаркі імя Леніна. Менск, Шырокая, 28.

ДЫРЭКЦЫЯ ІНСТЫТУТУ.

ПАСТАНОВА
МЕНСКАГА АКРУГОВАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ.

Гор. Менск 13 сакавіка 1929 г.

На падставе арт. 45 палажэньня аб адзіным сельска-гаспадарчым падатку на 1929-30 г. зацьверджанага ЦВК і СНК СССР 20 лютага бягучага году, Менскі акруговы выканаўчы камітэт пастанаўляе:

1. У мэтах заахвочваньня мер, падвышаючых ураджайнасьць, устанавіць скідку ў разьмеры 10 проц. з налічанага сельска-гаспадарчага падатку на 1929-30 г. для кожнай гаспадаркі ў тых зямельных обчаствах, якія ажыцьцявяць адно, альбо некалькі наступных прасьцейшых мерапрыёмстваў па падвышэньню ўраджайнасьці: ачыстку, сарціроўку і пратручваньне ўсяго насеньня; радавой пасеў; вынішчэньне межаў; барацьбу з шкоднікамі і пустазельлем: раньні папар; заняты папар; зяблевае ўзорваньне; спыненьне папасу жывёлы на азімых пасевах; паляпшэньне ўмоў утрыманьня і харчаваньня жывёлы; у прыватнасьці арганізацыю ўцяплёных жывёльных хлявоў; ужываньне зялёных угнаеньняў; спыненьне цэльным насельніцтвам папасу жывёлы на лугох раньняй вясной і позьняй восенью; пабудову сільскіх лямаў і сілосаваньне кармоў; ачышчэньне лугоў ад хмызьняку, куп'яў і спуск вады; абкашваньне межаў і палявых дарог; арганізацыю групавых садоў; фактычнае ўвядзеньне шматпольня; скарыстаньне торфу і кампосту на ўгнаеньне па плошчы ня менш 1/4 дзесяціны на гаспадарку і арганізацыю пастаянных штучных выпасаў цэльнымі вёскамі. У тых паселішчах, дзе пералічаныя мерапрыемствы (за выключэньнем спыненьня папасу жывёлы на лугох раньняй вясною і позьняй восенью, арганізацыі пастаянных штучных выпасаў)—будуць праведзены на зямельным обчаствам у цэлым, а асобнымі гаспадаркамі, гэткім гаспадаркам устанавіць скідку з налічанага сельска-гаспадарчага падатку ў разьмеры 5 проц.

2. Скідкі, пералічаныя ў п. 1 гэтае пастановы, не прадастаўляюцца гаспадаркам, абкладзеным у індывідуальным парадку.

3. Даручыць акруговаму фінансаваму аддзелу сумесна з акруговым зямельным аддзелам выдаць інструкцыю па правядзеньню гэтае пастановы.

Намесьнік старшыні Менскага акруговага выканаўчага камітэту НАХІЛЬНІЦКІ.

В. аб. сэкратара МАЙСЕЕЎ.

ПАСТУПІЎ у ПРОДАЖ
ва ўсе кнігарні Белдзяржвыдавецтва
Бюлетэнь АПАД ЦК КП(б)Б
„У ДАПАМОГУ ПАРТВУЧОБЕ"
№ 4-5
У ЗЬМЕСЬЦЕ МАТАР'ЯЛЫ
АБ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ сельскае гаспадаркі,
УЗДЫМЕ ЎРАДЖАЙНАСЬЦІ
і веснавой пасеўнай кампаніі.
ЦАНА 20 КАП. БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА.

ЗГУБЛЕНЫ:

Сяброўскі білет Віткоўскай М. А., выд. Менскім саюзам прац. вямлі і лесу, кв. 569.

Сяброўская кніжка № 4944 Коркорыус Л., выд. Менскім саюзам працасьветы, кв. 570.

Пасьведчаньне № 4 Барашкава М. В., аб скончэньні менск. наст. 9-цімес. курсаў, кв. 571.

2 пасьведчан. Барашкава М. В., выд. кіраўн. зах. чыгункі, кв. 572.

Пасьведчаньне Барашкава М. В., выд. белар. дзярж. бібліят., кв. 573.

Пасьведчаньне аб скончэньні Гомельскай гімназіі на імя Лясун М. В., кв. 574.

Патэнт легкавога звозчыка Булынка К. Я., выд. Менск. акрфа, кв. 575.

Пашпарт Булынка К. Я., выд. Менакрміліц., кв. 576.

Пашпарт Будыка Ю. Н., выд. Менакрміліц., кв. 577.

Лекавая кніжка Сарокін Х. Б., выд. Менакрстрахкасай, кв. 578.

Сяброўскі білет № 4891 Крэйніна І. Ф., выд. Менскім саюзам працасьветы, кв. 579.

Біржавы нумар Мельцэр Л. А., выд. Менбіржай працы, кв. 580.

Біржавы нумар Соскіной С. Б., выд. Менбіржай працы, кв. 581.

Пасьведчаньне Істоміной Р. М., выд. III-мі агульна-адукац. курсамі, кв. 582.

Барысаўскі Загс выкінае гр. ЛАБАКОЎСКАГА ЦІХАНА АЎХІМАВАГА на 22 красавіка гэтага году на справе скасаваньня шлюбу, згодна заявы гр-ні ЛАБАКОЎСКАЙ ГАНІНЫ СЯМЁНАВАЙ жыв. у г. Барысаве.

З талёны Рубінштэйн З. М., выд. біржай працы, кв. 583.

Сяброўская кніжка Слуцкага Д. І., выд. Менскім саюзам мэталістаў, кв. 584.

Лекавая кніжка Шастакова С. П., выд. Менакрстрахкасай, кв. 585.

Біржавы талён за люты месяц Цехановіча Е., выд. Менбіржай працы, кв. 586.

Пячатка савгаса Халопенічы, Белсавтрэсту, якую лічыць несапраўднай з 1 сакавіка г. г., кв. 77-п.

Спраўка Левіна Б., выд. Чэрвенск. саюзам савгандальск. аб тым, што спадзў для закупкі скуры німа, кв. 78-п.

Сяброўская кніжка за № 858 Зыкавай Р. П., выд. Ц. П. саюза працасьветы, кв. 559.

Біржавы талён за № 47 Валчка Е. Я., выд. Менбіржай працы, кв. 560.

Біржавы талён за люты м-ц Фінкельштэйна Г. С., выд. Менбіржай працы, кв. 561.

Партбілет за № 1100753 Даўгаленка В. А., выд. Менакружкомам, кв. 562.

Мандат Даўгаленка В. А. на права кантролю рэвартуараў і бібліятэк, кв. 563.

Талён 2-й пазыкі Індустр., выд. Смалявіцкім раймясцкомам працасьветы за № 033455, 0042062, 0055738, 0059494, 0076938 на імя Даўгаленка В. А., кв 564.

Сяброўская кніжка Заромба П. А., выд. саюзам друкароў, кв. 565.

Прафсаюзны білет Кудзелька М. С., выд. Ц. сакр. працаўн. друку саюзу працасьветы, кв. 567.

Расьпіска на 60 р., выд. Лік Лукашам на імя Ліка Петра Васільева, кв. 79-п.

Асабовая кніжка № 501 Гольдбэрга Э. С. выд. Смалявіцкім РВК, кв. 80-п.

Вайсковая кніжка Аладко А., выд. 5 стр. палком у 1926 г. нарадж. 1902 г., кв. 81-п.

Вайсковы білет Закожага Н., выд. Чэрвенскім ваенкаматам, кв. 82-п.

Асабовая кніжка № 524 Коктыша І. Г., выд. Мазырскім АВК, кв. 75-п.

Лавая кніжка № 1352 Бобра І. Е., выд. Мазырск. праўл. «Смычка», кв. 76-п.

Галоўлітбел 595.

Менск, дзяржаўная друкарня.